DOWNLOAD PDF

# Апостальская адгартацыя

*Evangelii gaudium*
Святога Айца

Францішка

да біскупаў, прэзбітэраў і дыяканаў,
да кансэкраваных асобаў
і да ўсіх свецкіх вернікаў
пра абвяшчэнне Евангелля ў сучасным свеце

Пераклад Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў

і афіцыйных дакументаў Касцёла

Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў

пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

[pdf]

1. Радасць Евангелля напаўняе сэрца і ўсё жыццё тых, хто сустракаецца з Езусам, хто дазваляе Яму вызваліць сябе ад граху, смутку, унутранай пусткі ды адасобленасці. З Езусам Хрыстом заўсёды нараджаецца і адраджаецца радасць. У гэтай адгартацыі я хачу запрасіць хрысціянаў да новага этапу евангелізацыі, напоўненага гэтай радасцю, і паказаць шляхі Касцёла на бліжэйшыя гады.

## I. Радасць, якая аднаўляецца і перадаецца іншым

2. Вялікай небяспекай для сучаснага свету, з яго разнастайнымі і дыкучлівымі спажывецкімі пра-па-новамі, з'яўляецца засмучанасць, што на-ра-джа-ецца ў прызвычаеным да камфорту і сквапным сэрцы і спадарожнічае нездароваму пошуку павярхоўных прыемнасцяў ды закрытасці сумлення. У духоўным жыцці, абмежаваным уласнымі інтарэсамі, няма ўжо месца для іншых, яно закрытае для бедных, у ім не чутны больш голас Бога, не адчуваецца ўжо салодкая радасць ад Яго любові і жаданне рабіць дабро. Вер-ні-кам таксама несумненна і пастаянна пагражае гэтая небяспека. Многія паддаюцца і становяцца

пакрыўджанымі, абыякавымі, без жыцця. Гэты шлях пазбаўлены годнасці і паўнаты жыцця, не гэтага чакае ад нас Бог, і гэта не жыццё ў Духу, якое вынікае з сэрца ўваскрослага Хрыста.

3. Я запрашаю кожнага хрысціяніна, незалежна ад месца і сітуацыі, у якой ён знаходзіцца, аднавіць сёння сваё асабістае спатканне з Езусам Хрыстом ці, прынамсі, прыняць рашэнне сустрэцца з Ім, няспынна шукаць Яго кожны дзень. Няма прычыны, каб хтосьці мог думаць, што гэта запрашэнне не для яго, бо «ніхто не выключаны з радасці, што нясе Пан»[1]. Тых, хто рызыкне зрабіць маленькі крок насустрач Езусу, Пан не расчаруе. Яны ўбачаць, што Ён ужо чакае іх з распасцёртымі рукамі. Гэта нагода, каб сказаць Езусу Хрысту: «Пане, я дазволіў ашукаць сябе, тысячамі спосабаў я ўцякаў ад Тваёй любові, але я зноў тут, каб аднавіць свой запавет з Табою. Я патрабую Цябе. Збаў мяне нанова, Пане, і прымі мяне яшчэ раз у свае выратавальныя абдымкі». Так добра вярнуцца да Яго, калі мы заблукалі! Яшчэ раз падкрэсліваю: Бог ніколі не стамляецца прабачаць, гэта мы стамляемся прасіць Яго аб міласэрнасці. Той, хто заахвоціў нас прабачаць «семдзесят сем разоў» (*М* 18, 22), дае нам прыклад: сам прабачае семдзесят сем разоў. Зноў і зноў бярэ нас на свае плечы. Ніхто не можа адабраць у нас тую год-насць, якую дае нам гэтая бясконцая і непахісная любоў. Ён дазваляе нам узняць галаву і пачаць усё нанова з такой пяшчотай, якая ніколі не расчаруе нас і заўсёды можа вярнуць нам радасць. Не будзем жа ўцякаць ад уваскрасення Хрыста, не дазволім перамагчы сябе, што б ні здарылася. Нічога не можа быць большым за Ягонае жыццё, якое дазваляе нам ісці наперад!

4. Кнігі Старога Запавету прадказвалі радасць збаў-лення, якая найбольш павінна была выявіцца ў ме-сіянскія часы. Прарок Ісая ўрачыста вітае чаканага Месію: «Ты памножыў народ, павялічыў радасць» (9, 2) і заклікае жыхароў Сіёна вітаць Яго спевам: «Весяліся і радуйся!» (12, 6). Прарок заклікае тых, хто ўжо бачыў Яго, несці пасланне іншым: «Узыдзі на высокую гару, Сіён, які нясеш добрыя весткі! Зрабі моцным голас свой, Ерузалем, які нясеш добрыя весткі!» (40, 9). Усё стварэнне падзяляе гэтую радасць збаўлення: «Спявайце, нябёсы, і весяліся, зямля. Горы, усклікніце ад радасці. Бо Пан суцешыў свой народ і злітаваўся над сваімі ўбогімі» (49, 13).

Захарыя, убачыўшы дзень Па-на, заклікае вітаць Караля, які пакорна едзе на асле: «Радуйся моцна, дачка Сіёна, весяліся, дачка Ерузалема: вось кароль твой ідзе да цябе, справядлівы і збаўчы!» ( 9, 9). Аднак, напэўна, найбольш настойлівы заклік гучыць у прарока Сафоніі, бо паказвае нам Бога як яскравую крыніцу свята і радасці і як таго, хто хоча перадаць свайму народу гэты крык збаўлення: «Пан Бог твой сярод цябе, Магутны, Ён збавіць! Будзе вельмі радавацца табе, узрушаны ў любові сваёй, будзе цешыцца табою ў весялосці» ( 3, 17).

Радасць, якую мы перажываем сярод дробных рэчаў штодзённага жыцця, з’яўляецца нібы адказам на ласкавае запрашэнне Бога, нашага Айца: «Дзіця, калі маеш магчымасць, дбай

пра сваё дабро <…> Не пазбаўляй сябе шчаслівага дня» ( 14, 11. 14). Колькі бацькоўскай пяшчоты ў гэтых словах!

5. Евангелле, у якім ззяе хвалебны Крыж Хрыста, настойліва запрашае да радасці. Дастаткова некалькі прыкладаў: «Радуйся!» — так вітае Марыю анёл ( 1, 28). Падчас адведзінаў Марыяй Альжбеты Ян узварухнуўся ад радасці ва ўлонні сваёй маці (пар.  1, 41). Марыя ў сваёй песні ўсклікае: «Узрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцу» ( 1, 47). Калі Езус пачынае сваё служэнне, Ян усклікае: «Вось, гэтая радасць мая» ( 3, 29). Сам Езус «узрадаваўся ў Духу Святым» ( 10, 21). Яго пасланне — гэта крыніца радасці: «Гэта Я сказаў вам, каб Мая радасць была ў вас, і каб радасць вашая была поўнай» ( 15, 11). Нашая хрысціянская ра-дасць выплывае з крыніцы Яго перапоўненага сэрца. Ён абяцае апосталам: «Вы будзеце смуткаваць, але смутак ваш абернецца ў радасць» ( 16, 20). І падкрэслівае: «Я зноў убачу вас, і ўзрадуецца сэрца вашае, і радасці вашай ніхто не адбярэ ў вас» ( 16, 22). Потым, убачыўшы Яго ўваскрослым, яны «ўзрадаваліся» ( 20, 20). Кніга Дзеяў Апосталаў расказвае, што ў першаснай супольнасці «спажывалі ежу ў радасці» (2, 46). Там, дзе праходзілі Апосталы, «была вялікая радасць» (8, 8), і ў час пераследу «вучні напаўняліся радасцю» (13, 52). Пэўны чалавек, які толькі што ахрысціўся, «працягваў шлях свой, радуючыся» (8, 39), а вартаўнік «з усім до-мам сваім цешыўся, што паверыў у Бога» (16, 34). Чаму б і нам не ўвайсці ў гэты струмень радасці?

6. Ёсць хрысціяне, якія быццам бы пастаянна жывуць у Вялікім посце без Пасхі. Я згаджаюся, што не заўсёды ўдаецца перажываць радасць аднолькава на ўсіх этапах і ва ўсіх жыццёвых абставінах, часам вельмі цяжкіх. Яна дастасоўваецца і змяняецца, і заўсёды застаецца як бы промнем святла, які нараджаецца з асабістай упэўненасці ў тым, што нас бязмежна любяць па-над усё. Я разумею тых, хто схільны да смутку пры сутыкненні з вялікімі цяжкасцямі, але пакрысе вы павінны дазволіць абудзіцца радасці веры, як таямнічаму, але моцнаму даверу, нават ва ўмовах самага вялікага бедства: «Ты выгнаў спакой з маёй душы. Я забыў пра шчасце! <...> Аднак схаваю ўсё гэта ў сваім сэрцы і зноў адважуся. Хоць мы блізкія да смерці, з ласкі Пана існуём, бо бясконцая Ягоная міласэрнасць кожную раніцу зноў аб’яўляецца, а вернасць Яго вялікая! <...> Карысна чакаць у маўчанні, пакуль ад Пана прыйдзе збаўленне» (пар.  3, 17. 21-23. 26).

7. Спакуса часта з’яўляецца ў форме апраўданняў і скаргаў, што для існавання радасці быццам бы неабходны шматлікія ўмовы. Гэта адбываецца та-му, што «тэхналагічная супольнасць змагла па-вя-лічыць магчымасці для задавальнення, але мае цяжкасці ў дасягненні радасці»[2]. Магу сказаць, што най-пры-гажэйшую і спантанную радасць, якую сустракаў у сваім жыцці, я бачыў сярод найбольш бедных людзей, якія мала што мелі. Памятаю таксама сапраўдную радасць тых, хто сярод мноства прафесійных аба-вязкаў здолеў захаваць у сэрцы веру, шчодрасць і сціпласць. Розным чынам гэтая радасць выплывае з найвялікшай крыніцы любові да Бога, які аб’явіў сябе ў Езусе Хрысце. Не стамлюся паўтараць словы Бэнэдыкта XVI, якія ўводзяць нас у самую сутнасць Евангелля:

«Імкненне быць хрысціянінам не з’яўляецца вынікам этычнага выбару або нейкай вялікай ідэі, але вынікам спаткання з падзеяй, з Асобай, якая надае жыццю новую перспектыву і тым самым выразны накірунак»[3].

8. Толькі дзякуючы гэтаму (ці паўторнаму) спат-канню з любоўю Бога, якое перамяняецца ў шчаслівае сяброўства, мы вызваляемся ад ізаляцыі нашага сумлення і замкнёнасці ў сабе. Становімся больш чалавечнымі, калі выходзім па-за нашую чалавечую абмежаванасць, калі дазваляем Богу весці нас па-за нашае «я», каб дасягнуць глыбіні сваёй істоты. У гэтым — крыніца евангелізацыйнай дзейнасці. І калі хтосьці атрымаў гэтую любоў, якая вярнула яму сэнс жыцця, ці ж можа ён стрымаць жаданне падзяліцца ёю з іншымі?

II. Салодкая і суцяшальная радасць евангелізацыі

9. Дабро заўсёды мае тэндэнцыю да пашырэння. Кожны сапраўдны досвед праўды і прыгажосці ім-кнец-ца да распаўсюджвання, і кожны чалавек, які глыбока перажывае вызваленне, становіцца больш чулым да патрэб іншых. Праз пашырэнне дабро ўкараняецца і развіваецца. Таму, калі хтосьці хоча жыць годна ва ўсёй паўнаце, не мае іншага шляху, як толькі прыняць іншага чалавека і шукаць для яго дабра. Таму нас не павінны здзіўляць некаторыя выказванні св. Паўла: «любоў Хрыста ахапіла нас» (*2* 5,14); «Гора мне, калі я не абвяшчаю Евангелля!» (*1* 9,16).

10. Прапанова заключаецца ў тым, каб жыць на вышэйшым узроўні, але не з меншай інтэнсіўнасцю. «Жыццё ўзмацняецца ў ахвярнасці, і слабне ў ада-соб-ленасці і камфорце. На самой справе, найбольш поўна выкарыстоўвае жыццё той, хто пакідае бяспечны бераг і жадае дзяліцца жыццём з іншымі»[4]. Калі Касцёл заклікае да евангелізацыі, то ні робіць нічога іншага, як толькі паказвае хрысціянам сапраўдны дынамізм асабістай самарэалізацыі: «Тут адкрываем яшчэ адзін глыбокі закон рэчаіснасці: жыццё расце і выспявае ў той меры, у якой мы аддаём яго дзеля жыцця іншых. Місія, урэшце, менавіта такая»[5]. Такім чынам, евангелізатар не павінен увесь час мець пануры выраз твару. Адновім жа і павялічым запал, «салодкую і суцяшальную радасць евангелізацыі, нават калі прыйдзецца сеяць у слязах. <…> Няхай сучасны свет, — які шукае часам у смутку, а часам з надзеяй, — чуе Добрую Навіну не ад прыгнечаных і засмучаных евангелізатараў, нецярплівых і баязлівых, але ад слугаў Евангелля, жыццё якіх ззяе запалам, якія першыя атрымалі сваю радасць ад Хрыста»[6].

11. Аднаўленае абвяшчэнне дае вернікам, у тым ліку абыякавым і непрактыкуючым, новую радасць у веры і евангелізацыйную плённасць. На самой справе, яго цэнтр і яго сутнасць заўсёды тая самая: Бог, які паказаў сваю вялікую любоў у Хрысце, памерлым і ўваскрослым. Ён кожны дзень аднаўляе сваіх верных. Нават састарэлыя «адновяць сілы, расправяць крылы, як арлы, пабягуць і не стомяцца, пойдуць і не знясіляцца» (*І* 40, 31). Хрыстус — гэта

«вечнае Евангелле» (*А* 14, 6), «той самы ўчора, і сёння, і навекі» ( 13, 8), але Яго багацце і прыгажосць невычарпальныя. Ён заўсёды малады і з’яўляецца пастаяннай крыніцай навізны. Касцёл не перастае здзіўляцца, кажучы: «О, глыбіня багацця і мудрасці, і пазнання Бога!» ( 11, 33). Св. Ян ад Крыжа казаў: «Гэты гушчар мудрасці і ведання Бога настолькі глыбокі і бязмерны, што колькі б душа не ўваходзіла ў яго, заўсёды можа трапіць яшчэ глы-бей»[7]. Або як сцвярджае св. Ірэнэй: «[Хрыстус] праз сваё прыйсце прынёс з сабою ўсялякую навізну»[8]. Праз сваю навізну Ён заўсёды можа аднавіць нашае жыццё і нашую супольнасць, і хоць прапанова хрысціянства крочыць праз змрочныя часы і слабасці Касцёла, яна ніколі не састарэе. Езус Хрыстус можа таксама зламаць цяжкія схемы, у якія мы імкнёмся Яго заключыць, і здзіўляе нас сваёй няспыннай боскай крэатыўнасцю. Кожны раз, калі мы хочам звярнуцца да крыніцаў і знайсці першапачатковую свежасць Евангелля, нам адкрываюцца новыя шляхі, творчыя метады, іншыя формы выяўлення, найбольш выразныя знакі, словы, поўныя новага сэнсу для сучаснага свету. Насамрэч, кожная сапраўдная евангелізацыйная дзейнасць заўсёды з’яўляецца «новай».

12. Хоць гэта місія патрабуе ад нас велікадушнасці, было б памылкай успрымаць яе як нашае асабістае гераічнае заданне, бо перадусім гэта Яго справа, незалежна ад таго, што мы можам адкрыць і зра-зу-мець. Езус з’яўляецца «першым і найбольшым евангелізатарам»[9]. У любой форме евангелізацыі першае месца заўсёды належыць Богу, які захацеў запрасіць нас да супрацоўніцтва з Ім і абуджаць нас моцай свайго Духа. Сапраўдная навізна тая, якую сам Бог таямніча хоча данесці, якую Ён натхняе, якую выклікае, якой Ён кіруе і якой спадарожнічае тысячамі спосабаў. На працягу ўсяго жыцця Касцёла заўсёды трэба паказваць, што ініцыятыва паходзіць ад Бога, бо «Ён першы палюбіў нас» (*1*  4, 10), што «гэта Бог дае ўзрастанне» (*1*  3, 7). Гэтая ўпэўненасць дазваляе нам захоўваць радасць падчас выканання вельмі адказнай і складанай місіі, якая ахоплівае ўсё нашае жыццё. Яна патрабуе ўсяго, але ў той жа час усё нам дае.

13. Мы не павінны таксама разумець навізну гэтай місіі ў выкараненні ці ў забыцці жывой гісторыі, якая нас атачае і вядзе наперад. Памяць — гэта вымярэнне нашай веры, мы можам назваць яе «дэўтэранамічнай» па аналогіі з памяццю Ізраэля. Езус пакідае нам Эўхарыстыю як штодзённую памяць Касцёла, якая ўсё больш уводзіць нас у Пасху (пар.  22, 19). Евангелізацыйная радасць заўсёды ззяе на фоне ўдзячнай памяці: гэта ласка, аб якой мы павінны прасіць. Апосталы ніколі на забылі момант, калі Езус дакрануўся да іх сэрцаў: «Было каля дзесятай гадзіны» ( 1, 39). Разам з Езусам памяць паказвае нам «безліч сведкаў» ( 12, 1). Сярод іх вылучаюцца тыя, хто асаблівым чынам паўплываў на ўзрастанне нашай радасці, звязанай з верай: «Памятайце пра настаўнікаў вашых, якія абвяшчалі вам Божае слова» ( 13, 7). Часам гаворка ідзе аб простых і блізкіх людзях, якія ўвялі нас у жыццё веры: «...успамінаю пра тваю некрывадушную веру, якая спярша жыла ў тваёй бабулі Лаідзе і тваёй маці Эўніцы» (*2*  1, 5). Па сутнасці, вернік — гэта «той, хто захоўвае памяць».

III. Новая евангелізацыя для пераказвання веры

14. Слухаючы Духа, які дапамагае нам супольна рас-паз-наваць знакі часу, з 7 па 28 кастрычніка 2012 го-да адбылося XIII звычайнае агульнае пасяджэнне Сіноду Біскупаў на тэму «Новая евангелізацыя для пераказвання хрысціянскай веры». Падчас яго згадвалася, што новая евангелізацыя як заклік скіравана да ўсіх і ў асноўным рэалізуецца ў трох напрамках[10]. У першую чаргу адзначым сферу , «якое найбольш павінна ажыўляцца агнём Духа, каб распальваць сэрцы вернікаў, якія рэгулярна ўдзельнічаюць у супольнасці і збіраюцца ў дзень Пана, каб насычацца Яго словам і Хлебам вечнага жыцця»[11]. Гэтая сфера ўключае таксама вернікаў, якія захоўваюць жывую і шчырую каталіцкую веру, і выяўляюць яе markedрознымі спосабамі, хоць не ўдзельнічаюць часта ў здзяйсненні культу. Гэтае пастырскае служэнне накіравана на ўзрастанне вернікаў, каб яны штораз паўней адказвалі на любоў Бога ўсім сваім жыццём. На другім месцы згадваем сферу «, , , »[12], не належаць усім сэрцам да Касцёла і не перажываюць больш суцяшэння, якое вынікае з веры. Касцёл як маці заўсёды рупіцца, каб яны перажылі навяртанне, якое вярнула б ім радасць веры і жаданне пранікнуцца Евангеллем.

Урэшце адзначым, што евангелізацыя істотна звя-зана з абвяшчэннем Евангелля тым, . Многія з іх, таксама і ў краінах са старажытнай хрысціянскай традыцыяй, таемна шукаюць Бога, ахопленыя тугой па Яго абліч-чы. Усе маюць права прыняць Евангелле. Хрысціяне абавязаны абвяшчаць яго ўсім без выключэння, не як тыя, хто навязвае новы абавязак, але як тыя, хто хоча падзяліцца радасцю, хто паказвае прыгожы далягляд, прапануе жаданую гасціну. Касцёл пашыраецца не дзя-кую-чы празелітызму, але «дзякуючы прываблівасці»[13].

15. Ян Павел II заахвоціў нас згадзіцца з тым, што «неабходна актыўна клапаціцца пра абвяшчэнне» тым, хто знаходзіцца здалёк ад Хрыста, «бо гэта »[14]. Місійная дзейнасць «таксама і сёння з’яўляецца для Касцёла»[15], а «справа місіі павінна быць на першым месцы»[16]. Што будзе, калі мы сапраўды сур’ёзна паставімся да гэтых словаў? Проста зразумеем, што місійная дзейнасць з’яўляецца . У сувязі з гэтым біскупы Лацінскай Амерыкі заявілі, што «нельга надалей заставацца спакойнымі, у пасіўным чаканні, у нашых касцёлах»[17] і што неабходна перайсці «ад кансерватыўнага пас-тыр-скага служэння да выразна місійнага»[18]. Гэтае заданне надалей з’яўляецца крыніцай вялікай радасці Касцёла: «...на нябёсах больш радасці будзе з аднаго грэшніка, які пакаяўся, чым з дзевяноста дзевяці праведнікаў, якія не патрабуюць пакаяння» ( 15, 7).

16. Я ахвотна прыняў прапанову Айцоў Сіноду скласці гэтую адгартацыю[19]. Робячы гэта, прымаю багацце прац Сіноду. Я кансультаваўся таксама з рознымі асобамі і намерваюся выразіць занепакоенасць, якую адчуваю ў гэты канкрэтны момант евангелізацыйнай дзейнасці Касцёла. Існуе вельмі шмат тэм, звязаных з евангелізацыяй у сучасным свеце, якія можна было б тут шырока прадставіць. Але я вырашыў не займацца падрабязна тымі шматлікімі пытаннямі, якія павінны быць прадметам стараннага вывучэння і глыбокага

аналізу. Не лічу таксама, што трэба чакаць ад папскага вучэння канчатковага ці вычарпальнага слова ў кожнай справе, якая датычаць Касцёла і свету. Не трэба, каб Папа замяняў мясцовыя Канферэнцыі Біскупаў у распазнаванні ўсіх праблем, якія ўзнікаюць на іх тэрыторыі. У гэтым выпадку я бачу неабходнасць прыняцця збаўеннай «дэцэнтралізацыі».

17. Я вырашыў прапанаваць некаторыя рэ-ка-мен-дацыі, якія могуць ініцыіраваць і накіроўваць ва ўсім Касцёле новы евангелізацыйны этап, поўны запалу і дынамізму. У гэтым кантэксце і на аснове вучэння Дагматычнай канстытуцыі *Lumen gentium* я пастанавіў больш шырока разгледзіць наступныя пытанні:

*a*) Рэформа Касцёла ў пачатку місійнай дзейнасці.

) Спакусы ўдзельнікаў пастырскага служэння.

) Касцёл як сукупнасць Божага народу, які евангелізуе.

) Гамілія і яе падрыхтоўка.

) Сацыяльная інтэграцыя бедных.

) Спакой і сацыяльны дыялог.

) Духоўныя матывацыі місійнай дзейнасці.

18. Можа здавацца, што я зашырока акрэсліў гэтыя тэмы. Але я зрабіў гэта не для таго, каб прадставіць пэўны трактат, але толькі для таго, каб паказаць важны і практычны ўплыў гэтых праблем на актуальнае заданне Касцёла. Усе яны сапраўды дапамагаюць вызначыць пэўны стыль евангелізацыі, які заахвочваю прыняць . І вось, та-кім чынам сярод усіх нашых штодзённых спраў можам прыняць настаўленне Божага слова: «Радуй-це-ся заў-сёды ў Пану. Яшчэ раз кажу: радуйцеся» ( 4, 4).

## РАЗДЗЕЛ I

## МІСІЙНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ КАСЦЁЛА

19. Евангелізацыя з’яўляецца адказам на місійны наказ Езуса: «...ідзіце і навучайце ўсе народы, і хрысціце іх у імя Айца і Сына, і Духа Святога. Вучыце іх захоўваць усё, што Я загадаў вам» ( 28, 19-20). У гэтых вершах прадстаўлены момант, калі Уваскрослы пасылае сваіх вучняў прапаведаваць Евангелле ў кожны час і ў кожным месцы, каб вера ў Яго дасягнула ўсіх куткоў зямлі.

20. У Божым слове пастаянна прысутнічае гэты дынамізм «выйсця», які Бог хоча абудзіць у верных. Абрагам прыняў заклік адправіцца ў новую зямлю (пар. 12, 1-3). Майсей пачуў Божы загад ісці да фараона, каб вывесці сыноў Ізраэля з Егіпта (пар. 3,10), і ён прывёў народ у абяцаную зямлю (пар. 3, 17). Ераміі Бог сказаў: «...да ўсіх, да каго Я пашлю цябе, пойдзеш» ( 1, 7). Сёння ў гэтым «ідзіце» Езуса заўсёды прысутнічаюць новыя сцэнарыі і выклікі евангелізацыйнай місіі Касцёла, і ўсе мы пакліканы да гэтага новага місійнага «выйсця». Кожны хрысціянін і кож-ная супольнасць павінны распазнаць, на які шлях іх кліча Езус, аднак усе запрошаны прыняць гэты заклік: вый-сці з уласнага камфорту і знайсці адвагу дасягнуць кож-най перыферыі свету, якая патрабуе святла Евангелля.

21. Радасць Евангелля, якая напаўняе жыццё супольнасці вучняў, гэта місійная радасць. Яе адчуваюць семдзесят два вучні, якія вяртаюцца з місіі, поўныя радасці (пар. 10, 17). Яе мае Езус, які радуецца ў Духу Святым і праслаўляе Айца, бо Яго аб'яўленне дасягае бедных і найменшых (пар. 10, 21). Яе адчуваюць поўныя захаплення першыя з тых, хто навярнуўся, калі слухаюць прапаведаванне Апосталаў у дзень Пяцідзесятніцы, «бо кожны з іх чуў, што яны гавораць на ягонай мове» ( 2, 6). Гэтая радасць з'яўляецца знакам таго, што Евангелле было абвешчана і прынесла плён. Але яна заўсёды мае дынаміку выйсця і дару, выйсця па-за сваё «я» і руху наперад, каб сеяць увесь час нанова, увесь час больш. Пан кажа: «Пойдзем куды-небудзь у блізкія паселішчы, каб Я і там прапаведаваў, бо дзеля гэтага Я прыйшоў» (*М* 1, 38). Калі несенне было пасеяна ў пэўным месцы, Ён больш не затрымліваецца, каб лепш растлумачыць ці ўчыніць чарговыя знакі, але Дух вядзе Яго наперад, да іншых паселішчаў.

22. Слова мае ў сабе патэнцыял, які мы не можам прадбачыць. Евангелле кажа пра насенне, якое, аднойчы пасеянае, расце само, нават калі земляроб спіць (пар. 4, 26-29). Касцёл павінен прыняць гэтую няўлоўную свабоду слова, якое па-свойму з'яў-ляецца плённым, у розных формах, якія часта не супадаюць з нашымі прагнозамі і ламаюць нашыя схемы.

23. Сяброўства Касцёла з Езусам — гэта дынаміч-нае сяброўства, а камунія «ў самой сваёй сутнасці прымае форму місійнай камуніі»[20]. Важна, каб Касцёл, верны прыкладу Настаўніка, выходзіў сёння абвяшчаць Евангелле ўсім, ва ўсіх месцах, пры кожнай нагодзе, неадкладна, без непрыязі і без страху. Радасць Евангел-ля прызначана для ўсіх людзей без выключэння. Так абвяшчае яе анёл бэтлеемскім пастухам: «Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць, якая будзе » ( 2, 10). Апакаліпсіс кажа пра абвяшчэнне вечнага Евангелля жыхарам зямлі і , , , (пар. *А* 14, 6).

, , ,

24. Касцёл, які вырушае ў дарогу, — гэта місійная супольнасць вучняў, якія бяруць на сябе ініцыятыву, далучаюцца, спадарожнічаюць, прыносяць плён і святкуюць. «*Primerear* азначае ‘узяць на сябе іні-цыя-тыву’» — прабачце мне гэты неалагізм. Еван-ге-лізацыйная супольнасць спазнае, што Пан узяў на сябе ініцыятыву і першым палюбіў нас (пар. *1*  4, 10), і таму яна ведае, як зрабіць першы крок, умее браць на сябе ініцыятыву без страху, умее выйсці насустрач, каб шукаць тых, хто аддаліўся, і дабрацца да скрыжавання дарог, каб запрасіць адчужаных. Яна мае вялікае жаданне ўдзяляць міласэрнасць — плён спазнанай бясконцай міласэрнасці Айца і Яго ўсёабдымнай мо-цы. Адважымся ж крыху больш браць на сябе іні-цыя-тыву! У выніку гэтага Касцёл зможа «далучыцца». Езус абмыў ногі сваім вучням. Пан распачынае справу і далучае сваіх вучняў, становячыся на калені перад іншымі, каб абмыць іх. Але адразу пасля гэтага кажа вучням: «Калі <...> чыніце так, вы шчаслівыя» ( 13, 17). Евангелізацыйная супольнасць уваходзіць праз справы і жэсты ў штодзённае жыццё іншых, скарачае дыстанцыю, прыніжаецца аж да знявагі, калі гэта неабходна, прымае чалавечае жыццё і дакранаецца да церпячага цела Хрыста ў людзях. Таму евангелізатары маюць «пах авечак», а яны слухаюць іх голас. Такім чы-нам евангелізацыйная супольнасць набывае здоль-насць «спадарожнічаць». Яна спадарожнічае чалавецтву ва ўсіх яго выпрабаваннях, у тым ліку цяжкіх і нярэдка доўгатрывалых. Ведае, што такое доўгае чаканне і апостальская вытрываласць. У справе евангелізацыі патрэбна цярплівасць і ўлічванне абмежаванасці. Верная дару Пана, яна таксама «прыносіць плён». Евангелізацыйная супольнасць заўсёды зважае на плён, бо Пан хоча, каб яна была плённай. Яна клапоціцца пра зерне і не губляе спакой з-за пустазелля. Калі сейбіт заўважае пустазелле сярод пшаніцы, не пачынае лямантаваць ці біць трывогу. Шукае спосаб, каб слова ўцелавілася ў канкрэтнай сітуацыі і прынесла плён новага жыцця, хоць ён можа здавацца недасканалым і няпоўным. Вучань здольны ахвяраваць усё сваё жыццё і нават рызыкаваць ім аж да мучаніцтва, каб сведчыць пра Езуса Хрыста, але ён марыць не аб набыцці сабе ворагаў, але хутчэй аб тым, каб слова было прынятае і выявіла сваю моц, якая вызваляе і аднаўляе. Урэшце, радасная евангелізайная супольнасць заўсёды здольная «святкаваць». Адзначае і святкуе кожную маленькую перамогу, кожны крок наперад у евангелізацыі. Радасная евангелізацыя становіцца прыгажосцю ў літургіі і штодзённа памнажае дабро. Касцёл евангелізуе, і сам евангелізуецца праз прыгажосць літургіі, якая з’яўляецца таксама цэлебрацыяй евангелізацыйнай дзейнасці, а таксама крыніцай адноўленай гатоўнасці прыносіць дар.

II. Пастырства ў навяртанні

25. Я ўсведамляю, што сёння дакументы не выклікаюць такога інтарэсу, як у іншыя часы, і хутка забываюцца. Тым не менш падкрэсліваю, што тое, аб чым я хачу сказаць, мае праграмнае значэнне і важныя наступствы. Спадзяюся, што ўсе супольнасці будуць прыкладваць намаганні, каб ісці наперад па шляху пастырскага і місійнага навяртання, якое не можа пакінуць усё так, як ёсць. Сёння мы не патрабуем «звычайнага кіравання»[21]. Давайце ж будзем ва ўсіх рэгіёнах зямлі ў «пастаянным стане місіі»[22].

26. Павел VI запрасіў пашырыць заклік да аднаўлення, моцна падкрэсліваючы, што не звяртаецца толькі да адзінак, але да ўсяго Касцёла. Успомнім гэты памятны тэкст, які не страціў сваёй інтэрпеляцыйнай сілы: «Касцёл павінен паглыбіць сваё самаўсведамленне, разважаючы над уласнай таямніцай <…>. З гэтага выразнага і дзейснага самаўсведамлення вынікае спантаннае жаданне параўнаць ідэальны вобраз Касцёла, якім бачыў яго Хрыстус, якога жадаў і які палюбіў як сваю святую і беззаганную Абранніцу ( 5, 27), з сапраўдным аблiччам, якое Касцёл мае сёння. <…> Адсюль вынікае ахвярнае і амаль нецярплівае жаданне адновы, г. зн. выпраўлення памылак, якія гэтае самаўсведамленне, як экзамен перад люстэркам прыкладу, які пакінуў нам Хрыстус, выкрывае і адкідае»[23].

Другі Ватыканскі Сабор прадставіў навяртанне Касцёла як гатоўнасць да пастаяннай рэформы самога сябе дзеля вернасці Езусу Хрысту: «...кожнае аднаўленне Касцёла па сваёй сутнасці грунтуецца на ўзрастанні вернасці свайму пакліканню <…>. Хрыстус заклікае пілігрымуючы Касцёл да няспыннай рэформы, якой ён, як зямная і чалавечая інстытуцыя, надалей патрабуе»[24].

Існуюць касцёльныя структуры, якія могуць спрыяць евангелізацыйнаму дынамізму; гэтаксама, добрыя структуры будуць карыснымі, калі жыццё будзе іх ажыўляць, падтрымліваць і кіраваць імі. Без новага жыцця і сапраўднага евангельскага духа, без «вернасці Касцёла свайму пакліканню» кожная новая структура ў хуткім часе дэградуе.

27. Я мару аб выбары місійнага шляху, які здольны перамяніць усё так, што звычаі, стылі, расклад заняткаў, мова і ўсе касцёльныя структуры стануць паўнавартаснымі каналамі найперш для евангелізацыі сучаснага свету, а не для самазахавання. Рэформу структур, якая патрабуе пастырскай адновы, можна зразумець толькі ў наступным сэнсе: неабходна, каб усе яны сталіся больш місійнымі, каб звычайнае пастырства ва ўсіх сваіх формах было больш шырокім і адкрытым, каб вяло людзей, якія ў ім удзельнічаюць, да пастаяннага «выйсця» і праз гэта спрыяла станоўчаму адказу ўсіх тых, каго Езус адорвае сваім сяброўствам. Як казаў Ян Павел II біскупам Акеаніі, «кожнае аднаўленне ў Касцёле павінна мець на мэце місію, каб не стаць ахвярай свайго роду касцёльнай замкнёнасці»[25].

28. Парафія не з’яўляецца скамянелай структурай; менавіта таму, што мае вялікую гнуткасць, можа прымаць розныя формы, якія патрабуюць адкрытасці і місійнай крэатыўнасці ад пастыра і супольнасці. Канешне, парафія не з’яўляецца адзіным інстытутам евангелізацыі, аднак, калі захоўвае здольнасць да рэформы і пастаяннай адаптацыі, яна надалей будзе «самым Касцёлам, які знаходзіцца сярод сваіх сыноў і дачок»[26]. Гэта дапускае, што яна сапраўды мае трывалы кантакт з сем’ямі і з жыццём людзей, і не становіцца нерухомай структурай, аддзеленай ад людзей, ці групай выбраных, якія сканцэнтраваны на сабе. Парафія —- гэта форма прысутнасці Касцёла на тэрыторыі, гэта

асяродак слухання слова, развіцця хрысціянскага жыцця, дыялогу, прапаведавання, ахвярнай любові, адарацыі і цэлебрацыі[27]. Праз усю сваю дзейнасць парафія натхняе і фарміруе сваіх членаў, каб яны сталі людзьмі, якія ўдзельнічаюць у евангелізацыі[28]. Гэта супольнасць супольнасцяў, санктуарый, куды сасмаглыя прыходзяць і наталяюцца, каб крочыць далей, гэта цэнтр пастаяннага місійнага пасланніцтва. Аднак мы павінны прызнаць, што заклік да аднаўлення нашых парафій яшчэ не даў дастатковага плёну, каб яны сталі бліжэй да людзей і былі асяроддзем жывой камуніі і ўдзелу, каб цалкам арыентаваліся на місійную дзейнасць.

29. Іншыя касцёльныя ўстановы, асноўныя і малыя супольнасці, рухі, а таксама іншыя формы таварыстваў з’яўляюцца багаццем Касцёла. Дух абуджае іх для евангелізацыі ўсіх асяроддзяў і сфераў. Яны за кожным разам уносяць новы евангелізацыйны запал і здоль-насць да дыялогу са светам, і гэта аднаўляе Касцёл. Але вельмі пажадана, каб яны не гублялі кантакту з вельмі багатай рэчаіснасцю мясцовай парафіі і ахвотна ўключаліся ў арганічную пастырскую дзейнасць мясцовага Касцёла[29]. Такая інтэграцыя не дазволіць ім застацца сам насам толькі з часткай Евангелля і Касцёла або ператварыцца ў качэўнікаў, пазбаўленых каранёў.

30. Кожны мясцовы Касцёл, як частка Каталіцкага Касцёла пад кіраўніцтвам свайго біскупа, пакліканы да місійнага навяртання. Ён з’яўляецца аб’ектам евангелізацыі[30], бо з’яўляецца канкрэтным праяўленнем адзінага Касцёла ў пэўным месцы на зямлі, «у якім праўдзіва прысутнічае і дзейнічае адзіны, святы, каталіцкі і апостальскі Касцёл»[31]. З’яўляецца Касцёлам, які ўцелавіўся ў пэўнай прасторы і які мае ўсе сродкі збаўлення, дадзеныя Хрыстом, але з мясцовымі адметнасцямі. Ягоная радасць з абвяшчэння Езуса Хрыста выражаецца таксама ў клопаце пра абвяшчэнне Яго ў тых месцах, дзе гэта найбольш патрэбна, а таксама ў пастаянным выйсці на перыферыі сваёй тэрыторыі або да новых сацыяльна-культурных асяроддзяў[32]. Ён стараецца быць заўсёды там, дзе найбольш не хапае святла і жыцця Уваскрослага[33]. Для таго, каб гэты місійны імпульс заўсёды станавіўся штораз больш інтэнсіўным, велікадушным і плённым, я заахвочваю ўсе мясцовыя Касцёлы распачаць рашучы працэс распазнання, ачышчэння і рэформы.

31. Біскуп павінен заўсёды спрыяць місійнай камуніі ў сваім дыяцэзіяльным Касцёле, імкнучыся да ідэалу першых хрысціянскіх супольнасцяў, вызнаўцы якіх «былі адзіныя сэрцам і душою» ( 4, 32). Таму часам ён павінен быць наперадзе, каб паказаць шлях і падтрымаць надзею людзей, а часам быць проста сярод усіх са сваёй шчырасцю і міласэрнасцю, а ў некаторых выпадках павінен будзе ісці за народам, каб дапамагчы тым, хто застаўся ззаду, і — перадусім — таму, што сам статак мае нюх для распазнання новых дарог. Біскуп павінен спрыяць дынамічнай, адкрытай і місійнай камуніі, ён абавязаны дапамагаць вернікам у дасягненні сталасці праз розныя формы ўдзелу, якія прапануе [34], а таксама іншыя формы пастырскага дыялогу, жадаючы слухаць усіх, а не толькі некаторых, заўсёды гатовых рабіць яму кампліменты. Аднак мэтай гэтага ўдзелу не будзе ў першую

чаргу касцёльная арганізацыя, але рэалізацыя місійнай мары дасягнуць усіх.

32. З моманту, калі я быў пакліканы жыць тым, да чаго заклікаю іншых, я таксама павінен думаць пра навяртанне папства. Як Біскуп Рыма я павінен заставацца адкрытым на прапановы, якія датычаць выканання майго служэння, каб зрабіць яго больш верным значэнню, якое Езус Хрыстус хацеў яму надаць, а таксама іншым актуальным патрэбам евангелізацыі. Папа Ян Павел II папрасіў дапамагчы знайсці «такую форму спаўнення першынства, якая, не адкідаючы таго, што з'яўляецца істотным для яго місіі, была б адкрытай на новую сітуацыю»[35]. Няшмат мы зрабілі для гэтага. Як папства, так і цэнтральныя структуры паўсюднага Касцёла павінны ўслухоўвацца ў заклік да пастырскага навяртання. Другі Ватыканскі Сабор сцвердзіў, што такім жа чынам, як старажытныя патрыярхальныя Касцёлы, Канферэнцыі Біскупаў «могуць сёння ўнесці разнастайны і плённы ўклад у канкрэтную рэалізацыю жадання калегіяльнасці»[36]. Але гэтае жаданне не рэалізавалася цалкам, бо да гэтага часу статут Канферэнцый Біскупаў не атрымаў выразнай формы, якая б прадстаўляла іх як суб'ектаў з канкрэтнымі паўнамоцтвамі, уключна з пэўным аўтэнтычным дактрынальным аўтарытэтам[37]. Празмерная цэнтралізацыя замест таго, каб дапамагаць, ускладняе жыццё Касцёла і развіццё яго місійнага дынамізму.

33. Пастырскае служэнне ў місійным ключы патрабуе адмаўлення ад зручнага пастырскага крытэрыя, што «так заўсёды было». Я заахвочваю ўсіх быць адважнымі і крэатыўнымі ў гэтым заданні пераасэнсавання мэтаў, структуры, стылю і метадаў евангелізацыі сваёй супольнасці. Вызначэнне мэтаў без адпаведнага супольнага даследавання сродкаў для іх дасягнення стане чыстай фантазіяй. Я заклікаю ўсіх ахвярна і мужна ажыццяўляць прынцыпы гэтага дакументу, без забаронаў і страхаў. Важна не ісці аднаму, але заўсёды абапірацца на братоў, асабліва на кіраўніцтва біскупаў, з мудрай і рэалістычнай пастырскай разважлівасцю.

III. З сэрца Евангелля

34. Калі хочам разглядаць усё ў місійным ключы, то датычыць гэта таксама і спосабу перадачы паслання. У сённяшнім свеце, з хуткай камунікацыяй і карыслівым адборам зместу ў сродках масавай інфармацыі, пасланне, якое мы абвяшчаем, больш чым калі-небудзь рызыкуе быць знявечаным і зведзеным да другарадных аспектаў. Адсюль вынікае, што некаторыя пытанні, якія з'яўляюцца часткай маральнага вучэння Касцёла, застаюцца па-за кантэкстам, які надае ім сэнс. Самая вялікая праблема ўзнікае тады, калі пасланне, якое мы абвяшчаем, атаясамліваецца з другараднымі аспектамі, якія — хоць і з'яўляюцца значнымі — самі па сабе не выяўляюць сутнасці паслання Езуса Хрыста. Таму мы павінны быць рэалістамі і не думаць, што нашыя суразмоўцы ведаюць поўны фон таго, аб чым кажам, або што яны могуць звязаць нашыя словы з асноўным стрыжнем Евангелля, якое надае яму сэнс, прыгажосць і прывабнасць.

35. Пастырская дзейнасць у місійным ключы не імкнецца да свабоднага пераказу многіх вучэнняў, якія ёй навязваюцца. Калі выбіраецца пастырская мэта і місійны стыль, які сапраўды дасягне ўсіх без абмежаванняў і выключэнняў, то прапаведаванне канцэнтруецца на істотным, на самым прыгожым, большым, найбольш прывабным і адначасова на найбольш неабходным. Прапанова становіцца прасцейшай, не губляючы пры гэтым глыбіні і праўды, і праз гэта набывае большую перакананасць і бляск.

36. Усе абʼяўленыя праўды паходзяць з той самай боскай крыніцы, і ў іх трэба верыць з той самай верай, але некаторыя з іх зʼяўляюцца важнейшымі, бо найбольш выразна выяўляюць сутнасць Евангелля. У гэтым фундаментальным стрыжні ззяе , ʼ , - . У сувязі з гэтым Другі Ватыканскі Сабор сцвердзіў, што існуе парадак ці, дакладней, «“іерархія” праўд каталіцкага веравучэння, паколькі іх сувязь з першаасновай хрысціянскай веры неаднолькавая»[38]. Гэта датычыць як дагматаў веры, так і ўсяго навучання Касцёла, уключна з маральным.

37. Св. Тамаш Аквінскі вучыў, што нават у маральным пасланні Касцёла існуе цнотаў і дзеянняў[39]. Тое, што тут мае значэнне, гэта перадусім «вера, якая дзейнічае праз любоў» ( 5, 6). Справы любові да бліжняга зʼяўляюцца найбольш дасканалым знешнім праяўленнем унутранай ласкі Духа: «Асноўным элементам новага закону зʼяўляецца ласка Духа Святога, якая выяўляецца ў веры, што дзейнічае праз любоў»[40]. Таму сцвярджаў, што ў дачыненні да знешняга дзеяння, міласэрнасць зʼяўляецца найбольшай з усіх цнотаў: «Міласэрнасць — гэта найбольшая цнота, бо яе сутнасць заключаецца ў тым, каб даваць сябе іншым, больш за тое, каб аблегчыць іхнюю беднасць; гэта зʼяўляецца доказам перавагі. Таму міласэрнасць — гэта ўласці-васць Бога, бо ў ёй найбольш выразна выяўляецца Яго ўсемагутнасць»[41].

38. Важна зрабіць пастырскія высновы з вучэння Сабора, якое пацвярджае старажытнае перакананне Касцёла. Перадусім трэба сказаць, што ў абвяшчэнні Евангелля неабходна захоўваць належныя прапорцыі. Іх можна пазнаць па тым, як часта закранаюцца некаторыя тэмы і на што ставіцца акцэнт у прапаведаванні. Напрыклад, калі нейкі пробашч на працягу літургічнага года дзесяць разоў кажа пра ўстрыманне і толькі два ці тры разы пра любоў або справядлівасць, адбываецца дыспрапорцыя, у выніку якой менавіта тыя цноты, якія найчасцей павінны прысутнічаць у прапаведаванні і катэхезе, застаюцца без увагі. Тое самае адбываецца, калі больш гаворыцца пра закон, чым пра ласку, больш пра Касцёл, чым пра Езуса Хрыста, больш пра Папу, чым пра Божае слова.

39. Як існуе лучнасць паміж цнотамі, якая не дазваляе якую-небудзь з іх выключыць з хрысціянскага ідэалу, так не можа быць аспрэчана ніякая праўда. Нельга калечыць цэласнасць евангельскага паслання. Больш за тое, кожную праўду прасцей зразумець, калі мы бачым яе ў гарманічнай лучнасці з усім хрысціянскім пасланнем, і ў гэтым сэнсе ўсе праўды маюць сваё значэнне і асвячаюць адна адну. Калі прапаведаванне зʼяўляецца верным Евангеллю, выразна бачны галоўны характар некаторых праўдаў, і становіцца зразумелым, што прапаведаванне хрысціянскай маральнасці — гэта не стаічная этыка; гэта

нешта большае за аскетызм; гэта не проста практычная філасофія ці каталог грахоў і памылак. Евангелле заахвочвае ў першую чаргу даць адказ Богу, які нас любіць і збаўляе, распазнаючы Яго ў іншых і выходзячы па-за сваё «я», каб шукаць дабра для ўсіх. Гэтае запрашэнне не павінна быць на другім плане ні пры якіх абставінах! Усе цноты служаць гэтаму адказу любові. Калі гэтае запрашэнне не ззяе з моцай і не мае прывабнасці, маральная будова Касцёла рызыкуе стаць картачным домікам, і гэта найгоршая наша небяспека. Бо тады, сцісла кажучы, будзе абвяшчацца не Евангелле, а некаторыя дактрынальныя або маральныя акцэнты, якія зыходзяць з пэўных ідэалагічных поглядаў. Пасланне можа згубіць сваю свежасць і не будзе больш мець «водару Евангелля».

IV. Місія, якая ўпісваецца ў чалавечыя абмежаванні

40. Касцёл, які з’яўляецца вучнем, настроеным на місію, павінен узрастаць у сваёй інтэрпрэтацыі аб’яўленага слова і ў сваім разуменні праўды. Заданне экзэгетаў і тэолагаў заключаецца ў дапамозе, каб «сталела вучэнне Касцёла»[42]. Іншым чынам робяць гэта таксама іншыя навуковыя дысцыпліны. Напрыклад, спасылаючыся на думкі сацыяльнага вучэння, Ян Павел II сказаў, што Касцёл звяртае ўвагу на іх уклад, «каб атрымаць канкрэтныя ўказанні, якія дапамогуць яму выканаць сваю місію Настаўніцкага Інстытуту»[43]. Акрамя таго, у Касцёле існуюць шматлікія пытанні, якія даследуюцца і абмяркоўваюцца з вялікай свабодай. Розныя плыні філасофскай, тэалагічнай і пастырскай думкі, калі дазваляюць Духу гарманізаваць сябе з павагай і любоўю, могуць паспрыяць развіццю Касцёла, калі будуць дапамагаць лепш растлумачыць багаты скарб слова. Тым, хто марыць аб маналітным вучэнні, якое б прымалася ўсімі без ніякіх выключэнняў, гэта можа здавацца недасканалым рассейваннем. Але рэальнасць такая, што менавіта разнастайнасць дапамагае паказваць і лепш развіваць розныя аспекты невычэрпных багаццяў Евангелля[44].

41. У той жа час значныя і хуткія культурныя змены патрабуюць няспыннай увагі да таго, каб імкнуц-ца выражаць вечныя праўды мовай, якая дазволіла б распазнаваць іх нязменную навізну. Бо ў дэпазіце хрысціянскага вучэння «адна рэч — гэта сутнасць <…>, другая — спосаб яе выражэння»[45]. Часам, слухаючы цалкам артадаксальную мову, здаецца, што вернікі з прычыны мовы, якой яны карыстаюцца і разумеюць, атрымліваюць тое, што не адпавядае сапраўднаму Евангеллю Езуса Хрыста. Са святым намерам перадаць ім праўду пра Бога і чалавека ў некаторых выпадках мы даём ім фальшывага бога ці чалавечы ідэал, які не з’яўляецца сапраўды хрысціянскім. Такім чынам мы захоўваем вернасць пэўнай фармуліроўцы, але не перадаём сутнасці. Гэта вельмі сур’ёзная небяспека. Памятаем, што «выражэнне праўды можа быць разнастайным, і аднаўленне формаў выражэння становіцца неабходным для перадачы сучаснаму чалавеку евангельскага паслання ў яго нязменным сэнсе»[46].

42. У абвяшчэнні Евангелля вельмі важна, каб мы сапраўды імкнуліся данесці да ўсіх яго прыгажосць, каб яе лепш заўважылі і прынялі. Ва ўсялякім выпадку, мы ніколі не будзем

рабіць вучэння Касцёла чымсьці лёгкім у разуменні і шчасліва ўспрынятым усімі. Вера заўсёды захоўвае пэўны аспект крыжа, пэўны яго цень, які не пазбаўляе рашучасці далучыцца да яе. Ёсць рэчы, разуменне і ацэнка якіх пачынаецца толькі з гэтага далучэння, якое з'яўляецца сястрой любові, незалежна ад глыбіні разумення прычын і аргументаў. Таму неабходна памятаць, што кожнае выкладанне вучэння павінна адбывацца ў форме евангелізацыі, якая праз блізкасць, любоў і сведчанне абудзіць сэрца для далучэння.

43. У сваім няспынным распазнанні Касцёл можа таксама зразумець уласныя звычаі, не звязаныя непасрэдна з сутнасцю Евангелля. Хоць некаторыя з іх моцна ўкараніліся на працягу гісторыі, аднак сёння яны не маюць ужо былой інтэрпрэтацыі, а іх значэнне зазвычай не ўспрымаецца належным чынам. Яны могуць быць прыгожымі, але сёння не маюць ужо такой ролі ў перадачы Евангелля. Не пабаімся ж перагледзіць іх. Таксама існуюць касцёльныя нормы або наказы, якія былі вельмі эфектыўнымі ў іншыя эпохі, але якія не маюць больш той выхаваўчай сілы, як каналы жыцця. Св. Тамаш Аквінскі падкрэсліваў, што наказы, дадзеныя Хрыстом і Апосталамі Божаму народу «вельмі нешматлікія»[47]. Цытуючы св. Аўгустына, ён заўважаў, што ў наказах, дададзеных пазней Касцёлам, трэба захоўваць меру, «каб не ўскладняць жыццё вернікаў» і не ператварыць нашую рэлігію ў рабства, паколькі «Божая міласэрнасць хацела, каб яна была свабоднай»[48]. Гэтая заўвага, зробленая шмат стагоддзяў назад, мае вялікую актуальнасць. Яна павінна стаць адным з крытэрыяў у разважанні над рэформай Касцёла і яго прапаведавання, якія сапраўды дазволяць ахапіць усіх.

44. З іншага боку, як пастыры, так і ўсе вернікі, якія спадарожнічаюць сваім братам у веры ці на шляху адкрыцця Богу, не могуць забываць пра тое, чаму так выразна навучае : «Абвінавачванне і адказнасць за нейкае дзеянне могуць быць зменшаныя, а нават скасаваныя з прычыны няведання, няўважлівасці, гвалтоўнага прымусу, боязі, неўтаймаваных пачуццяў, звычак і іншымі псіхалагічнымі ці сацыяльнымі фактарамі»[49].

Таму, не змяншаючы вартасці евангельскага ідэалу, неабходна з міласэрнасцю і цярплівасцю спадарожнічаць магчымым этапам узрастання асобаў, якія фарміруюцца з дня ў дзень[50]. Святарам нагадваю, што канфесіянал не павінен быць камерай катаванняў, але месцам міласэрнасці Пана, які заахвочвае нас чыніць магчымае дабро. Маленькі крок сярод вялікіх чалавечых магчымасцяў можа больш падабацца Богу, чым знешне правільнае жыццё чалавека, які праводзіць дні без змагання з сур'ёзнымі цяжкасцямі. Да ўсіх павінна дайсці суцяшэнне і імпульс збаўчай любові Бога, якая таямніча дзейнічае ў кожнай асобе, незалежна ад яе недахопаў і ўпадкаў.

45. Такім чынам бачым, што евангелізацыйная дзейнасць здзяйсняецца ў межах мовы і абставін. Яна заўсёды імкнецца да лепшай перадачы праўды Евангелля ў вызначаным кантэксце, без шкоды для праўды, дабра і святла, якія можа ўнесці, калі дасканаласць

з’яўляецца немагчымай. Місійнае сэрца ўсведамляе гэтыя абмежаванні і становіцца нядужым, каб здабыць нядужых, становіцца ўсім для ўсіх (пар. *1*  9, 22). Ніколі не замыкаецца, ніколі не дбае пра ўласную бяспеку, ніколі не выбірае жорсткай самаабароны. Ведае, што сама павінна ўзрастаць у разуменні Евангелля і ў распазнанні шляхоў Духа, і тады дзеля дасягнення найбольшага дабра не баіцца запэцкацца вулічным брудам.

V. Маці з адкрытым сэрцам

46. Касцёл, які «вырушае ў дарогу» — гэта Касцёл з адчыненымі дзвярыма. Выйсці насустрач іншым, каб дасягнуць людской перыферыі, не азначае бегчы ў свет без мэты і сэнсу. У многіх выпадках лепш запаволіць крок, супакоіцца, каб паглядзець у вочы і пачуць, або адкласці тэрміновыя справы, каб спадарожнічаць таму, хто застаўся на ўзбочыне дарогі. Часам Касцёл з’яўляецца айцом марнатраўнага сына і не замыкае перад ім дзверы, каб той, калі вернецца, мог увайсці без перашкод.

47. Касцёл пакліканы быць заўсёды адчыненым домам Айца. Адным з канкрэтных знакаў гэтай адкрытасці з’яўляецца паўсюдная наяўнасць касцёлаў з адчыненымі дзвярыма, каб той, хто хоча пайсці за натхненнем Духа і набліжаецца ў пошуках Бога, не сустрэўся з холадам зачыненых дзвярэй. Але ёсць яшчэ іншыя дзверы, якія таксама павінны быць адчынены. Усе могуць нейкім чынам удзельнічаць у касцёльным жыцці; усе могуць належаць да супольнасці, нават дзверы сакрамэнтаў не павінны зачыняцца па якой-небудзь прычыне. Гэта датычыць перадусім сакрамэнту хросту, які з’яўляецца «брамай». Эўхарыстыя, хоць і з’яўляецца паўнатой сакрамэнтальнага жыцця, — гэта не ўзнагарода для дасканалых, але шчодры лек і ежа для слабых[51]. Гэтыя перакананні маюць таксама пастырскія вынікі, якія мы павіны разгледзець з разважлівасцю і адвагай. Мы часта паводзім сябе як кантралёры ласкі, а не як пасрэднікі. Але Касцёл — не мытня, а бацькоўскі дом, дзе ёсць месца для кожнага з яго нялёгкім жыццём.

48. Калі ўвесь Касцёл прымае гэты місійны ды-на-мізм, ён дасягне ўсіх без выключэння. Аднак каму павінен быць дадзены прыярытэт? Калі чытаем Евангелле, знаходзім выразнае ўказанне: не толькі сябры і багатыя суседзі, але перадусім бедныя і хворыя, тыя, кім часта пагарджаюць і пра каго часта забываюць, якія не маюць чым адплаціць (пар.  14, 14). Не павінна быць ніякіх сумненняў ці тлумачэнняў, якія аслабляюць гэтае вельмі выразнае пасланне. Сёння і заўсёды «бедныя з’яўляюцца прывілеяванымі адрасатамі Евангелля»[52], а бескарыслівa скіраваная да іх евангелізацыя з’яўляецца знакам Валадарства, якое прыйшоў прынесці Езус. Трэба сцвердзіць без лішніх словаў, што існуе непадзельная сувязь паміж нашай верай і беднымі. Ніколі не будзем пакідаць іх у самоце.

49. Выйдзем жа, выйдзем, каб ахвяраваць усім жыццё Езуса Хрыста. Паўтараю тут для ўсяго Касцёла тое, што шматразова казаў святарам і свецкім вернікам у Буэнас-Айрэсе: я аддаю перавагу Касцёлу пабітаму, зраненаму і бруднаму, бо ён выйшаў на вуліцу, чым

Касцёлу хвораму ад замкнёнасці і камфорту, засяроджанаму на ўласнай бяспецы. Не хачу Касцёла, які заклапочаны быць цэнтрам, які ўрэшце замыкаецца ў гушчары дакучлівых ідэй і працэсаў. Калі штосьці павінна выклікаць святое абурэнне, непакоіць і турбаваць нашае сумленне, дык гэта тое, што столькі нашых братоў жыве без моцы, святла і суцяшэння, якое паходзіць ад сяброўства з Езусам Хрыстом, без супольнасці веры, якая б іх прыняла, без перспектывы сэнсу і жыцця. Я спадзяюся, што замест страху памыліцца, мы будзем кіравацца страхам, каб не быць зачыненымі ў структурах, якія даюць нам фальшывае пачуццё бяспекі, страхам перад прадпісаннямі, якія робяць нас бязлітаснымі суддзямі, перад звычкамі, у якіх мы адчуваем сябе спакойна, у той час, як побач з намі знаходзіцца мноства галодных, а Езус няспынна паўтарае нам: «Вы дайце ім есці!» (*М* 6, 37).

## РАЗДЗЕЛ II

## ВА ЎМОВАХ КРЫЗІСУ ГРАМАДСКАЙ АКТЫЎНАСЦІ

50. Перш, чым казаць аб некаторых фундаментальных пытаннях, звязаных з евангелізацыйнай дзейнасцю, варта коратка прыгадаць кантэкст, у якім мы жывём і дзейнічаем. Сёння прынята казаць пра «дыягнастычную празмернасць», якая не заўсёды суправаджаецца вырашальнымі і сапраўды прыдатнымі прапановамі. З іншага боку, не дапамагае нам і чыста сацыялагічны погляд, які хоча ахапіць усю рэчаіснасць толькі гіпатэтычна, нейтральна і асептычна. Тое, што намерваюся прапанаваць, ідзе перадусім па лініі евангельскага распазнання. Гэта погляд місійнага вучня, які «сілкуецца святлом і моцай Духа Святога»[53].

51. Заданнем Папы не з’яўляецца прадстаўленне падрабязнага і комплекснага аналізу сучаснай рэчаіснасці, аднак я заклікаю ўсе супольнасці захаваць «заўсёды пільную здольнасць даследаваць знакі часу»[54]. Гаворка ідзе аб сур’ёзнай адказнасці, бо некаторыя аспекты сучаснай рэчаіснасці, калі не будуць адпаведна вырашаны, могуць выклікаць працэсы дэгуманізацыі, з якіх пазней будзе цяжка выйсці. Варта ўдакладніць, што можа быць плёнам Валадарства і што перашкаджае Божым намерам. Тут маецца на ўвазе не толькі прызнанне і інтэрпрэтацыя натхненняў духа добрага і духа злога, але — і гэта з’яўляецца вырашальным — выбар натхнення добрага духа і адкідванне намоваў злога. Дапускаю розныя аналізаванні, змешчаныя ў іншых дакументах Настаўніцкага Інстытута Касцёла, а таксама прапанаваныя нацыянальнымі і рэгіянальны-мі Канферэнцыямі Біскупаў. У гэтай адгартацыі, зы-ходзячы з пастырскага погляду, маю намер толькі коратка спыніцца на некаторых аспектах рэчаіснасці, якія могуць затрымаць або запаволіць дынаміку місійнага аднаўлення Касцёла, бо яны або датычаць жыцця і годнасці Божага народу, або ўплываюць на суб’екты, якія больш непасрэдна з’яўляюцца часткай касцёльных інстытуцый і выконваюць евангелізацыйныя заданні.

### I. Некаторыя выклікі сучаснага свету

52. Чалавецтва ў дадзены момант перажывае гістарычныя змены, якія можам назіраць у прагрэсе, што адбываецца ў розных галінах. Неабходна пад-крэс-ліць дасягненні, якія спрыяюць дабрабыту людзей, напрыклад, у галіне медыцыны, адукацыі і камунікацыі. Аднак нельга забываць, што большая частка мужчын і жанчын нашага часу жывуць штодня ў нястачы, якая вядзе да катастрафічных наступстваў. Павялічваецца колькасць некаторых паталогій. Страх і роспач працінаюць сэрцы многіх асобаў, нават у гэтак званых багатых краінах. Часта знікае радасць жыцця, узрастае адсутнасць павагі і гвалт, сацыяльная няроўнасць становіцца ўсё больш відавочнай. Неабходна змагацца, каб жыць, і часта без захавання сваёй годнасці. Такая эпахальная перамена выклікана велізарнымі зрухамі, якія ў сэнсе якасці, колькасці, хуткасці і назапашвання адбываюцца ў навуковым прагрэсе, у тэхналагічных інавацыях і ў іх хуткім прымяненні ў прыродзе і ў жыцці. Мы жывём у эпоху ведаў і інфармацыі, якія з’яўляюцца крыніцай новых формаў улады, вельмі часта ананімнай.

«»

53. Так як запаведзь «не забівай» устанаўлівае выразную мяжу, каб захаваць каштоўнасць чалавечага жыцця, мы павінны сёння сказаць «“не” эканоміцы выключэння і несправядлівасці». Такая эканоміка забівае. Недапушчальна, каб навіной дня не стаў факт, што ад холаду памірае стары чалавек, вымушаны жыць на вуліцы. Аднак жа навіной становіцца зніжэнне двух пунктаў на біржы. Нельга далей не звяртаць увагі на тое, што калі столькі людзей пакутуюць ад голаду, ежа выкідваецца. Гэта — сацыяльная несправядлівасць. Сёння ўсё адбываецца ў рамках гульні канкурэнта-здольнасці і закону больш моцных, дзе моцны паглынае слабейшага. У выніку такой сітуацыі вялікія масы насельніцтва сустракаюцца з выключэннем і маргіналізацыяй: яны застаюцца без працы, без перспектывы, без выйсця. Сам чалавек разглядаецца як спажывецкі тавар, які можна выкарыстаць, а затым выкінуць. Мы далі пачатак культуры «адкідвання», якая непасрэдна распаўсюджваецца. І гаворка ўжо ідзе не проста аб феномене эксплуатацыі ці прыгнёту, але аб чымсьці новым: , , , на , але па-за ім. Выключаныя не «эксплуатуюцца», яны адкінутыя, з’яўляюцца «непатрэбнымі рэшткамі».

54. У гэтым кантэксце некаторыя ўсё яшчэ абараняюць тэорыю «спрыяльнага рэцэдыву», што кожны эканамічны рост, якому спрыяе свабодны рынак, здольны сам па сабе ствараць большую справядлівасць і сацыяльную інтэграцыю ў свеце. Гэтае меркаванне, якое ніколі не пацвярджалася фактамі, выяўляе дарэмнае і наіўнае спадзяванне на , , пануючай . , . Дзеля захавання стылю жыцця, які выключае іншых, і захаплення гэтым эгаістычным ідэалам, развілася глабалізацыя абыякавасці. Не ўсведамляючы гэтага, мы страчваем здольнасць спачуваць крыкам болю іншых, не плачам больш над горам іншых, не цікавіць нас клопат аб іх, быццам бы нас не датычыць гэтая адказнасць. Культура дабрабыту пазбаўляе нас чуласці, мы губляем спакой, калі рынак прапаноўвае нам штосьці, чаго мы яшчэ не купілі, у той час, як жыццё ўсіх гэтых людзей зруйнавана з-за недахопу магчымасцяў, але гэта здаецца нам проста спектаклем, які ніякім чынам нас не датычыць.

«»

55. Адна з прычын такой сітуацыі знаходзіцца ў нашым стаўленні да грошай, бо мы спакойна ўспрымаем іх панаванне над намі і над нашым грамадствам. , , , : адмаўленне ! Мы стварылі новых ідалаў. Культ старажытнага залатога цяльца (пар. 32, 1-35) знайшоў новую і бязлітасную версію ў ідалапаклонстве грашам і ў дыктатуры эканомікі без аблічча і без сапраўды гуманістычнай мэты. Сусветны крызіс, які закранае фінансы і эканоміку, выяўляе свой дысбаланс, а найперш вялікі недахоп антрапалагічнай скіраванасці, што ў выніку зводзіць чалавека толькі да адзінай з яго патрэб: да спажывання.

56. У той час, як прыбыткі некаторых растуць у геаметрычнай прагрэсіі, большасць штораз больш аддаляецца ад дабрабыту гэтай шчаслівай меншасці. Такі дысбаланс нараджае ідэалогія, якая абараняе абсалютную аўтаномію рынкаў і фінансавых спекуляцый. Таму яны адмаўляюць права кантролю з боку дзяржаў, якія пакліканы . Усталёўваецца новая нябачная тыранія, часам віртуальная, якая навязвае свае аднабаковыя і бязлітасныя законы і правілы. Акрамя таго, пазыка і яе павелічэнне аддаляюць краіны ад рэальных магчымасцяў іх эканомікі, а іх грамадзянаў ад іх сапраўднай спажывецкай здольнасці. Да ўсяго гэтага далучаецца распаўсюджаная карупцыя і эгаістычнае ўхіленне ад выплаты падаткаў, якія дасягнулі велізарных памераў. Імкненне да ўлады і валодання не ведае межаў. У гэтай сістэме, крохкае, як напрыклад прыроднае асяроддзе, застаецца безабаронным перад інтарэсамі абагаўлёнага рынку, якія становяцца адзіным правілам.

«» , ,

57. За такімі паставамі хаваецца адмаўленне этыкі і адкідванне Бога. Зазвычай на этыку глядзяць з пэўнай насмешкай і пагардай. Яна лічыцца тым, што прыно-сіць адваротны вынік, яна занадта чалавечная, бо яна адмаўляе грошы і ўладу. Яна ўспрымаецца як пагроза, бо асуджае маніпуляцыю і дэградацыю асобы. Урэшце, этыка скіроўвае да Бога, які чакае актыўнага адказу, што выходзіць па-за катэгорыі рынку. Нават калі гэтыя апошнія абсалютызуюцца, Бог не паддаецца іх кантролю, маніпуляцыі, а нават становіцца небяспечным для іх, бо заклікае чалавека да яго поўнай рэалізацыі і незалежнасці ад любога віду зняволення. Этыка — не ідэалагізаваная — дазваляе ствараць раўнавагу і больш гуманны грамадскі парадак. У гэтым сэнсе заклікаю фінансавых экспертаў і кіраўнікоў розных краін узяць пад увагу словы мудраца старажытнасці: «Не дзяліцца ўласнымі дабротамі з беднымі — значыць рабаваць іх і пазбаўляць жыцця. Даброты, якімі мы валодаем, не нашы, але іхнія»[55].

58. Фінансавая рэформа, якая бярэ пад увагу этыку, патрабуе вялікіх зменаў у пазіцыі палітычных лідэраў, якіх я заклікаю прыняць гэты выклік з рашучасцю і дальнабачнасцю, зважаючы, , на асаблівасць- . Грошы павінны служыць, а не кіраваць! Папа любіць усіх, багатых і бедных, але мае абавязак, у імя Хрыста, нагадваць, што багатыя павінны

дапамагаць бедным, павінны паважаць іх і садзейнічаць ім. Я заклікаю вас да бескарыслівай салідарнасці і да звароту эканомікі і фінансаў да этыкі на карысць чалавечай асобы.

«» ,

59. Сёння адусюль мы чакаем большай бяспекі. Але да той пары, пакуль не будуць ліквідаваныя выключэнне і грамадская няроўнасць у самім грамадстве і паміж рознымі народамі, немагчыма будзе выкараніць насілле. Гучыць абвінавачванне ў насіллі над убогімі і бяднейшымі слаямі насельніцтва, але без роўных магчымасцяў розныя формы агрэсіі і вайны знаходзяць спрыяльную глебу, якая раней ці пазней прывядзе да выбуху. Калі грамадства — мясцовае, нацыянальнае або сусветнае — пакідае на перыферыі сваю частку, то ніякія палітычныя праграмы, праваахоўныя сілы ці  не змогуць забяспечыць бязмежны спакой. Гэтага не будзе не толькі таму, што няроўнасць выклікае гвалтоўную рэакцыю тых, каго выключае сістэма, але і таму, што сацыяльная і эканамічная сістэма з’яўляецца па сваёй сутнасці несправядлівай. Як дабро мае тэндэнцыю да распаўсюджвання, так і зло, на якое згаджаемся, гэта значыць несправядлівасць, мае тэндэнцыю да пашырэння сваёй шкоднай моцы і да маўклівага разбурэння асноў любой палітычнай і сацыяльнай сістэмы, якімі б трывалымі яны не здаваліся. Калі кожнае дзеянне мае свае наступствы, то зло, якое гняздзіцца ў структурах пэўнага грамадства, заўсёды ўтрымлівае патэнцыял распаду і смерці. Ад зла, якое трывала ўпісана ў несправядлівыя грамадскія структуры, нельга чакаць лепшай будучыні. Мы далёкія ад гэтак званага «канца гісторыі», бо ўмовы ўраўнаважанага і мірнага развіцця яшчэ не акрэслены і не рэалізуюцца адпаведным чынам.

60. Механізмы сучаснай эканомікі стымулююць празмернае спажыванне, але аказваецца, што нястрыманае спажыванне ў спалучэнні з няроўнасцю ўдвая знішчае сацыяльную тканку. Такім чынам сацыяльная няроўнасць раней ці пазней нараджае насілле, якое не спыняе і ніколі не спыніць нарошчванне ваеннай моцы. Яна служыць толькі падману тых, хто імкнецца да найбольшай бяспекі, быццам бы мы сёння не ведаем, што ўзбраенне і жорсткія рэпрэсіі замест таго, каб весці да вырашэння, ствараюць новыя і яшчэ горшыя канфлікты. Некаторыя проста задавольваюцца абвінавачваннем убогіх і бедных краін у іх уласных праблемах, выкарыстоўваючы неабгрунтаваныя абагульненні, і хочуць знайсці вырашэнне ў «адукацыі», якая б супакоіла іх і перамяніла ў прыручаныя і бясшкодныя істоты. Гэта становіцца яшчэ больш балючым, калі выключаныя бачаць разрастанне такога сацыяльнага раку як карупцыя, што глыбока запусціла карэнне ў многіх краінах — ва ўрадзе, сярод прадпрымальнікаў і ў інстытуцыях — незалежна ад палітычнай ідэалогіі кіраўнікоў.

61. Мы евангелізуем таксама тады, калі імкнёмся супрацьстаяць разнастайным выклікам[56]. Часам яны выяўляюцца ў сапраўдных атаках на рэлігійную свабоду або ў новых сітуацыях

пераследу хрысціянаў, які ў некаторых краінах дасягнуў небяспечнага ўзроўню нянавісці і насілля. У шматлікіх месцах гаворка перадусім ідзе аб распаўсюджанай рэлятывісцкай абыякавасці, спалучанай з расчараваннем і крызісам ідэалогіі, які наступіў у выніку рэакцыі на ўсё, што мае смак таталітарызму. Гэта прыносіць шкоду не толькі Касцёлу, але грамадскаму жыццю ў цэлым. Мы прызнаём, што культура, у якой кожны хоча мець сваю суб’ектыўную праўду, ускладняе грамадзянам удзел у агульнай справе, што выходзіць па-за асабістыя інтарэсы і жаданні.

62. У дамінуючай культуры першае месца займае тое, што з’яўляецца знешнім, непасрэдным, бачным, хуткім, павярхоўным і часовым. Рэальнасць саступае месца ілюзіі. У многіх краінах глабалізацыя прывяла да паскоранага знішчэння культурных каранёў, да пранікнення ўплываў іншых, эканамічна развітых, але этычна аслабленых культур. Пра гэта гаварылася на многіх Сінодах Біскупаў розных кантынентаў. Біскупы Афрыкі, напрыклад, спасылаючыся на энцыкліку *Sollicitudo rei socialis*, некалькі гадоў таму паведамлялі, што неаднойчы выказваліся намеры перамяніць краіны Афрыкі ў звычайныя «элементы механізму, часткі гіганцкай машыны. Гэта нярэдка датычыць таксама сродкаў масавай камунікацыі, якія найбольш кіруюцца Паўночнымі цэнтрамі свету і не заўсёды бяруць пад увагу прыярытэты і ўласныя праблемы гэтых краін, а таксама не паважаюць іх культурнае аблічча»[57]. Падобным чынам біскупы Азіі падкрэслілі «знешнія ўплывы, якія аказваюцца на азіяцкія культуры. З’яўляюцца новыя формы захавання паводзін, як вынік празмернага ўплыву мас-медыяў. <...> У выніку чаго негатыўныя аспекты мас-медыяў і індустрыі забаў пагражаюць традыцыйным каштоўнасцям»[58].

63. Каталіцкая вера многіх народаў сустракаецца сёння з выклікам распаўсюджвання новых рэлігійных рухаў, некаторыя з якіх маюць тэндэнцыю да фундаменталізму, а іншыя прапануюць духоўнасць без Бога. З аднаго боку, гэта вынік чалавечай рэакцыі на матэрыялістычнае, спажывецкае і індывідуалістычнае грамадства, а з другога — выкарыстанне ў сваіх інта-рэсах галечы насельніцтва, якое жыве на перыферыі і ў бедных раёнах і стараецца выжыць сярод вялікага чалавечага цярпення, а таксама шукае неадкладнага вырашэння сваіх праблем. Гэтыя рэлігійныя рухі, якія адзначаюцца далікатнасцю пранікнення, сярод пануючага індывідуалізму запаўняюць пустку, пакінутую секулярызаваным рацыяналізмам. З другога боку, мы павінны прызнаць, што калі частка нашых ахрышчаных людзей не адчувае сваёй прыналежнасці да Касцёла, то гэта звязана таксама з пэўнымі структурамі і непрыязным кліматам у некаторых нашых парафіях і супольнасцях, або з бюракратычным стаўленнем да звычайных ці складаных праблем жыцця нашых народаў. У многіх месцах існуе перавага адміністратыўнага аспекту над пастырскім, а таксама сакрамэнталізацыя без іншых формаў евангелізацыі.

64. Працэс секулярызацыі зводзіць веру і Касцёл да прыватнай і асабістай сферы. Больш за тое, адмаўляючы ўсялякую трансцэндэнтнасць, ён выклікаў узрастаючую этычную дэфармацыю, аслабленне пачуцця асабістага і грамадскага граху, а таксама паступовае

ўзрастанне рэлятывізму, што прыводзіць да агульнай дэзарыентацыі, асабліва ў падлеткавым і юнацкім узросце, калі змены ўспрымаюцца вельмі балюча. Як слушна заўважаюць біскупы Злучаных Штатаў Амерыкі, у той час, як Касцёл падкрэслівае існаванне аб’ектыўных маральных норм, якія абавязваюць усіх, «ёсць тыя, хто прадстаўляе гэтае вучэнне як несправядлівае, супярэчнае з асноўнымі правамі чалавека. Такая аргументацыя звычайна звязана з пэўнай формай маральнага рэлятывізму, а таксама ідзе ў пары, непаслядоўна, з верай у абсалютныя правы адзінак. Улічваючы гэта, Касцёл успрымаецца як той, што пашырае асаблівую прадузятасць і ўмешваецца ў асабістую свабоду»[59]. Мы жывём у інфармацыйным грамадстве, якое без разбору падае нам звесткі, быццам бы ўсе яны аднолькава важныя, што ў выніку вядзе нас да велізарнай павярхоўнасці ў момант вырашэння маральных пытанняў. Таму ўзнікае неабходнасць адукацыі, якая навучыць крытычна мысліць і прапануе шлях сталення ў каштоўнасцях.

65. Нягледзячы на ўсю плынь секулярызму, які ахапіў грамадства, у многіх краінах — таксама там, дзе хрысціянства складае меншасць — Каталіцкі Касцёл з’яўляецца надзейнай установай, годнай даверу ў справах салідарнасці і клопату пра найбольш патрабуючых. У розных сітуацыях ён неаднойчы быў пасрэднікам у вырашэнні праблем, якія датычылі спакою, згоды, навакольнага асяроддзя, абароны жыцця, правоў чалавека, грамадзянскіх правоў і г. д. А наколькі вялікім з’яўляецца ўклад каталіцкіх школ і універсітэ-таў ва ўсім свеце! Вельмі добра, што так ёсць. Аднак, неабходна прыкласці вялікія намаганні, каб паказаць, што іншыя пытанні, якія не маюць належнага публічнага прыняцця, нас пабуджае закранаць вернасць тым жа перакананням адносна годнасці чалавечай асобы і агульнага дабра.

66. Сям’я перажывае глыбокі культурны крызіс, падобна як усе супольнасці і грамадскія сувязі. У выпадку сям’і крохкасць сувязяў становіцца асабліва сур’ёзнай, бо гаворка ідзе пра асноўную ячэйку грамадства, дзе мы вучымся суіснаваць з іншымі нягледзячы на разнастайнасць і будаваць адносіны з іншымі і дзе бацькі перадаюць веру дзецям. Існуе тэндэнцыя разглядаць сужэнства выключна як форму эмацыянальнага задавальнення, якую можна ўстанавіць любым спосабам і змяніць у залежнасці ад адчування кожнага. Аднак неад’емны ўклад сужэнства ў грамадскае жыццё перавышае ўзровень пачуццёвасці і патрэбаў пары. Як навучаюць французскія біскупы, яно не нараджаецца «з любоўнага пачуцця, эфемернага па вызначэнні, але з глыбіні абавязацельства, прынятага сужэнцамі, якія згаджаюцца цалкам увайсці ў супольнасць жыцця»[60].

67. Індывідуалізм эпохі постмадэрнізму і глабалізацыі спрыяе стылю жыцця, які перашкаджае ўмацаванню і стабільнасці міжасабовых адносін і дэфармуе сямейныя повязі. Пастырская дзейнасць павінна больш выразна паказаць, што адносіны з нашым Айцом патрабуюць і заахвочваюць да камуніі, якая аздараўляе, спрыяе і ўмацоўвае міжчалавечыя сувязі. У той час, як у свеце, асабліва ў некаторых краінах, выбухаюць у розных формах войны і сутычкі, мы, хрысціяне, падкрэсліваем неабходнасць прызнання іншага чалавека,

залечвання ран, будавання мастоў, умацавання адносін і дапамогі, каб «насіць цяжары адзін аднаго» (пар.  6, 2). З іншага боку, сёння нараджаецца шмат розных таварыстваў дзеля абароны правоў і дасягнення высакародных мэтаў. Такім чынам выяўляецца жаданне многіх грамадзянаў, якія хочуць быць будаўнікамі грамадскага і культурнага развіцця.

68. Хрысціянская тканка некаторых народаў — асаб-лі-ва заходніх — з'яўляецца жывой рэчаіснасцю. Мы знаходзім тут, асабліва сярод найбольш патрабуючых, маральны рэсурс, які ахоўвае каштоўнасці сапраўднага хрысціянскага гуманізму. Гледзячы на рэчаіснасць вачыма веры, немагчыма не ўбачыць таго, што сее Дух Святы. Недаверам да Яго свабоднага і шчодрага дзеяння было б меркаванне, што сапраўдных хрысціянскіх каштоўнасцяў няма ўжо там, дзе значная частка людзей атрымала хрост і розным чынам выяўляе сваю веру і братэрскую салідарнасць. Тут трэба заўважыць штосьці большае за «зерне слова», прызнаючы, што маецца на ўвазе праўдзівая каталіцкая вера, якая мае свае ўласныя спосабы выражэння і прыналежнасці да Касцёла. Нельга ігнараваць вырашальнага значэння культуры, што пазначана верай, бо гэтая евангелізаваная культура, нягледзячы на яе абмежаванні, мае нашмат больш рэсурсаў, чым звычайная сума веруючых, якіх атакуе сённяшні секулярызм. Евангелізаваная нацыянальная культура ўтрымлівае каштоўнасці веры і салідарнасці, якія могуць выклікаць развіццё больш справядлівага і веруючага грамадства, а таксама мае адмысловую мудрасць, якую з удзячнасцю трэба прызнаць.

69. Існуе пільная патрэба ў евангелізацыі культур дзеля інкультурацыі Евангелля. У краінах з хрысціянскай традыцыяй трэба пазнаваць, развіваць і ўмацоўваць ужо існуючае багацце, а ў краінах з іншымі рэлігійнымі традыцыямі ці ў глыбока свецкіх трэба спрыяць новым працэсам евангелізацыі культур, нават калі яны маюць вельмі далёкую перспектыву. Аднак мы не можам ігнараваць таго, што заўсёды маецца на ўвазе заклік да развіцця. Кожная культура і кожная грамадская група патрабуе ачышчэння і сталення. У масавай культуры каталіцкіх народаў мы можам убачыць некаторыя недахопы, якія павінны быць аздароўлены Евангеллем: мужчынскі шавінізм, алкагалізм, насілле ў сям'і, рэдкі ўдзел у Эўхарыстыі, фаталізм і забабон-насць, якія схіляюць звяртацца да чараўніцтва, і г. д. Але менавіта народная пабожнасць з'яўляецца найлепшым зыходным пунктам для іх аздараўлення і вызвалення.

70. Гэта праўда, што часам большы акцэнт ставіцца не на хрысціянскую пабожнасць, а на вонкавыя формы традыцыі некаторых груп ці гіпатэтычныя прыватныя аб'яўленні, якія абсалютызуюцца. Існуе ў нейкім сэнсе хрысціянства рытуалаў, уласцівае пэўнаму індывідуальнаму і сентыментальнаму перажыванню веры, якое на самой справе не адпавядае сапраўднай «народнай пабожнасці». Некаторыя прапагандуюць гэтыя формы, не думаючы пра грамадскую актывізацыю і выхаванне вернікаў, а ў некаторых выпадках робяць гэта для атрымання матэрыяльнай карысці ці пэўнай улады над іншымі. Мы не

можам таксама ігнараваць тое, што ў апошнія дзесяцігоддзі сярод каталіцкага народу адбыўся разрыў у перaказе хрысціянскай веры пакаленням. Нельга аспрэчыць таго, што многія адчуваюць сябе расчараванымі і перастаюць атаясамлівацца з каталіцкай традыцыяй, што павялічваецца колькасць бацькоў, якія не хрысцяць дзяцей і не вучаць іх малітвам, а таксама існуе пэўны адыход вернікаў да іншых супольнасцяў веры. Вось некаторыя прычыны гэтага разрыву: адсутнасць дыялогу ў сям'і, уплыў сродкаў камунікацыі, рэлятывісцкі суб'ектывізм, ашалелае спажывецтва, якое накручвае рынак, адсутнасць пастырскай апекі найбольш убогімі, недахоп гасціннасці ў нашых інстытуцыях і нашая няздольнасць узнавіць містычнае яднанне з верай у шматрэлігійным акружэнні.

71. Новы Ерузалем, Святы Горад ( 21, 2-4) з'яўляецца мэтай, да якой ідзе ўсё чалавецтва. Цікава, што, як кажа нам Аб'яўленне, поўня чалавецтва і гісторыі рэалізуецца ў горадзе. Нам трэба глядзець на горад кантэмпляцыйным позіркам, гэта значыць позіркам веры, што адкрывае Бога, які жыве ў яго дамах, на яго вуліцах і плошчах. Яго прысутнасць спадарожнічае шчыраму пошуку, які распачынаюць асобы і групы, каб знайсці падтрымку і сэнс свайго жыцця. Ён жыве сярод грамадзян, пашыраючы салідарнасць, братэрства, жаданне дабра, праўды і справядлівасці. Гэтай прысутнасці не трэба ствараць, але адкрываць, выяўляць. Бог не хаваецца ад тых, хто Яго шукае шчырым сэрцам, хоць яны робяць гэта навобмацак, невыразна і разгублена.

72. У горадзе рэлігійны аспект выяўляецца ў розных стылях жыцця, у звычаях, звязаных з пачуццём часу, тэрыторыі і адносін, і адрозніваецца ад стылю вясковых жыхароў. У штодзённым жыцці гараджане вельмі часта змагаюцца за выжыванне, і ў гэтай барацьбе схавана глыбокае экзістэнцыяльнае пачуццё, звычайна звязанае з глыбокім рэлігійным пачуццём. Мы павінны прыглядацца да яго, каб распачаць такі ж- дыялог, які меў Пан з самаранкай каля студні, з якой яна хацела наталіць прагу (пар.  4, 7-26).

73. Надалей паўстаюць новыя культуры на абсягах чалавечай геаграфіі, дзе хрысціяне, як правіла, ужо не з'яўляюцца крыніцамі ці аўтарамі меркаванняў, але самі пераймаюць ад іх іншыя мовы, сімвалы, пасланні і парадыгмы, якія прапануюць ім новае стаўленне да жыцця, часта спрэчнае з Евангеллем Езуса. Невядомая дагэтуль культура пульсуе і пашыраецца ў гарадах. Сінод адзначыў, што сённяшнія змены, якія адбываюцца на гэтых вялікіх абсягах, і культура, якую яны ствараюць, з'яўляюцца важным месцам для новай евангелізацыі[61]. Гэта змушае нас шукаць новыя формы малітвы і зносін, якія былі б больш прыцягальнымі і зразумелымі для жыхароў горада. Праз пасрэдніцтва сродкаў масавай камунікацыі культурныя змены так-сама закранулі вясковыя раёны і пакінулі значныя змены ў іх спосабе жыцця.

74. Неабходна, каб евангелізацыя праліла святло на новыя спосабы адносін з Богам, з

іншымі і з навакольным светам і адрадзіла фундаментальныя каштоўнас-ці. Трэба ісці туды, дзе фарміруюцца новыя гісторыі і парадыгмы, каб Божае слова магло дасягнуць самых глыбокіх куткоў горада. Нельга забываць, што горад — гэта шматкультурны асяродак. У буйных гарадах можна заўважыць абсягі, дзе людзі маюць аднолькавыя ўяўленні пра жыццё і падобныя мары, ствараючы новыя групы, культурныя тэрыторыі, нябачныя гарады. Розныя субкультуры існуюць разам і практыкуюць селекцыю і гвалт. Касцёл пакліканы да цяжкога дыялогу. З аднаго боку грамадзяне атрымліваюць адпаведныя сродкі для развіцця асабістага і сямейнага жыцця, але ёсць таксама шмат «неграмадзянаў», «грамадзянаў напалову» ці «гарадской рэшты». Горад стварае пэўную пастаянную двузначнасць, бо калі прапануе сваім грамадзянам бясконцыя магчымасці, паўста-юць таксама шматлікія перашкоды на шляху поўнага жыццёвага развіцця многіх іншых. Гэтая супярэчнасць нараджае балючае цярпенне. У розных частках свету гарады становяцца сцэнай масавых пратэстаў, дзе тысячы грамадзянаў патрабуюць свабоды, права мець голас у жыцці, справядлівасці і ставяць шэраг іншых патрабаванняў, якіх — калі яны не будуць адпаведна зразуметыя — немагчыма будзе падавіць сілай.

75. Мы не можам ігнараваць таго, што ў гарадах без перашкод квітнее гандаль наркотыкамі і людзьмі, злоўжыванне і эксплуатацыя непаўналетніх, забыццё пра пажылых і нямоглых, розныя формы карупцыі і злачынстваў. У той жа час тое, што магло б быць каштоўнай прасторай для сустрэчы і салідарнасці, часта ператвараецца ў месца ізаляцыі і ўзаемнага недаверу. Дамы і раёны будуюцца больш для ізаляцыі і абароны, чым для таго, каб лучыць і інтэграваць. Абвяшчэнне Евангелля будзе падставай для вяртання годнасці жыццю чалавека ў гэтым кантэксце, бо Езус хоча даць у гарадах жыццё ў поўні (пар.  10, 10). Прапанаваны Евангеллем адназначны і поўны сэнс чалавечага жыцця з’яўляецца найлепшым сродкам ад хваробаў горада, хоць мы і павінны ўлічваць, што аднародная, нягнуткая праграма і стыль евангелізацыі не прыдатныя для гэтай рэчаіснасці. Аднак глыбокае перажыванне таго, што чалавечае, і поўны адказ на выклікі як пачатак сведчання ў любой культуры, у любым горадзе робіць хрысціяніна лепшым і ўзбагачае горад.

II. Спакусы працаўнікоў пастырства

76. Я празмерна ўдзячны ўсім, хто працуе ў Касцёле. Не хацеў бы цяпер спыняцца на пераліку дзейнасці розных працаўнікоў пастырства, пачынаючы ад біскупаў аж да найбольш сціплых і непрыкметных касцёльных працаўнікоў. Хацеў бы больш затрымацца над выклікамі, якія ўсе яны павінны перамагаць у кантэксце культурнай глабалізацыі. Аднак дзеля справядлівасці павінен перадусім сказаць, што ўклад Касцёла ў жыццё сучаснага свету велізарны. З болем і сорамам мы думаем пра грахі некаторых членаў Касцёла і пра нашыя ўласныя грахі, але гэта не павінна стаць прычынай, каб забыць, колькі хрысціянаў аддае сваё жыццё з любові: столькім людзям дапамагаюць вылечыцца ці памерці ў спакоі ў імправізаваных шпіталях; падтрымліваюць зняволеных рознымі залежнасцямі ў найбольш убогіх кутках зямлі; прысвячаюць усе сілы выхаванню дзяцей і моладзі; клапоцяцца пра

пажылых людзей, пакінутых усімі; імкнуцца пераказаць каштоўнасці ў непрыязных асяроддзях; рознымі іншымі спосабамі самааддана сведчаць бязмерную любоў да людзей, на якую натхніў нас Бог, які стаўся чалавекам. Дзякую за прыгожы прыклад, які далі мне столькі хрысціянаў, ахвяруючы з радасцю сваё жыццё і час. Гэтае сведчанне суцяшае мяне і падтрымлівае ўва мне асабістае імкненне пераадольваць мой эгаізм дзеля яшчэ большай самаадданасці.

77. Тым не менш, як дзеці гэтай эпохі, усе застаёмся ў нейкай ступені пад уплывам сённяшняй глабалізаванай культуры, якая хоць і паказвае нам каштоўнасці і новыя магчымасці, можа нас таксама абмяжоўваць, абумоўліваць нашае жыццё, а нават шкодзіць нам. Згаджаюся, што мы павінны стварыць адпаведную прастору для матывацыі і аздараўлення ўдзельнікаў пастырства, «месца для адновы ўласнай веры ва ўкрыжаванага і ўваскрослага Езуса, для таго, каб задаць найглыбейшыя пытанні і падзяліцца штодзённымі клопатамі, каб паводле евангельскіх крытэрыяў глыбока прааналізаваць сваё жыццё і вопыт, каб накіраваць да дабра і прыгажосці свой выбар, асабісты і грамадскі»[62]. Таксама хачу звярнуць увагу на некаторыя спакусы, якія сёння асабліва пагражаюць удзельнікам пастырскай дзейнасці.

«»

78. Сёння можна заўважыць у многіх удзельнікаў пастырскай дзейнасці, таксама і ў кансэкраваных асобаў, празмерны клопат пра асабістую прастору аўтаноміі і адпачынку, што прыводзіць да перажывання ўласных заданняў як дадатку да жыцця, як бы яны не былі часткай уласнай тоеснасці. У той жа час, духоўнае жыццё блытаецца з некаторымі рэлігійнымі практыкамі, якія прыносяць суцяшэнне, але не вядуць да сустрэчы з іншымі, да дзейнасці ў свеце, да евангелізацыйнага запалу. Так, у многіх удзельнікаў евангелізацыі, калі нават яны і моляцца, можна заўважыць празмерны індывідуалізм, нейкі крызіс тоеснасці і змяншэнне руплівасці. Гэта патройнае зло, якое ўзаемна абумоўліваецца.

79. Медыйная культура і некаторыя інтэлектуальныя асяродкі выказваюць часам выразны недавер да паслання Касцёла і пэўнае расчараванне. У выніку многія ўдзельнікі пастырскай дзейнасці, хоць і моляцца, заражаюцца ў пэўным сэнсе комплексам непаўнавартаснасці, які вядзе іх да рэлятывізму ці ўкрывання сваёй хрысціянскай тоеснасці і перакананняў. Тады ствараецца заганнае кола, бо яны не задаволены тым, кім з’яўляюцца і што робяць, не атаясамліваюць сябе са сваёй евангелізацыйнай місіяй, і гэта аслабляе іх самааддачу. Заканчваюць яны тым, што падаўляюць у сабе місійную радасць дакучлівай ідэяй, каб быць, як усе, і мець тое, што маюць іншыя. Евангелізацыйнай дзейнасцю яны займаюцца пад прымусам і аддаюць ёй мала сілаў і часу.

80. Нягледзячы на духоўны стыль жыцця працаўнікоў пастырства і спосаб мыслення ў іх развіваецца рэлятывізм, яшчэ больш небяспечны за дактрынальны. Ён уплывае на

найглыбейшыя і важныя рашэнні, якія вызначаюць спосаб жыцця. Такі практычны рэлятывізм заключаецца ў тым, што чалавек пачынае паступаць так, як бы Бог не існаваў, думае так, як бы не было ўбогіх, ставіць перад сабой такія мэты, як бы іншыя не існавалі, працуе так, як бы не існавалі тыя, хто яшчэ не прыняў дабравесця. Варта заўважыць, што нават людзі з моцнымі дактрынальнымі і духоўнымі перакананнямі часта згаджаюцца на такі стыль жыцця, які змушае хапацца за матэрыяльны дабрабыт ці любым коштам дабівацца ўлады і людской пахвалы, замест таго, каб аддаць жыццё за іншых на місіі. Не дазволім пазбавіць нас місійнага энтузіязму!

«»

81. У той час, калі нам так патрэбны місійны дынамізм, які нясе свету соль і святло, многія свецкія баяцца, што хтосьці запросіць іх прыняць на сябе апостальскае заданне, таму стараюцца пазбягаць любой працы, якая магла б забраць у іх вольны час. Сёння, напрыклад, вельмі цяжка знайсці падрыхтаваных парафіяльных катэхетаў, гатовых выконваць гэтае заданне цягам гадоў. Але штосьці падобнае адбываецца таксама са святарамі, якія празмерна клапоцяцца пра свой вольны час. Часта звязана гэта з уладным пачуццём неабходнасці абараняць прастору сваёй асабістай аўтаноміі, быццам бы заданне евангелізацыі з’яўляецца небяспечнай атрутай, а не радасным адказам на Божую любоў, якая заклікае нас да місіі, напаўняе нас жыццём і дапамагае нам прыносіць плён. Некаторыя не жадаюць спазнаць асалоду ад місіі, таму ахоплівае іх паралізуючая нуда.

82. Не заўсёды праблемай з’яўляецца празмерная актыўнасць, але перадусім дрэнна зразуметая дзей-насць, без адпаведнай матывацыі, без духоўнасці, якая б напаўняла яе і рабіла жаданай. У выніку праца стамляе звыш разумнай меры, а часам вядзе да хваробы. Гэта ўжо не радасная стома, але напружаная, балючая, якая не дае задавальнення, а таму нязносная. Такая пастырская нуда можа мець розныя прычыны. Некаторыя трапляюць у яе, бо бяруцца за нерэальныя праекты і не хочуць рабіць таго, што ў іх добра атрымліваецца. Іншыя таму, што не прымаюць цяжкой эвалюцыі працэсаў і хочуць, каб усё ўпала з неба. Яшчэ іншыя хапаюцца адразу за некалькі праектаў ці аддаюцца фанабэрыстым марам пра ўяўны поспех. Іншыя губляюць рэальны кантакт з людзьмі, займаючыся безасабовым пастырствам, якое звяртае больш увагі на арганізацыйныя моманты, а не на людзей, таму з большым энтузіязмам яны займаюцца «планам дарогі» чым самой дарогай. Яшчэ іншыя нудзяцца, бо не ўмеюць чакаць і хочуць панаваць над рытмам жыцця. Сёння ліхаманкавае жаданне адразу атрымаць вынікі прыводзіць да таго, што працаўнікам пастырства цяжка зносіць нейкія перашкоды, бачныя паражэнні, крытыку, крыж.

83. Такую форму набывае найбольшая небяспека, якой «з’яўляецца шэры прагматызм штодзённага жыцця Касцёла, у якім быццам бы ўсё нармальна, у той час як на самой справе вера слабее і зводзіцца да пасрэднасці»[63]. Такім чынам развіваецца магільная псіхалогія, якая паступова ператварае хрысціянаў у музейных мумій. Расчараваныя рэчаіснасцю,

Касцёлам і сабою, адчуваюць няспынную спакусу прызвычаенасці да салодкага суму, без надзеі, які авалодвае сэрцам як «самы каштоўны эліксір злога духа»[64]. Пакліканыя да асвятлення і перадачы жыцця, урэшце захапляюцца рэчамі, якія нараджаюць толькі цемру і стомленасць і аслабляюць апостальскі дынамізм. З прычыны ўсяго гэтага я хацеў бы падкрэсліць: не дазволім пазбавіць нас радасці евангелізацыі!

«»

84. Радасць Евангелля — гэта тое, чаго нішто і ніхто ў нас не зможа забраць (пар.  16, 22). Хваробы сучаснага свету і Касцёла не павінны быць апраўданнем для змяншэння нашага ўдзелу і нашай руплівасці. Мы лічым іх магчымасцю для ўзрастання. Больш за тое, калі будзем глядзець з вераю, здолеем распазнаць святло, якім Дух Святы заўсёды асвятляе змрок, памятаючы, што «дзе памножыўся грэх, там яшчэ больш памножылася ласка» ( 5, 20). Наша вера паклікана да таго, каб заўважыць віно, у якое можа быць перамененая вада, і ўбачыць зерне, якое расце сярод пустазелля. Праз пяцьдзесят гадоў пасля Другога Ватыканскага Сабору, нават калі мы адчуваем боль з прычыны пакут нашай эпохі і далёкі нам наіўны аптымізм, большы рэалізм не павінен азначаць меншага даверу да Духа і меншай шчодрасці. У гэтым сэнсе мы можам вярнуцца да слоў бл. Яна XXIII з памятнага дня 11 кастрычніка 1962 году: «Не без крыўды для нашых вушэй даходзяць да нас некаторыя галасы тых, хто хоць і палае рэлігійнай руплівасцю, аднак без належнай аб’ектыўнасці і разважлівасці ацэньвае факты. У сучасных умовах чалавечага грамадства яны не здольныя бачыць чагосьці іншага, акрамя разбурэння і клопатаў. <…> Нам здаецца, што мы павінны рашуча аддзяліцца ад гэтых прарокаў няшчасцяў, якія абвяшчаюць найгоршае, быццам бы ўжо блізкі канец свету. У дадзены гістарычны момант, калі чалавецтва, здаецца, уваходзіць у новы парадак рэчаў, трэба больш заўважаць таямнічыя планы Божага Провіду, якія па чарзе выяўляюцца праз дзейнасць людзей, а часта нават па-за іх чаканнямі, мудра кіруючы ўсім, нават чалавечымі няўдачамі, вядуць да дабра Касцёла»[65].

85. Адна з самых сур’ёзных спакус, якая гасіць запал і мужнасць, — гэта пачуццё няўдачы, якое ператварае нас у незадаволеных і расчараваных песімістаў з панурым тварам. Ніхто не можа распачаць барацьбы, калі не верыць у перамогу. Хто пачынае без надзеі, ужо напалову прайграў бітву і закопвае свае таленты. Нават з балючым усведамленнем сваёй крохкасці трэба ісці наперад і не здавацца, а таксама прыгадваць сабе, што сказаў Пан св. Паўлу: «Хопіць табе Маёй ласкі, бо моц удасканальваецца ў слабасці» (*2*  12, 9). Хрысціянскі трыумф — гэта заўсёды крыж, але крыж, які адначасова з’яўляецца штандарам перамогі, што ўзносіцца з пачуццём мужнасці перад нападам зла. Злы дух няўдачы — брат спакусы заўчаснага аддзялення зерня ад пустазелля, прадукт баязлівага і эгацэнтрычнага засмучэння.

86. Відавочна, што ў некаторых рэгіёнах дайшло да духоўнага «спусташэння», якое з’яўляецца вынікам спробы грамадстваў будаваць без Бога ці знішчаць свае хрысціянскія

карані. Тут «хрысціянскі свет становіцца бясплодным і пусцее як выкарыстаная зямля, што ператвараецца ў пясок»[66]. У гэтых краінах раптоўны супраціў хрысціянству абавязвае хрысціянаў перажываць сваю веру ва ўкрыцці на зямлі, якую яны любяць. Гэта іншая форма пустыні, вельмі балючая. Таксама ўласная сям’я ці ўласнае месца працы могуць стаць такім бясплодным асяродкам, дзе трэба захаваць веру і імкнуцца яе выпраменьваць. Але «менавіта зыхо-дзячы з вопыту гэтай пустыні, гэтай спустошанасці, мы можам нанова адкрыць радасць веры, яе жыццё-вае значэнне для нас, мужчын і жанчын. На пустыні адкрываецца каштоўнасць таго, што неабходна для жыцця; і так у сучасным свеце існуюць незлічоныя знакі прагнення Бога, канчатковага сэнсу жыцця, што часта выяўляецца ва ўкрытай ці негатыўнай форме. На пустыні неабходны перш за ўсё людзі веры, якія сваім уласным жыццём указваюць дарогу да Абяцанай зямлі і такім чынам паказваюць надзею»[67]. У любым выпадку, у гэтых акалічнасцях мы пакліканы быць асобамі-амфарамі, каб даць напіцца іншым. Часам амфара ператвараецца ў цяжкі крыж, але менавіта на крыжы Пан быў прабіты і даў нам сябе як крыніцу жывой вады. Не дазволім пазбавіць нас надзеі!

«» ,

87. Сёння, калі сетка і сродкі камунікацыі паміж людзьмі дасягнулі небывалага развіцця, мы сутыкаемся з цяжкасцямі ў адкрыцці і перадачы «містыкі» сумеснага жыцця, калі збіраемся разам, сустракаемся, бяромся за рукі і падтрымліваем адно аднаго, калі знаходзімся ў тым крыху хаатычным моры, якое можа ператварыцца ў сапраўднае братэрства, у сумеснае вандраванне і святое пілігрымаванне. Такім чынам большыя магчымасці для камунікацыі ператвараюцца ў большыя магчымасці для сустрэчы і салідарнасці паміж усімі. Калі б мы змаглі пайсці гэтым шляхам, то гэта прынесла б нам столькі дабра, столькі аздараўлення, столькі свабоды і столькі надзеі! Выйсці па-за межы свайго «я», каб далучыцца да іншых, — гэта для нас дабро. Замкнуцца ў сабе — значыць пакаштаваць горкую атруту самоты, а з кожным нашым эгаістычным выбарам чалавецтва губляе.

88. Хрысціянскі ідэал заўсёды будзе заахвочваць да пераадолення падазронасці, пастаяннага недаверу, страху перад нападам з боку іншых, абарончых пастаў, якія дыктуе нам сённяшні свет. Многія стараюцца ўцячы ад іншых у сваю ўтульную адасобленасць ці ў вузкае кола самых блізкіх і адмаўляюцца ад рэалізму грамадскага вымярэння Евангелля. Як некаторыя хацелі б бачыць толькі духоўнага Хрыста, без цела і крыжа, так іншыя аддаюць перавагу таму, каб міжасабовыя адносіны будаваліся пры дапамозе складаных апаратаў, манітораў і сістэм, якія можна пры жаданні ўключыць або выключыць. У той жа час Евангелле заўсёды заахвочвае нас узяць на сябе рызыку сустрэчы тварам у твар з іншымі, з іх фізічнай прысутнасцю, якая ставіць перад намі выклік, з іх болем і просьбамі, з іх радасцю, якая заразіць і нас пры пастаянным цесным кантакце. Сапраўдная вера ў Божага Сына, які прыняў цела, неад’емная ад самаахвярнасці, ад прыналежнасці да супольнасці, ад служэння, ад прымірэння з целам іншага. Божы Сын праз сваё ўцелаўленне заахвоціў нас да рэвалюцыі пяшчоты.

89. Самаізаляцыя як адна з формаў іманентызму можа выяўляцца ў фальшывай аўтаноміі, якая выключае Бога, але можа, аднак, знайсці ў рэлігійнасці пэўную форму духоўнага спажытку для свайго хваравітага індывідуалізму. Вяртанне да святога і духоўныя пошукі, характэрныя для нашай эпохі, з'яўляюцца двухзначнымі з'явамі. Сёння нас больш павінен турбаваць не столькі атэізм, колькі тое, каб адэкватна адказаць многім людзям, якія прагнуць Бога, каб яны не стараліся наталіць гэтую прагу адчужальнымі ад акружаючых прапановамі або Езусам без цела ці без абавязацельстваў перад іншымі. Калі яны не знойдуць у Касцёле духоўнасці, якая іх аздаравіць, вызваліць, напоўніць жыццём і спакоем і якая адначасова пакліча іх да салідарнай камуніі і місійнай пладнасці, яны будуць у рэшце рэшт ашуканыя прапановамі, якія не гуманізуюць і не прыносяць хвалы Богу.

90. Арыгінальныя формы народнай рэлігійнасці маюць рысы ўцелаўлення, бо нарадзіліся з уцелаўлення хрысціянскай веры ў народнай культуры. Таму яны маюць на ўвазе асабістыя адносіны не з энергіямі гармоніі, але з Богам, з Езусам Хрыстом, з Марыяй, са святымі. Маюць цела, маюць аблічча. Яны здольныя ўмацоўваць патэнцыяльныя адносіны, а не індывідуалісцкія ўцёкі. У іншых колах нашых грамадстваў узрастае папулярнасць розных формаў «духоўнасці дабрабыту» без грамадства, папулярнасць «тэалогіі поспеху» без братэрскіх абавязацельстваў, безасабовых суб'ектыўных перажыванняў, якія зводзяцца да ўнутранага іманентысцкага пошуку.

91. Адна з важных задач — паказаць, што рашэнне ніколі не будзе знойдзена, калі мы будзем уцякаць ад асабістых і сур'ёзных адносін з Богам, якія адначасова абавязваюць нас служыць іншым. Сёння так здараецца, што вернікі імкнуцца схавацца або трымацца асобна ад іншых, далікатна ўцякаюць з аднаго месца на другое або ад аднаго абавязку да другога, не ствараючы глыбокай і сталай сувязі: «*Imaginatio locorum et mutatio multos fefellit*»[68]. Гэта фальшывы сродак, які калечыць сэрца, а часам і цела. Нам трэба дапамагчы іншым зразумець, што адзіным спосабам, каб сустрэцца з іншымі, з'яўляецца правільнае стаўленне, якое дазваляе прыняць і шанаваць іх як спадарожнікаў, без унутранага супраціву. А яшчэ лепшым будзе навучыцца адкрываць Езуса ў іншых, у іх голасе, у іх просьбах. А таксама навучыцца цярпець, абдымаючы ўкрыжаванага Езуса, кожны раз, калі сустракаемся з несправядлівай агрэсіяй ці няўдзячнасцю, ніколі не стамляючыся выбіраць братэрства[69].

92. У гэтым заключаецца сапраўднае аздараўленне, бо спосабам нашых адносін да іншых, які нас са-праўды аздараўляе, а не выклікае хваробы, з'яўляецца , сузіральнае братэрства, якое ўмее глядзець на святую веліч бліжняга, умее адкрыць Бога ў кожным чалавеку, умее разам зносіць жыццёвыя нягоды, трымаючыся Божай любові, якое ўмее адкрыць сэрца на Божую любоў, каб шукаць шчасця іншых так, як шукае яго іхні добры Айцец. Вось і цяпер, асабліва там, дзе яны ўтвараюць «малы статак» ( 12, 32), вучні Пана пакліканы да жыцця як супольнасць, якая з'яўляецца соллю зямлі і святлом свету (пар.  5, 13-16). Яны пакліканы даваць сведчанне аб сваёй прыхільнасці да евангелізацыі заўсёды па-новаму[70]. Не

дазволім пазбавіць нас супольнасці!

«»

93. Свецкая духоўнасць, якая хаваецца пад выглядам пабожнасці, а нават любові да Касцёла, заключаецца ў пошуку людской пахвалы і асабістай выгады замест хвалы Пана. За гэта Езус дакараў фарысеяў: «Як можаце верыць, калі прымаеце славу адзін ад аднаго, а славы, якая паходзіць ад адзінага Бога, не шукаеце?» ( 5, 44). Маецца на ўвазе вытанчаны спосаб шукання «свайго, а не таго, што Езуса Хрыста» ( 2, 21). Гэтая духоўнасць мае шмат формаў, у залежнасці ад тыпу асобы і ўмоў, у якіх яна знаходзіцца. Паколькі намагаецца захаваць выгляд, не заўсёды спадарожнічаюць ёй публічныя грахі, і знешне ўсё здаецца правільным. Калі б, аднак, пранікла ў Касцёл, «было б гэта значна больш катастрафічным за ўсю звычайную свецкую маральнасць»[71].

94. Гэтая свецкасць можа ўмацоўвацца двума ўзаемазвязанымі спосабамі. Першы з іх — гэта захапленне гнастыцызмам, верай, замкнёнай у суб’ектывізме, дзе цікавіць толькі нейкі досвед ці шэраг развагі ведаў, якія, як лічыцца, прыносяць мужнасць і асвятленне, але дзе суб’ект застаецца цалкам замкнёным у іманэнцыі свайго ўласнага розуму ці сваіх пачуццяў. Другі — эгацэнтрычны і праметэеў неапелагіянізм тых, якія разлічваюць толькі на ўласныя сілы і ставяць сябе вышэй за іншых, бо захоўваюць пэўныя нормы ці таму, што захоўваюць непарушную вернасць пэўнаму каталіцкаму стылю з мінулага. Гэтая ўяўная дактрынальная ці дысцыплінарная небяспека адкрывае магчымасці для самаўлюбёнай і аўтарытарнай элітарнасці, дзе евангелізацыю замяняе аналізаванне і крытыка іншых. І замест таго, каб аблегчыць доступ да ласкі, энергія траціцца на кантроль. У абодвух выпадках сапраўды не цікавіць ні Езус Хрыстус, ні іншыя. Гэта праявы антрапацэнтрычнага іманэнтызму. Немагчыма сабе ўявіць, каб з гэтых скалечаных формаў хрысціянства змог нарадзіцца сапраўдны евангелізацыйны дынамізм.

95. Гэтая незразумелая свецкасць выяўляецца ў розных відавочна супярэчлівых паставах, але з аднолькавым намерам «дамінаваць у прасторы Касцёла». У некаторых заўважаецца паказны клопат пра літургію,- дактрыну і прэстыж Касцёла, але яны не дбаюць аб сапраўдным увядзенні Евангелля ў жыццё Божага народу і ў канкрэтную гісторыю. Такім чынам жыццё Касцёла ператвараецца ў музейны экспанат ці становіцца ўласнасцю нямногіх. У іншых тая самая свецкая духоўнасць крыецца ў захапленні сацыяльнымі ці палітычнымі выгодамі, у фанабэрыстай здольнасці кіраваць практычнымі справамі або ў захапленні праграмамі самадапамогі і самарэалізацыі. Яна можа таксама выяўляцца ў розных спосабах успрыняцця самога сябе як удзельніка насычанага грамадскага жыцця, поўнага падарожжаў, сходаў, вячэраў, прыёмаў. Можа таксама набываць форму кіраўнічага функцыяналізму, поўнага статыстык планавання і падсумоўвання, дзе галоўны бэнэфіцыярый — не Божы народ, але хутчэй Касцёл як арганізацыя. У кожным выпадку яна пазбаўлена пячаці ўцелаўлёнага, укрыжаванага і ўваскрослага Хрыста, яна замыкаецца ў

групах, не выходзіць рэальна шукаць тых, хто знаходзіцца здалёк, а таксама вялізнай колькасці тых, хто прагне Хрыста. Евангельскі запал змяняецца фальшывай асалодай эгаістычнага самазадавальнення.

96. У гэтым кантэксце ўмацоўваецца пустая хвала тых, хто задавольваецца атрыманай уладай і больш хоча быць генералам пераможаных войскаў, чым звычайным жаўнерам атрада, што працягвае змагацца. Колькі ж разоў мы марым аб экспансіі апостальскіх планаў, падрабязных і добра распрацаваных, тыповых для пераможаных генералаў! Гэтым перакрэсліваем гісторыю Касцёла, якая славіцца як гісторыя ахвяраў, надзеі, штодзённай барацьбы, жыцця ў служэнні, вытрываласці ў напружанай працы, бо кожная праца — гэта «пот нашага чала». Замест гэтага мы губляем час на размовы пра тое, «што трэба рабіць» — па-іспанску мы называем гэта грахом «habriaquei 2smo» — як духоўныя настаўнікі і эксперты пастырства, якія даюць інструкцыю, застаючыся звонку. Мы бясконца фантазіруем і губляем кантакт з цяжкой рэчаіснасцю нашага вернага люду.

97. Хто паддаўся гэтай свецкасці, глядзіць звысоку і здалёк, адкідвае прароцтва сваіх братоў, дыскваліфікуе таго, хто задае яму пытанні, няспынна падкрэслівае памылкі іншых і пераймаецца знешнімі формамі. Ён скіраваў сваё сэрца да абмежаванага далягляду сваёй іманэнцыі і сваіх інтарэсаў і таму не вучыцца на сваіх грахах, не адкрываецца шчыра на прабачэнне. Гэта жахлівая карупцыя пад выглядам дабра. Трэба пазбягаць яе, накіроўваючы Касцёл на шлях выйсця па-за сваё «я», на шлях місіі, сканцэнтраванай на Езусе Хрысце і на дапамозе бедным. Няхай Бог нас выбавіць ад свецкага Касцёла пад духоўным і пастырскім прыкрыццём! Гэтую задушлівую свецкасць можна лячыць, удыхаючы чыстае паветра Духа Святога, які вызваляе нас ад засяроджанасці на сабе, калі мы хаваемся за фасадам рэлігійнасці без Бога. Не дазволім пазбавіць нас Евангелля!

«»

98. Колькі ж ёсць войнаў сярод Божага народу і ў розных супольнасцях! У квартале, на месцы працы, колькі ж войнаў з прычыны зайздрасці і рэўнасці, таксама паміж хрысціянамі! Свецкая духоўнасць вядзе некаторых хрысціянаў на вайну з іншымі хрысціянамі, якія стаяць на іх шляху шукання ўлады, прэстыжу, прыемнасці ці матэрыяльнага забеспячэння. Больш за тое, некаторыя перастаюць жыць сардэчнай прыналежнасцю да Касцёла, паглыбляючы дух нязгоды. Замест таго, каб прыналежыць да ўсяго Касцёла з яго багатай разнастайнасцю, яны належаць да той ці іншай групы, якая лічыць сябе асобнай ці адмысловай.

99. Свет раздзіраюць войны і насілле, ён зранены распаўсюджаным індывідуалізмам, які падзяляе людзей і ставіць адных супраць другіх на шляху дасягнення ўласнага дабрабыту. У розных краінах выбухаюць канфлікты і зноў узнікаюць старыя падзелы, якія здаваліся ўжо часткова пераадоленымі. Асабліва хачу папрасіць хрысціянаў з усіх супольнасцяў усяго

свету даваць сведчанне братэрскай еднасці, якое будзе прыцягваць і асвятляць. Няхай усе захапляюцца тым, як вы клапоціцеся адно пра аднаго, як узаемна пад-трымліваеце і як апякуецеся адно адным: «Па гэтым усе пазнаюць, што вы Мае вучні, калі будзеце мець любоў адзін да аднаго» ( 13, 35). Менавіта аб гэтым прасіў Езус Айца ў гарачай малітве: «каб усе былі адно <...> ў Нас, каб паверыў свет...» ( 17, 21). Звярніце ўвагу на спакусу зайздрасці! Мы ў адным чоўне і плывем да аднаго порту! Просім аб ласцы радавацца дасягненням іншых, бо яны належаць усім.

100. Таму, хто зранены даўнімі падзеламі, цяжка прыняць нашае заахвочванне да прабачэння і паяднання, бо яны лічаць, што мы ігнаруем іх боль ці хочам, каб яны адмовіліся ад сваёй памяці і ідэалаў. Аднак, калі бачаць прыклад сапраўды братэрскай і паяднанай супольнасці, то гэтае яркае сведчанне іх заўсёды прыцягвае. Таму мне балюча глядзець, як у некаторых хрысціянскіх супольнасцях, а нават паміж кансэкраванымі асобамі, існуюць розныя формы нянавісці, падзелаў, паклёпаў, знеслаўлення, помсты, зайздрасці, жадання навязаць любым коштам свае ідэі, аж да пераследу, які здаецца бязлітасным паляваннем на чараўніц. Каго мы хочам евангелізаваць такімі паводзінамі?

101. Мы просім Пана, каб Ён дапамог нам зразумець закон любові. Як жа добра мець гэты закон! Колькі ж дабра мы маем, калі любім адно аднаго, нягледзячы ні на што! Так, ні на што! Да кожнага з нас скіраваны заклік св. Паўла: «Не будзь пераможаны злом, але перамагай зло дабром» ( 12, 21). І яшчэ: «Не спыняймася рабіць дабро» ( 6, 9). Мы ўсе маем сімпатыі і антыпатыі, і можа быць у дадзены момант мы моцна гневаемся на кагосьці. Спачатку скажам Пану: «Пане, я вельмі гневаюся на яго, на яе. Прашу Цябе за яго і за яе». Малітва за асобу, якая нас нервуе, з'яўляецца прыгожым крокам да любові і ёсць чынам евангелізацыі. Учынім гэта сёння! Не дазволім пазбавіць нас ідэалу братэрскай любові!

102. Свецкія складаюць большасць Божага народу. У служэнні ім застаецца меншасць: пасвячаныя распарадчыкі. Разуменне тоеснасці і місіі свецкай асобы ў Касцёле ўзрасло. Мы маем вялікую колькасць свецкіх, хоць і недастатковую, з моцным пачуццём супольнасці, якія з вялікай вернасцю ўдзельнічаюць у любові, катэхезе, цэлебрацыі веры. Але разуменне гэтай адказнасці свецкіх, якая вынікае з хросту і канфірмацыі, не выяўляецца аднолькава ва ўсім. У некаторых выпадках таму, што яны не былі выхаваныя, каб прыняць на сябе вялікую адказнасць, у іншых выпадках таму, што не маюць магчымасці ў сваіх мясцовых Касцёлах выказацца і дзейнічаць з прычыны празмернага клерыкалізму, які ўтрымлівае іх ад прыняцця рашэння. Нават, калі заўважаецца большы ўдзел многіх у свецкіх паслугах, не адлюстроўваецца гэта ў пранікненні хрысціянскіх каштоўнасцяў у грамадскі, палітычны і эканамічны свет. У большасці абмяжоўваецца ўнутрыкасцёльнымі заданнямі без сапраўднага прымянення Евангелля для трансфармацыі грамадства. Фармацыя свецкіх і евангелізацыя прафесійных і інтэлектуальных сфер з'яўляецца важным пастырскім

выклікам.

103. Касцёл прызнае важны ўклад жанчыны ў грамадства, з іх чуласцю, інтуіцыяй і некаторымі асаблівымі здольнасцямі, якія звычайна больш уласцівыя жанчынам, чым мужчынам. Напрыклад, адмысловы клопат жанчын аб іншых, які асабліва выяўляецца, хоць і не толькі, у мацярынстве. З прыемнасцю заўважаю, як шмат жанчын падзяляе пастырскую адказ-насць разам са святарамі, робячы свой уклад у апека-ванне асобаў, сем'яў ці груп, даючы новы досвед для тэа-ла-гіч-ных разважанняў. Аднак трэба яшчэ больш па-шырыць прысутнасць жанчын у Касцёле. Паколькі «жаночы геній неабходны ва ўсіх праяўленнях грамадскага жыцця, таму трэба гарантаваць прысут-насць жанчын у працоўнай сферы»[72] ў розных месцах, дзе прымаюцца важныя рашэнні, як у Касцёле, так і ў грамадскіх структурах.

104. Патрабаванне належных правоў для жанчын, пачынаючы ад станоўчага перакanання, што мужчыны і жанчыны маюць аднолькавую годнасць, ставіць перад Касцёлам важныя пытанні, якія з'яўляюцца для яго выклікам, і нельга іх разглядаць павярхоўна. Пытанне пра святарства, устаноўленае толькі для мужчын, як знак Хрыста-Абранніка, які ахвяруецца ў Эўхарыстыі, закрытае для дыскусіі, аднак яно можа стаць прычынай асаблівага канфлікту, калі сакрамэнтальная ўлада празмерна атаясамліваецца з уладай у цэлым. Нельга забываць, што калі мы кажам пра святарскую ўладу, «мы гаворым тут пра , а не пра  і -»[73]. Службовае святарства — гэта адзін са сродкаў, якімі карыстаецца Езус у служэнні свайму народу, але вялікая годнасць паходзіць ад Хрыста, даступнага для ўсіх. Прыпадабненне святара да Хрыста Галавы — як галоўнай крыніцы ласкі — не азначае ўзвышэння, якое ставіць яго вышэй за астатніх. У Касцёле функцыі «не сведчаць пра вышэйшасць адных над другімі»[74]. Сапраўды, жанчына Марыя больш важная за біскупаў. Нават калі функцыя службовага святарства лічыцца «іерархічнай», трэба добра памятаць, што «яна цалкам падпарадкавана святасці членаў містычнага цела Хрыста»[75]. Яго ключавым і прынцыповым момантам не з'яўляецца ўлада, зразуметая як панаванне, але ўлада ўдзялення сакрамэнту Эўхарыстыі. Адсюль нараджаецца аўтарытэт, які заўсёды застаецца ў служэнні людзям. У гэтых межах узнікае вялікі выклік для пастыраў і тэолагаў, якія маглі б паспрыяць лепшаму прызнанню таго, што прадугледжвае пашана для магчымай ролі жанчыны там, дзе прымаюцца важныя рашэнні ў розных касцёльных колах.

105. Пастырства моладзі, так як мы прызвычаіліся яго весці, пацярпела ад грамадскіх зменаў. У звычайных структурах моладзь часта не знаходзіць адказу на свае турботы, патрэбы, праблемы і раны. Нам, дарослым, цяжка слухаць іх з цярплівасцю, разумець іх турботы і патрабаванні, цяжка гаварыць мовай, якую яны разумеюць. З гэтай прычыны выхаваўчыя прапановы не прыносяць чаканага плёну. Уздым і рост аб'яднанняў і рухаў, пераважна моладзевых, можна інтэрпрэтаваць як дзеянне Духа Святога, які адкрывае новыя шляхі ў адказ на іх чаканні і пошук глыбокай духоўнасці і больш канкрэтнага пачуцця прыналежнасці. Аднак трэба зрабіць больш трывалым удзел гэтых груп у агульным пастырстве Касцёла[76].

106. Нават, калі не заўсёды было лёгка знайсці падыход да моладзі, аднак адбыўся поступ у дзвюх сферах: у разуменні, што ўся супольнасць евангелізуе і выхоўвае моладзь, і што ёсць пільная неабходнасць, каб моладзь мела большы ўплыў. Трэба прызнаць, што ў актуальным кантэксце крызісу актыўнасці і супольнасных сувязяў многія маладыя асобы аказваюць сваю салідарную дапамогу ў вырашэнні праблем нашага свету і ўдзельнічаюць у розных формах дзейнасці і валанцёрства. Некаторыя прымаюць удзел у жыцці Касцёла ў якасці членаў груп, якія займаюцца пэўнай службай або рознымі місійнымі ініцыятывамі ў сваіх дыяцэзіях або ў іншых месцах. Як жа прыгожа, што моладзь з’яўляецца «пілігрымам веры», радуючыся, што можа несці Езуса на кожнай вуліцы, на кожнай плошчы, у кожным кутку зямлі!

107. Шмат дзе не хапае пакліканняў да святарства і кансэкраванага жыцця. Часта прычынай гэтага становіцца недахоп у супольнасцях апостальскага заразлівага запалу, таму яны не абуджаюць энтузіязму і не маюць прывабнасці. Там, дзе ёсць жыццё, руплівасць, жаданне несці іншым Хрыста, там нараджаюцца сапраўдныя пакліканні. Нават у парафіях, дзе святары не вельмі актыўныя і радасныя, братэрскае і адданае жыццё супольнасці абуджае жаданне поўнага прысвячэння сябе Богу і евангелізацыі, асабліва, калі такая жывая супольнасць няспынна моліцца аб пакліканнях і мае мужнасць прапаноўваць маладым асобам шляхі спецыяльнай кансэкрацыі. З другога боку, нягледзячы на недахоп пакліканняў, сёння мы маем больш выразнае ўсведамленне неабходнасці лепшага адбору кандыдатаў да святарства. Нельга запаўняць семінарыі кандыдатамі, кіруючыся любога тыпу матывацыямі, асабліва калі яны звязаны з эмацыянальнай нясталасцю, з імкненнем да ўлады, чалавечай славы і матэрыяльнага дабрабыту.

108. Як ужо казаў, я не імкнуўся прадставіць поўны аналіз, але запрашаю супольнасці дапоўніць і ўзбагаціць гэтыя перспектывы на падставе іх разумення праблем, сваіх і блізкіх. Спадзяюся, што, робячы так, яны зразумеюць, што за кожным разам, калі мы спрабуем прачытаць знакі часу ў актуальнай рэчаіснасці, карысна паслухаць маладых і пажылых людзей. Адныя і другія з’яўляюцца надзеяй народаў. Пажылыя ўносяць памяць і мудрасць досведу, заахвочваючы не паўтараць тыя самыя памылкі з мінулага. Маладыя заклікаюць нас да новай і больш глыбокай надзеі, бо яны валодаюць новымі тэндэнцыямі чалавецтва і адкрываюць нас на будучыню, каб мы не замыкаліся ў настальгіі па структурах і звычаях, якія ўжо не з’яўляюцца дзейснымі ў сённяшнім свеце.

109. Выклікі існуюць для таго, каб з імі спраўляцца. Будзем жа рэалістамі, але не губляючы радасці, смеласці і аддання, поўнага надзеі! Не дазволім, каб нас пазбавілі місійнай сілы!

## Раздзел III

## Абвяшчэнне Евангелля

110. Пасля разважання над некаторымі выклікамі, звязанымі з дадзенай рэчаіснасцю, хачу цяпер нага-даць пра заданне, якое спачывае на нас у кожную эпоху і ў кожным месцы, бо «не можа быць сапраўднай евангелізацыі без , што Езус ёсць Панам», і без «першынства абвяшчэння Езуса Хрыста ў кожнай евангелізацыйнай дзейнасці»[77]. Спасылаючыся на клопат біскупаў Азіі, Ян Павел II сцвердзіў, што калі Касцёл «хоча выканаць сваё боскае прызначэнне, евангелізацыя, як радаснае, цярплівае і паступовае прапаведаванне збаўчай смерці і ўваскрасення Езуса Хрыста, павінна быць уласным абсалютным прыярытэтам»[78]. Гэта датычыць усіх.

I. Увесь Божы народ абвяшчае Евангелле

111. Евангелізацыя — гэта заданне Касцёла. Касцёл, як суб’ект евангелізацыі, гэта штосьці большае за арганічную і іерархічную ўстанову, бо яна перад усім складаецца з людзей, якія ідуць да Бога. Канешне, тут маецца на ўвазе , якая сягае сваімі каранямі Найсвяцейшай Тройцы, але канкрэтна існуе ў гісторыі як народ, які пілігрымуе і евангелізуе і які перавышае ўсялякія, хоць і неабходныя інстытуцыянальныя ры-сы. Я хацеў бы затрымацца крыху на гэтым спосабе ра-зумення Касцёла, які мае свой канчатковы фундамент у свабоднай і бескарыслівай ініцыятыве Бога.

112. Дадзенае нам Богам збаўленне — гэта справа Яго міласэрнасці. Няма такога дзеяння чалавека, якім бы добрым яно не было, праз якое мы заслужылі на такі вялікі дар. Бог з выключнай ласкі прыцягвае нас, каб паяднаць з сабою[79]. Ён пасылае свайго Духа ў нашыя сэрцы, каб зрабіць нас сваімі дзецьмі, каб перамяніць і ўчыніць нас здольнымі адказаць сваім жыццём на Яго любоў. Касцёл пасланы Езусам Хрыстом як сакрамэнт збаўлення, дадзенага Богам[80]. Праз сваю евангелізацыйную дзейнасць ён супрацоўнічае як прылада Божай ласкі, якая няспынна дзейнічае па-за ўсялякім магчымым кантролем. Дакладна прадставіў гэта Бэнэдыкт XVI, прапануючы разважанне для Сіноду: «Заўсёды трэба памятаць, што першае слова, сапраўдная ініцыятыва, сапраўднае дзеянне паходзіць ад Бога, і толькі тады, калі мы ўключаемся ў гэтую Божую ініцыятыву, калі настойліва просім аб гэтай Божай ініцыятыве, мы таксама можам стаць — з Ім і ў Ім — евангелізатарамі»[81]. Прынцып павінен быць светачам, які няспынна асвятляе нашыя разважанні пра евангелізацыю.

113. Гэтае збаўленне, здзейсненае Богам, якое радасна абвяшчае Касцёл, прызначана для ўсіх[82], а Бог даў пачатак шляху, каб паяднацца з кожным чалавекам усіх эпох. Вырашыў сабраць іх як адзін народ, а не паасобныя адзінкі[83]. Ніхто сам не можа сябе збавіць, гэта значыць ні як канкрэтная асоба, ні ўласнымі сіламі. Бог прыцягвае нас з улікам складанага

перапляцення асабовых адносін, з чаго складаецца жыццё ў супольнасці людзей. Гэты народ, які Бог сабе выбраў і сабраў, з’яўляецца Касцёлам. Езус не кажа Апосталам, каб яны стварылі выключную групу, . Езус кажа: «...ідзіце і навучайце ўсе народы» ( 28, 19). Св. Павел сцвярджае, што ў Божым народзе, у Касцёле «няма ўжо ні юдэя, ні грэка <...>, бо ўсе вы адно ў Хрысце Езусе» ( 3, 28). Ахвотна хацеў бы сказаць тым, хто адчувае сябе далёка ад Бога і ад Касцёла, хто баязлівы і абыякавы: Пан кліча таксама цябе, каб ты стаў часткай Яго народу, і робіць гэта з вялікай павагаю і любоўю!

114. Быць Касцёлам — значыць быць Божым народам згодна з вялікім планам любові Айца. Гэта значыць быць Божай закваскай сярод чалавецтва. Гэта значыць абвяшчаць і несці Божае збаўленне ў гэты наш свет, які часта адчувае сябе разгубленым, які патрабуе адказу, што дадае яму мужнасці, дае надзею, дадае сілы ў дарозе. Касцёл павінен быць месцам бескарыслівай міласэрнасці, дзе ўсе могуць адчуць сябе прынятымі, любімымі, дзе могуць атрымаць прабачэнне і заахвочванне, каб жыць згодна з добрым жыццём Евангелля.

,

115. Гэты Божы народ уключаецца ў народы, якія насяляюць зямлю, і кожны з іх мае ўласную культуру. Паняцце культуры — гэта каштоўная прылада для зразумення розных формаў хрысціянскага жыцця, якія існуюць у Божым народзе. Маецца на ўвазе стыль жыцця пэўнай супольнасці, спецыфіка адносін яго членаў паміж сабою, з іншымі стварэннямі і з Богам[84]. Кожны народ у сваім гістарычным працэсе развівае ўласную культуру са справядлівай аўтаноміяй[85]. Гэта звязана з тым, што чалавечая асоба «па сваёй сутнасці мае неад’емную патрэбу ў грамадскім жыцці»[86] і заўсёды суадносіцца з грамадствам, дзе канкрэтным чынам перажывае свой кантакт з рэчаіснасцю. Чалавек заўсёды абумоўлены культурай: «натура і культура вельмі цесна звязаны паміж сабою»[87]. Ласка прадугледжвае культуру, а Божы дар уваходзіць у культуру таго, хто яго прымае.

116. На працягу двух тысячагоддзяў хрысціянства незлічоныя народы атрымалі ласку веры, дасягнулі яе росквіту ў штодзённым жыцці і перадалі яе паводле сваіх уласных культурных узораў. Калі нейкая супольнасць прымае пасланне збаўлення, Дух Святы напаўняе яе культуру перамяняючай моцаю Евангелля. Такім чынам, як можна заўважыць у гісторыі Касцёла, хрысціянства не мае аднаго культурнага ўзору, але «застаецца цалкам сабою і, захоўваючы бескампрамісную вернасць евангельскаму пасланню і касцёльнай традыцыі, будзе набываць таксама аблічча розных культур і народаў, дзе будзе прынятае і ўкараніцца»[88]. У розных народах, якія адчуваюць Божы дар паводле ўласнай культуры, Касцёл выражае сваю сапраўдную каталіцкасць і паказвае «прыгажосць гэтай шматграннасці»[89]. Праз хрысціянскія формы выражэння евангелізаванага народу, Дух Святы ўпрыгожвае Касцёл, паказваючы яму новыя аспекты Аб’яўлення і адорваючы яго новым абліччам. Праз інкультурацыю Касцёл «уводзіць народы з іх культурамі ў сваю ўласную супольнасць»[90], бо «кожная культура прапануе каштоўнасці і станоўчыя формы,

якія могуць узбага-ціць спосаб прапаведавання, разумення і перажывання Евангелля»[91]. Такім чынам «Касцёл праз прысваенне каштоўнасцяў розных культур становіцца *sponsa ornata monilibus suis*, — абранніцай, упрыгожанай сваімі каштоўнасцямі (пар. 61, 10)»[92].

117. Правільна зразуметая культурная разнастайнасць не пагражае адзінству Касцёла. Гэта Дух Святы, пасланы Айцом і Сынам, перамяняе нашыя сэрцы і робіць нас здольнымі ўвайсці ў дасканалую камунію Найсвяцейшай Тройцы, дзе ўсё знаходзіць сваю еднасць. Ён стварае камунію і гармонію Божага народу. Сам Дух Святы ёсць гармоніяй, падобна як з'яўляецца повяззю любові паміж Айцом і Сынам[93]. Ён з'яўляецца тым, хто абуджае разнастайнае багацце дароў і адначасова будуе адзінства, якое ніколі не з'яўляецца аднастайнасцю, але прыцягальным суладдзем разнастайнасцяў. Евангелізацыя прызнае з радасцю гэтае разнастайнае багацце, якое Дух нараджае ў Касцёле. Логіцы ўцелаўлення супярэчыла б думка пра монакультурнае і аднастайнае хрысціянства. Хоць, праўда, некаторыя культуры былі цесна звязаныя з прапаведаваннем Евангелля і з развіццём хрысціянскай думкі, аднак аб'яўленае пасланне не прыпадабняецца да ніводнай з іх і мае міжкультурны змест. Таму ў евангелізацыі новых культур ці культур, якія не прынялі хрысціянскага прапаведавання, няма патрэбы навязваць пэўную, хоць бы нават прыгожую і старажытную, культурную форму разам з Евангеллем. Пасланне, якое мы абвяшчаем, заўсёды мае нейкую культурную форму, але часам у Касцёле мы паддаемся непатрэбнай сакралізацыі ўласнай культуры і праз гэта можам больш праявіць фанатызм, чым праўдзівы евангельскі запал.

118. Біскупы Акеаніі прасілі, каб у іх Касцёл «паглыбіў разуменне і прадстаўленне Хрыстовай праўды, зыходзячы з культурных традыцый рэгіёна», і заклікалі «ўсіх місіянераў да гарманічнага дзеяння з мясцовымі хрысціянамі, каб вера і жыццё Касцёла выяўляліся ў правільных формах, дастасаваных да кожнай культуры»[94]. Мы не можам чакаць, што ўсе народы на ўсіх кантынентах у вызнанні хрысціянскай веры будуць наследаваць формы, прынятыя еўрапейскімі народамі ў пэўны момант гісторыі, бо вера не можа замкнуцца ў межах разумення і вызнання, уласцівага для нейкай спецыфічнай культуры[95]. Несумненна, што адна культура не можа вычарпаць таямніцу адкуплення Хрыста.

— -

119. У кожным ахрышчаным, ад першага да апошняга, дзейнічае асвячальная моц Духа, якая змушае нас да евангелізацыі. Божы народ святы дзякуючы гэтаму намашчэнню, якое робіць яго «*in credendo*». Гэта азначае, што калі ён верыць — не блукае, нават калі не знаходзіць слоў для вызнання сваёй веры. Дух кіруе ім у праўдзе і вядзе яго да збаўлення[96]. Як праяўленне сваёй таямніцы любові да чалавецтва, Бог адорвае ўсіх верных — *sensus fidei,* які дапамагае ім распазнаваць тое, што сапраўды паходзіць ад Бога. Прысутнасць Духа гарантуе хрысціянам пэўнае прыпадабненне да Божай рэчаіснасці і мудрасці, якая дазваляе ім інтуітыўна разумець гэтую рэчаіснасць, хоць яны не валодаюць адпаведнымі сродкамі для яе дакладнага адлюстравання.

120. Паводле атрыманага хросту кожны член Божага народу стаў вучнем-місіянерам (пар. 28, 19). Кожны ахрышчаны, незалежна ад сваёй функцыі ў Касцёле і ступені настаўлення ў сваёй веры, з’яўляецца актыўным евангелізатарам, і было б няправільным думаць пра схему евангелізацыі, якую здзяйсняюць кваліфікаваныя працаўнікі, тады як рэшта вернікаў была б толькі адрасатам іх дзейнасці. Новая евангелізацыя павінна ўлічваць новы пратаганізм кожнага з ахрышчаных. Гэтае перакананне набывае форму заклiку, скіраванага да кожнага хрысціяніна, каб ніхто не адмовіўся ад свайго ўдзелу ў евангелізацыі, бо калі хтосьці сапраўды адчуў любоў Бога, які яго збаўляе, не патрабуе шмат часу, каб пачаць Яго абвяшчаць, не можа чакаць, каб яму прачыталі шмат лекцый ці доўгіх інструкцый. Кожны хрысціянін з’яўляецца місіянерам настолькі, наколькі сустрэўся з любоўю Бога ў Хрысце Езусе. Не будзем больш казаць, што мы — «вучні» і «місіянеры», але заўсёды, што мы — «вучні-місіянеры». Каб пераканацца, паглядзім на першых вучняў, якія адразу пасля позірку Езуса ішлі абвяшчаць Яго, поўныя радасці: «Мы знайшлі Месію» ( 1, 41). Самаранка, адразу пасля заканчэння свайго дыялогу з Езусам, стала місіянеркай, і многія самаране паверылі ў Езуса «на словы жанчыны» ( 4, 39). Таксама св. Павел, пасля сваёй сустрэчы з Езусам Хрыстом, «пачаў абвяшчаць у сінагогах пра Езуса, што Ён Сын Божы» ( 9, 20). А мы чаго чакаем?

121. Зразумела, што мы ўсе пакліканы да ўзрастання як евангелізатары. У той жа час мы будзем імкнуцца да лепшай фармацыі, паглыблення нашай любові і да больш выразнага сведчання аб Евангеллі. У гэтым сэнсе мы ўсе павінны дазволіць, каб іншыя нас евангелізавалі. Аднак гэта не азначае, што нам трэба адмовіцца ад евангелізацыйнай місіі. Наадварот, мы павінны знайсці спосаб абвяшчэння Езуса, які б адпавядаў сітуацыі, у якой мы знаходзімся. У любым выпадку мы ўсе пакліканы ахвяроўваць іншым выразнае сведчанне пра збаўчую любоў Пана, які незалежна ад нашай недасканаласці адорвае нас сваёй блізкасцю, сваім словам, сваёй моцаю і надае сэнс нашаму жыццю. Тваё сэрца ведае, што жыццё без Яго не такое самае, таму тое, што ты адкрыў, тое, што дапамагае табе жыць і што дае табе надзею, ты павінен перадаваць іншым. Нашая недасканаласць не павінна быць апраўданнем. Наадварот, місія з’яўляецца пастаянным імпульсам, каб не згаджацца з пасрэднасцю, але пастаянна ўзра-стаць. Сведчанне веры, да якога пакліканы кожны хрысціянін, прадугледжвае сцвярджэнне, падобнае да словаў св. Паўла: «Не тое, каб я ўжо атрымаў гэта і ўжо стаў дасканалым, але я імкнуся атрымаць тое, дзеля чаго мяне здабыў Хрыстус Езус. Паводле мэты імкнуся да ўзнагароды высокага паклікання Божага ў Хрысце Езусе» ( 3, 12. 14).

122. Падобна можам лічыць, што розныя народы, у якіх адбылася інкультурацыя Евангелля, з’яўляюцца сукупнасцю актыўных суб’ектаў, працаўнікамі евангелізацыі. Так ёсць, бо кожны народ — гэта творца сваёй уласнай культуры, а таксама пратаганіст сваёй гісторыі. Культура — гэта штосьці дынамічнае, што народ няспынна стварае, і кожнае пакаленне

передае наступнаму сукупнасць пастаў, адпаведных кожнай жыццёвай сітуацыі, якія гэтае пакаленне павінна нанова перапрацаваць адносна выклікаў, якія стаяць перад імі. «Чалавек адначасова і дзіця, і бацька культуры, у якой жыве»[97]. Калі сярод нейкага народу адбылася інкультурацыя Евангелля, яна ў сваім працэсе культурнага пераказу заўсёды па-новаму пераказвае таксама веру. Адсюль узнёсласць евангелізацыі, якая разумеецца як інкультурацыя. Кожная частка Божага народу, якая асэнсоўвае ў сваім жыцці Божы дар паводле ўласнага генія, дае сведчанне прынятай веры і ўзбагачае яе новымі, больш вымоўнымі спосабамі выяўлення. Можна сказаць, што «народ увесь час сябе евангелізуе»[98]. Тут набывае значэнне народная пабожнасць, якая з’яўляецца сапраўдным выражэннем спантаннай місійнай дзейнасці Божага народу. Маецца на ўвазе рэчаіснасць, якая знаходзіцца ў пастаянным развіцці і ў якой Дух Святы з’яўляецца пратаганістам[99].

123. У народнай пабожнасці можна заўважыць спосаб, паводле якога атрыманая вера ўвайшла ў нейкую культуру і пераказваецца далей. Успрынятая ў некаторыя перыяды з недаверам, стала прадметам новай ацэнкі ў наступныя дзесяцігоддзі пасля Сабору. У гэтым сэнсе дзейсным імпульсам стала адгартацыі *Evangelii nuntiandi* Паўла VI. У ёй ён тлумачыць, што народная пабожнасць «адлюстроўвае такое прагненне Бога, якое могуць адчуць толькі ўбогія і простыя людзі»[100] і якое «робіць здольнымі да прысвячэння сябе і ахвярнасці аж да гераічнасці, калі маецца на ўвазе вызнанне веры»[101]. Наш сучаснік Бэнэдыкт XVI адзначыў у Лацінскай Амерыцы, што гэтая пабожнасць з’яўляецца «каштоўным скарбам Каталіцкага Касцёла» і што ў ёй «выражаецца душа народаў Лацінскай Амерыкі»[102].

124.  апісвае багацце, якое Дух Святы выяўляе праз народную пабожнасць дзякуючы сваёй бескарыслівай ініцыятыве. На гэтым умілаваным кантыненце, дзе так шмат хрысціянаў выяўляе сваю веру праз народную пабожнасць, біскупы называюць яе таксама «народнай духоўнасцю» ці «народнай містыкай»[103]. Маецца на ўвазе сапраўдная «духоўнасць, уцелаўлёная ў культуру простых лю-дзей»[104]. Яна не пазбаўлена зместу, але адкрывае яго і выяўляе больш праз пасрэдніцтва сімвалаў, чым праз розум, а ў акце веры падкрэслівае больш *credere in Deum*, чым *credere Deum*[105]. З’яўляецца «першасным спосабам перажывання веры, спосабам адчування сябе часткай Касцёла і місіянерам»[106]. Нясе ласку місійнасці, выйсця па-за сваё «я» і быцця пілігрымамі: «Сумеснае вандраванне да санктуарыяў і ўдзел у іншых праяўленнях народнай пабожнасці і заахвочванне да гэтага дзяцей або іншых асобаў само па сабе з’яўляецца актам евангелізацыі»[107]. Мы не абмяжоўваем і не маем намеру кантраляваць гэтую місійную сілу!

125. Каб зразумець гэтую рэчаіснасць, трэба наблізіцца да яе з пункту гледжання Добрага Пастыра, які не асуджае, але любіць. Толькі пачынаючы ад пачуццёвага атаясамлення, якое вынікае з любові, мы можам ацаніць боскае жыццё, прысутнае ў пабожнасці хрысціянскіх народаў, сярод убогіх. Маю на ўвазе моцную веру многіх маці, нават калі яны не ўмеюць скласці фразаў з Credo, якія каля ложка хворага дзіцяці хапаюцца за ружанец; ці туя моц

надзеі, што ўскладаецца на запаленую ў бедным памяшканні свечку, каб прасіць аб дапамозе Марыю; ці затрыманне з глыбокай любоўю сваіх вачэй на ўкрыжаваным Хрысце. Хто любіць святы і верны Божы народ, не можа лічыць гэтыя дзеянні толькі натуральным пошукам боства. Гэта — праяўленне тэалагальнага жыцця, ажыўленага дзеяннем Духа Святога, які выліўся ў нашыя сэрцы (пар.  5, 5).

126. У народнай пабожнасці, паколькі яна з’яўляецца плёнам культуры, глыбока пераменена праз Евангелле, заключана дзейсная евангелізацыйная сіла, якую мы не можам не цаніць. Гэта было б недаацэнкай справы Духа Святога. Мы пакліканы заахвочваць да яе і ўмацоўваць яе праз паглыбленне працэсу інкультурацыі, ніколі не завершанай рэчаіснасці. Праяўленні народнай пабожнасці могуць нас многаму навучыць, а хто можа іх зразумець, то ўбачыць, што яны з’яўляюцца  , на якую мы павінны звяртаць увагу, асабліва тады, калі думаем пра новую евангелізацыю.

127. Цяпер, калі Касцёл хоча перажыць глыбокую місійную аднову, існуе форма прапаведавання, якая датычыць нас усіх як штодзённае заданне. Маецца на ўвазе нясенне Евангелля тым, з кім кожны мае дачыненне, як найбліжэйшым, так і незнаёмым. Гэта можа быць нефармальнае прапаведаванне слова, якое можа адбывацца падчас размовы, або тады, калі місіянер наведвае які-небудзь дом. Быць вучнем — значыць быць заўсёды гатовым несці любоў Езуса іншым, і адбываецца гэта спантанна ў любым месцы: на вуліцы, на плошчы, на працы, у дарозе.

128. У гэтым прапаведаванні, заўсёды поўным павагі і далікатнасці, першым момантам з’яўляецца дыялог, у якім другая асоба выказваецца і дзеліцца сваёй радасцю, надзеяй, клопатам пра сваіх блізкіх і рознымі іншымі справамі, якія жывуць у яе сэрцы. Толькі пасля гэтага можна звярнуцца да Божага слова, прачытаўшы нейкі фрагмент са Святога Пісання або расказаўшы гісторыю, заўсёды аднак маючы на ўвазе сутнасць паслання: персанальную любоў Бога, які стаўся чалавекам, аддаў сябе за нас, жыве і дае нам сваё збаўленне і сваё сяброўства. Гэтым пасланнем мы дзелімся праз сваю пакорную паставу, якая сведчыць пра нас, як пра людзей, якія заўсёды здольныя вучыцца, разумеючы, што пасланне з’яўляецца настолькі багатым і глыбокім, што заўсёды нас перавышае. Часам гэтае пасланне выяўляецца ў форме больш непасрэднай, часам праз асабістае сведчанне, апавяданне, жэст ці ў форме, якую Дух Святы можа падказаць у канкрэтных акалічнасцях. Калі гэта здаецца разумным і калі гэтаму спрыяюць умовы, карысна, каб гэтая братэрская і місійная сустрэча закончылася кароткай малітвай у інтэнцыі вырашэння клопатаў, прадстаўленых гэтай асобай. Такім чынам яна выразна адчуе, што яе пачулі і зразумелі, што яе сітуацыя аддадзена ў Божыя рукі, і пагадзіцца, што Божае слова сапраўды прамаўляе да яе.

129. Не трэба думаць, што евангельскае пасланне заўсёды перадаецца пры дапамозе сталых акрэсленых формул ці ў канкрэтных словах, якія выяўляюць абсалютна нязменны змест. Яно перадаецца ў такіх розных формах, што іх нельга апісаць ці сістэматызаваць, а Божы народ са сваімі бясконцымі жэстамі і знакамі з’яўляецца ў іх сукупным суб’ектам. У выніку гэтага, калі Евангелле ўцелавілася ў нейкую культуру, яно ўжо не перадаецца толькі праз абвяшчэнне ад асобы да асобы. Гэта павінна заахвоціць нас да разважання, што ў тых краінах, дзе хрысціянства складае меншасць, апроч заахвочвання кожнага ахрышчанага да абвяшчэння Евангелля мясцовыя Касцёлы павінны пашыраць актыўныя формы інкультурацыі, прынамсі, пачатковыя. Урэшце, трэба імкнуцца да таго, каб прапаведаванне Евангелля, выражанае ў катэгорыях, уласцівых культуры, у якой яно абвяшчаецца, вяло да новага сінтэзу з гэтай культурай. Хоць гэтыя працэсы заўсёды павольныя, часам нас празмерна паралізуе страх. Калі дазволім сумненням і боязі заглушыць усялякую адвагу, то замест таго, каб быць крэатыўнымі, мы проста станем прыстасаванцамі, якія не спрыяюць ніякаму развіццю, і ў гэтым выпадку мы будзем ужо не ўдзельнікамі гістарычных працэсаў дзякуючы нашаму супрацоўніцтву, але толькі назіральнікамі бясплённага застою Касцёла.

,

130. Дух Святы абагачае Касцёл, які евангелізуе таксама праз розныя харызмы. Яны з’яўляюцца дарам для адновы і будавання Касцёла[108]. Гэта не замкнёная ў сабе спадчына, даручаная нейкай групе, каб яна яе ахоўвала. Перш за ўсё тут ідзе гаворка пра дары Духа, інтэграваныя ў цела Касцёла і скіраваныя да цэнтра, якім ёсць Хрыстус, адкуль яны разыходзяцца як імпульс евангелізацыі. Выразным знакам праўдзівасці кожнай харызмы з’яўляецца яе эклезіяльнасць, яе здольнасць да гарманічнага інтэгравання ў жыццё святога Божага народу дзеля агульнага дабра. Праў-дзівая навізна, абуджаная Духам, не абавязкова павінна зацямняць іншую духоўнасць і дары дзеля свайго па-цвярджэння. Чым больш нейкая харызма скіроўвае позірк да сэрца Евангелля, тым больш яе рэалізацыя будзе эклезіяльнай. Менавіта ў супольнасці, нават калі гэта будзе каштаваць, плённасць харызмы выяўляецца праўдзіва і таямніча. Калі Касцёл жыве гэтым заклікам, ён можа быць прыкладам спакою ў свеце.

131. Часам адрозненні паміж асобамі і супольнасцямі вельмі перашкаджаюць, але Дух Святы, які абу-джае гэтую адрознасць, з усяго можа ўчыніць дабро і перамяніць іх у прывабны евангельскі дынамізм. Разнастайнасць заўсёды павінна быць з’яднана ў моцы Духа Святога; толькі Ён можа абудзіць адрознасць, разнастайнасць, мноства і адначасова выяўляць адзінства. Аднак, калі мы патрабуем разнастайнасці і замыкаемся ў нашых вузкіх схемах, выклікаем падзел, а з іншага боку, калі мы хочам будаваць еднасць на падставе нашых людскіх планаў, у выніку дыктуем аднастайнасць, гамагенізацыю. Гэта замінае місіі Касцёла.

,

132. Пасланне, скіраванае да культуры, прадугледжвае таксама пасланне скіраванае да культуры прафесіянальных, навуковых і акадэмічных колаў. Маецца на ўвазе сустрэча веры, розуму і навукі, якая мае на мэце развіваць новы дыскурс верагоднасці, арыгінальную апалагетыку[109], якая дапаможа стварыць новыя механізмы, каб Евангелле было пачутае ўсімі. Калі нейкія сферы навукі і катэгорыі мыслення прынятыя для абвяшчэння паслання, то тыя ж катэгорыі становяцца прыладамі евангелізацыі; гэта вада, перамененая ў віно. Раз прынятае, становіцца не толькі адкупленым, але таксама прыладаю Духа для асвятлення і аднаўлення свету.

133. Паколькі недастаткова жадання евангелізатара дасягнуць кожнага, а Евангелле абвяшчаецца таксама цэлым культурам, тэалогія — не толькі пастаральная — набывае асаблівае значэнне ў дыялогу з іншымі навукамі і чалавечым вопытам. Гэта ўсё дазваляе лепш паразважаць над тым, як дайсці з Евангеллем да ўсіх адрасатаў у разнастайных культурных кантэкстах[110]. Касцёл, які ўдзельнічае ў евангелізацыі, шануе і заахвочвае тэолагаў з іх харызмаю і намаганнем весці тэалагіч-ныя даследаванні і пашыраць дыялог са светам культуры і навукі. Ён кіруе заклік да тэолагаў, каб яны выконвалі паслугу як частку збаўчай місіі Касцёла. Аднак неабходна, каб яны мелі ў сэрцы евангелізацыйную мэту Касцёла і не задавальняліся кабінетнай тэалогій.

134. Універсітэты з’яўляюцца выдатнымі асяродкі для міждысцыплінарнага і інтэграванага асэнсавання і развіцця гэтага евангелізацыйнага задання. Каталіцкія школы, якія заўсёды стараюцца спалучыць выхаваўчае заданне з выразным абвяшчэннем Евангелля, робяць важны ўклад у евангелізацыю культуры таксама і ў тых краінах і гарадах, дзе неспрыяльная сітуацыя змушае нас быць крэатыўнымі ў пошуку новых адпаведных метадаў[111].

II. Гамілія

135. Паразважаем цяпер аб прапаведаванні ў ме-жах літургіі, што патрабуе сур’ёзнага падыходу з бо-ку пастыраў. Асабліва затрымаюся на гаміліі і на яе падрыхтоўцы, бо шмат ёсць крытычных заўваг да гэтай важнай паслугі, і мы не можам проста ігнараваць іх. Гамілія — гэта тое, па чым ацэньваецца блізкасць і здольнасць пастыра сустрэцца са сваім народам. Ведаем, што вернікі звяртаюць на яе асаблівую ўвагу. Яны, як і самі пасвячаныя распарадчыкі, неаднойчы пакутуюць, адныя падчас слухання, другія падчас абвяшчэння слова. Сумна, што так здараецца. Гамілія можа сапраўды быць інтэнсіўным і шчаслівым адчуваннем Духа, які ўмацоўвае праз сустрэчу са словам, пастаяннай крыніцай адновы і ўзрастання.

136. Адновім нашую надзею праз прапаведаванне, грунтуючыся на перакананні, што гэта Бог прагне дайсці да іншых праз прапаведніка і што Ён распасцірае сваю ўладу дзякуючы слову чалавека. Св. Павел станоўча кажа пра неабходнасць прапаведавання, бо Пан хацеў дайсці да іншых таксама праз нашае слова (пар.  10, 14-17). Наш Пан словам здабыў сэрцы

людзей. Адусюль прыходзілі слухаць Яго (пар. 1, 45). Былі здзіўленыя, калі слухалі Яго вучэнне (пар. 6, 2). Адчувалі, што Ён прамаўляў да іх як той, хто мае ўладу (пар. 1, 27). Апосталы, якіх Ён устанавіў, «каб яны былі з Ім, каб паслаць іх прапаведаваць» ( 3, 14), словам прыцягнулі да ўлоння Касцёла ўсе народы (пар. 16, 15. 20).

137. Цяпер трэба прыгадаць, што «літургічнае абвяшчэнне Божага слова, асабліва падчас эўхарыстычнага сходу, гэта не столькі час для разважання і катэхезы, колькі дыялог паміж Богам і Яго народам, дыялог, у якім прапаведуюцца цудоўныя праўды пра збаўленне і нанова ўзгадваюцца абавязкі, што вынікаюць з Запавету»[112]. Бачым, што тут асабліва падкрэслена гамілія, якая, дзякуючы яе эўхарыстычнаму кантэксту, пераўзыходзіць любую катэхезу і з’яўляецца самым важным момантам дыялогу Бога са сваім народам, які папярэднічае сакрамэнтальнай камуніі. Гамілія — гэта пачатак ужо распачатага дыялогу Пана са сваім народам. Абвяшчальнік слова павінен распазнаць сэрца сваёй супольнасці, каб шукаць, дзе ёсць жывое і гарачае прагненне Бога, а таксама, дзе гэты дыялог, поўны любові, быў прыглушаны ці не змог стаць плённым.

138. Гамілія не можа быць забаўляльным спектаклем, не можа падпарадкоўвацца логіцы мас-медыяў, але павінна абудзіць запал і надаць сэнс цэлебрацыі. Яна з’яўляецца чымсьці асаблівым, бо прапаведуе слова ў межах цэлебрацыі. Таму павінна быць кароткай і не ствараць уражання, што гэта нейкая канферэнцыя ці лекцыя. Прапаведнік можа мець здольнасць утрымліваць жывую зацікаўленасць людзей на працягу гадзіны, але тады яго словы становяцца больш важнымі за цэлебрацыю веры. Калі гамілія празмерна зацягваецца, то гэта знішчае дзве характэрныя рысы літургічнай цэлебрацыі: гармонію паміж яе часткамі, а таксама яе рытм. Калі прапаведаванне адбываецца ў кантэксце літургіі, яно ўключана як частка ахвяры, што прыносіцца Айцу, і як пасрэдніцтва ласкі, якую Хрыстус разлівае падчас цэлебрацыі. Гэты кантэкст патрабуе, каб прапаведаванне скіравала сход, а таксама прапаведніка да еднасці з Хрыстом у Эўхарыстыі, якая перамяняе нашае жыццё. Таму трэба, каб слова прапаведніка не займала празмерна часу, каб больш за распарадчыка ў цэнтры ўвагі быў Пан.

139. Мы сказалі, што Божы народ дзякуючы пастаяннаму дзеянню ў ім Духа няспынна евангелізуе сам сябе. Якое значэнне мае гэтае перакананне для прапаведніка? Яно нагадвае нам, што Касцёл з’яўляецца маці і абвяшчае слова народу як маці, якая звяртаецца да свайго дзіцяці і ведае, што яно верыць у карыснасць усяго, чаму яго вучаць, бо ведае, што яго любяць. Больш за тое, добрая маці прымае ўсё, што Бог пасеяў у яе дзіцяці, прыслухоўваецца да яго клопатаў і вучыцца ад яго. Дух любові, які пануе ў сям’і, кіруе і маці, і дзіцем у іх дыялогу, праз які чалавек вучыць і ў якім вучыцца, карэкціруе вопыт і

шануе тое, што з’яўляецца добрым. Тое самае адбываецца ў гаміліі. Дух, які натхняў Евангелле і дзейнічае ў Божым народзе, таксама вучыць, як трэба ўслухоўвацца ў веру народу і як трэба абвяшчаць слова падчас кожнай Эўхарыстыі. З гэтай прычыны хрысціянскае прапаведаванне знаходзіць у сэрцы культуры народу крыніцу жывой вады, каб бачыць, што трэба сказаць, і знайсці адпаведны спосаб, як гэта сказаць. Падобна як нам усім падабаецца, каб з намі гаварылі на нашай роднай мове — «матчынай» мове, таксама і ў веры нам падабаецца, каб да нас прамаўлялі з пункту гледжання «роднай культуры — „матчынай”», на падставе роднай — «матчынай» гаворкі (пар. *2* 7, 21. 27), і тады сэрца гатовае, каб слухаць уважліва. Гэтая мова — гэта тон, які перадае мужнасць, дыханне, сілу, імпульс.

140. Мы павінны падтрымліваць і культываваць гэты мацярынскі і эклезіяльны асяродак, у якім існуе дыялог паміж Панам і Яго народам, праз сардэчную блізкасць прапаведніка, цеплыню яго голасу, спакойны стыль яго выказванняў, радасць яго жэстаў. Калі нават гамілія становіцца крыху дакучлівай, але ў ёй адчуваецца гэты мацярынскі і эклезіяльны дух, яна будзе плённай, як дакучлівыя парады маці прыносяць з часам плён у сэрцы дзяцей.

141. Мы здзіўляемся багаццям, якімі карыстаецца Пан у дыялогу са сваім народам, адкрываючы ўсім свае таямніцы, захапляючы звычайных людзей такім узнёслым і патрабавальным вучэннем. Думаю, што сакрэт крыецца ў тым, як Езус глядзіць на народ, па-за яго слабасцямі і ўпадкамі: «Не бойся, малы статак, бо спадабалася Айцу вашаму даць вам Валадарства» ( 12, 32). Езус прамаўляе ў гэтым духу. Поўны радасці ў Духу Святым благаслаўляе Айца, які прыцягвае простых людзей: «Праслаўляю Цябе, Ойча, Пан неба і зямлі, што Ты закрыў гэта ад мудрых і разумных і адкрыў гэта дзецям» ( 10, 21). Пан сапраўды радуецца дыялогу са сваім народам, а прапаведнік павінен даць адчуць слухачам гэтую слодыч Пана.

,

142. Дыялог — гэта нешта значна большае за пераказ праўды. Ён рэалізуецца праз прыемную размову і канкрэтнае дабро, якое пераказваюць сабе ўзаемна тыя, хто любіць адно аднаго праз пасрэдніцтва словаў. З’яўляецца дабром, якое не заключаецца ў рэчах, але існуе ў саміх асобах, якія ўзаемна даюць сябе ў дыялогу. Прапаведаванне, што толькі маралізуе ці ідэалагізуе, як і тое, што ператвараецца ў лекцыю па экзэгезе, звужае гэтую камунікацыю паміж сэрцамі, якая мае месца ў гаміліі і якая павінна мець сакрамэнтальны характар: «вера — ад пачутага, а пачутае — праз слова Хрыста» ( 10, 17). У гаміліі праўда ідзе поруч з прыгажосцю і дабром. Не ідзе гаворка пра абстрактныя праўды ці сухія сілагізмы, бо перадаецца таксама прыгажосць вобразаў, якімі карыстаўся Пан, каб заахвочваць да здзяйснення дабра. Памяць вернага народу, як памяць Марыі, павінна быць перапоўнена вялікімі, цудоўнымі справамі Бога. Яго сэрца, адкрытае на надзею радаснага і магчымага ажыццяўлення любові, якая была яму абвешчана, адчувае, што кожнае слова ў

Пісанні з’яўляецца больш дарам, чым патрабаваннем.

143. Задача інкультурацыі прапаведавання заключаецца ў перадачы сінтэзу евангельскага закліку, а не ідэі ці каштоўнасці, не звязаных паміж сабою. Дзе твой сінтэз, там тваё сэрца. Розніца паміж прадстаўленнем сінтэзу і не звязаных паміж сабою ідэй такая ж, як паміж нудою і руплівасцю сэрца. Прапаведнік мае прыгожую і цяжкую місію з’яднання любячых сэрцаў: сэрца Пана і сэрца Яго народу. Дыялог паміж Богам і Яго народам яшчэ больш умацоўвае запавет паміж імі і паглыбляе сувязь любові. Падчас гаміліі сэрцы вернікаў сцішваюцца і дазваляюць, каб прамаўляў Ён. Пан і Яго народ тысячамі спосабаў размаўляюць проста паміж сабою, без пасрэднікаў. Аднак падчас гаміліі яны хочуць, каб хтосьці стаў прыладаю і выказаў пачуцці такім чынам, каб затым кожны мог здзейсніць выбар, як далей працягваць размову. Слова сапраўды з’яўляецца пасрэднікам і патрабуе не толькі двух суразмоўцаў, але таксама прапаведніка, які б прадставіў яго такім, якім яно ёсць, будучы перакананым, што «мы не сябе абвяшчаем, але Езуса Хрыста, Пана, а саміх сябе — як слугаў вашых дзеля Езуса» (*2*  4, 5).

144. Прамаўляць сэрцам — значыць мець яго не толькі палкім, але асветленым усім Аб’яўленнем і шляхам, якім Божае слова прайшло ў сэрцы Касцёла і нашага вернага народу ў гісторыі. Хрысціянская тоеснасць, як абдымкі Айца, дадзеныя нам падчас хросту, калі мы былі маленькімі, абуджае ў нас сум як у марнатраўных сыноў — і ўмілаваных Марыяй — па іншых абдымках міласэрнага Айца, які чакае нас у хвале. Зрабіць так, каб наш народ як бы адчуў, што жыве ў разгар гэтых двух абдымкаў — цяжкое, але прыгожае заданне таго, хто прапаведуе Евангелле.

III. Падрыхтоўка да прапаведавання слова

145. Падрыхтоўка да прапаведавання слова — гэта важнае заданне, бо трэба прысвяціць больш доўгі час на яго вывучэнне, малітву, разважанне і пастырскую крэатыўнасць. З вялікай любоўю хачу спыніцца на імгненне і прапанаваць спосаб падрыхтоўкі гаміліі. Гэтыя прапановы камусьці могуць здацца відавочнымі, але лічу патрэбным нагадаць пра неабходнасць прысвяціць пэўны час для гэтай патрэбнай паслугі. Некаторыя пробашчы часта думаюць, што гэта немагчыма з прычыны шматлікіх абавязкаў, якія яны павінны выканаць. Аднак асмельваюся прасіць, каб кожны тыдзень гэтаму заданню прысвячалася дастатковая частка асабістага і грамадскага часу, нават, калі б трэба было вызначыць менш часу на іншыя, нават важныя заданні. Давер Духу Святому, які дзейнічае ў прапаведаванні слова, не з’яўляецца пасіўным, але актыўным і . Прадугледжвае ахвяраванне сябе як прылады (пар.  12, 1), з усімі асабістымі здольнасцямі, каб Бог мог карыстацца імі. Непадрыхтавны прапаведнік сведчыць аб сваёй «недухоўнасці», несправядлівасці і неадказнасці адносна атрыманых дароў.

146. Першым крокам пасля звароту да Духа Святога з’яўляецца прысвячэнне ўсёй увагі біблійнаму тэксту, які павінен быць асновай прапаведавання. Калі хтосьці імкнецца зразумець пасланне тэксту, ён выконвае «культ праўды»[113]. Пакора сэрца схіляе да прыняцця таго, што слова заўсёды нас перавышае, што мы не «гаспадары і не творцы, але ахоўнікі, абвяшчальнікі і слугі»[114]. Такая пастава пакорнай і поўнай здзіўлення пашаны да слова выяўляецца ў яго вывучэнні з найбольшай увагай і ў падыходзе да яго інтэрпрэтацыі са святой бояззю. Каб навучыцца інтэрпрэтаваць біблійны тэкст, мы павінны быць цярплівымі, вольнымі ад усялякага неспакою, павінны прысвяціць яму час, быць зацікаўленымі і . Трэба адкласці ў бок усё, што нас турбуе, каб увайсці ў іншы абсяг радаснай засяроджанасці. Не варта аддавацца чытанню біблійнага тэксту, калі хочам атрымаць хуткі, лёгкі і непасрэдны вынік. Таму падрыхтоўка гаміліі патрабуе любові. Бескарысліва і без спешкі мы прысвячаем час толькі рэчам ці асобам, якіх мы любім. А тут маецца на ўвазе ўмілаванне Бога, які хацеў . Пачынаючы з гэтай любові, можна затрымацца ў паставе вучня: «Кажы, Пане, бо слухае слуга Твой» (*1*  3, 9).

147. Найперш трэба быць упэўненым, што , якое чытаем, разумеем правільна. Хачу падкрэсліць тое, што ёсць відавочным, але на што не заўсёды звяртаецца ўвага: вывучаемы намі тэкст мае два ці тры тысячагоддзі, яго мова вельмі адрозніваецца ад мовы, якой мы карыстаемся сёння. Калі нам здаецца, што мы разумеем словы, перакладзеныя на нашую мову, гэта не азначае, што мы разумеем правільна тое, што хацеў сказаць святы аўтар. Ёсць вядомыя дапаможнікі, якія прапануюць нам літаратурны аналіз: звярнуць увагу на словы, якія паўтараюцца ці падкрэсліваюцца, распазнаць структуру і ўласцівы тэксту дынамізм, звярнуць увагу на месца, якое займаюць дзеючыя асобы і гэтак далей. Але мэтаю не з’яўляецца зразуменне ўсіх дробных элементаў тэксту; самае важнае — гэта зразумець пасланне тэксту, што стварае яго структуру і адзінства. Калі прапаведнік не робіць такога намагання, магчыма, што і яго прапаведаванне не будзе мець адзінства і парадку. Яго прамова будзе толькі сумай розных адарваных ідэй, якія не змогуць мабілізаваць іншых. Галоўным пасланнем з’яўляецца тое, што аўтар хацеў найперш перадаць, і гэта азначае не толькі пазнанне ідэі, але таксама эфекту, які аўтар хацеў выклікаць. Калі тэкст быў напісаны для суцяшэння, мы не павінны карыстацца ім для выпраўлення памылак; калі быў напісаны для заахвоты, мы не павінны яго выкарыстоўваць для навучання аб Богу або для тлумачэння розных тэалагічных ідэй; калі быў напісаны для пахвалы або місійнага задання, мы не можам выкарыстоўваць яго, каб пагаварыць пра апошнія навіны.

148. Безумоўна, каб правільна зразумець галоўны сэнс нейкага тэксту, трэба параўнаць яго з вучэннем усёй Бібліі, якое перадае Касцёл. Гэта важны прынцып біблійнай інтэрпрэтацыі, які бярэ пад увагу факт, што Дух Святы натхніў не толькі адну частку, але ўсю Біблію, і што ў некаторых справах народ паглыбіў сваё разуменне Божай волі праз перажыты досвед. Такім чынам можна пазбегнуць памылковых ці частковых інтэрпрэтацый, супярэчных з іншым навучаннем таго самага Пісання. Аднак належыць захаваць адпаведны і адмысловы акцэнт тэксту, які мы павінны абвяшчаць. Адным з недахопаў сумнага і безвыніковага

прапаведавання ёсць менавіта тое, што яно няздольнае перадаць моц, уласцівую тэксту, які абвяшчаецца.

149. Прапаведнік «найперш сам <...> павінен паглыбляць вялікае асабістае сяброўства з Божым словам. Ён не можа спыніцца на пазнанні моўных ці экзэгетычных аспектаў, хоць гэта і неабходна; з пакорным і малітоўным сэрцам ён павінен набліжацца да слова, каб яно пранікла ўглыб яго думак і пачуццяў і нара-дзіла ў ім новы менталітэт»[115]. Карысна кожны дзень, кожную нядзелю аднаўляць нашую руплівасць у падрыхтоўцы гаміліі і праверыць, ці ўзрастае ў нас любоў да слова, якое мы прапаведуем. Не варта забываць пра тое, што «ступень святасці таго, хто выконвае паслугу, сапраўды ўплывае на абвяшчэнне слова»[116]. Як кажа св. Павел, «мы абвяшчаем Евангелле так, каб дагадзіць не людзям, але Богу, які выпрабоўвае сэрцы нашыя» (*1*  2, 4). Калі жывым ёсць жаданне, каб мы ў якасці першых слухалі слова, якое будзем прапаведаваць, перакажам яго такім ці іншым спосабам Божаму народу: «вусны гавораць тое, чым перапоўнена сэрца» ( 12, 34). Нядзельныя чытанні загучаць ва ўсёй сваёй прыгажосці ў сэрцы народу, калі спачатку яны гэтак жа загучаць у сэрцы пастыра.

150. Езус гневаўся на фальшывых настаўнікаў, якія былі патрабавальнымі да іншых, якія вучылі Божаму слову, але не дазвалялі, каб яно іх асвятліла: «Яны звязваюць цяжкія і непасільныя ношы і ўскладаюць на плечы людзей, а самі не хочуць і пальцам крануць іх» ( 23, 4). Апостал Якуб заклікае: «...няхай нямногія з вас імкнуцца стаць настаўнікамі, ведаючы, што будуць асуджаны больш сурова» ( 3, 1). Калі хто хоча прапаведаваць, павінен спачатку дазволіць, каб слова ўсхвалявала яго самога і стала рэальнасцю ў яго канкрэтным жыцці. Такім чынам абвяшчэнне слова заключаецца ў актыўнасці настолькі інтэнсіўнай і плённай, якой з’яўляецца «перадача іншым таго, што хтосьці сузіраў»[117]. Таму перш, чым распачаць падрыхтоўку канкрэтнай гаміліі, мы павінны дазволіць слову зраніць нас, каб яно пасля зраніла іншых, бо гэта слова  , якое як двухбаковы меч «пранікае ажно да падзелу душы і духа, суставаў і шпіку і здольнае судзіць думкі і намеры сэрца» ( 4, 12). Гэта набывае пастрыскае значэнне. Таксама ў наш час людзі жадаюць слухаць сведкаў: «прагнуць сапраўднасці. <....> Патрабуюць абвяшчальнікаў Евангелля, якія б казалі пра Бога, якога самі ведаюць і які ім блізкі, быццам бы Яго, нябачнага, бачылі»[118].

151. Ад нас не патрабуецца, каб мы былі беззаганнымі, але каб мы заўсёды ўзрасталі, жылі з глыбокім жаданнем крочыць наперад па шляху Евангелля і не апускалі рук. Неабходна, каб прапаведнік быў упэўнены, што Бог любіць яго, што Езус Хрыстус яго збавіў, што Яго любоў мае апошняе слова. Перад такой прыгажосцю ён шматразова будзе адчуваць, што яго жыццё не прыносіць яму поўні хвалы і будзе шчыра прагнуць лепш адказаць на такую вялікую любоў. Аднак калі не засяродзіцца на слуханні слова са шчырай адкрытасцю, калі не дазволіць, каб яно дакранулася да яго жыцця і выпрабавала яго, каб заахвочвала яго,

мабілізавала, калі не прысвяціць час на малітву словам, тады ён будзе лжэпрарокам, ашуканцам ці пустым шарлатанам. Аднак, у любым выпадку, прызнаючы сваю ўбогасць і жадаючы большага ўдзелу, заўсёды зможа даць Езуса Хрыста, кажучы як св. Пётр: «Срэбра і золата не маю, але што маю, тое даю табе» ( 3, 6). Пан хоча карыстацца намі як жывымі істотамі, свабоднымі і творчымі, якія дазваляюць Яго слову пранікнуць у сябе, перад тым як перадаць яго. Яго пасланне сапраўды павінна пранікнуць у прапаведніка, але не толькі праз розум, але авалодваючы ўсёй яго сутнасцю. Дух Святы, які натхніў слова, «як у пачатку Касцёла, так і сёння, дзейнічае ў кожным прапаведніку Евангелля, калі толькі той дазваляе Яму валодаць і кіраваць сабою, і ўкладвае ў яго вусны словы, якія той не змог бы сам знайсці»[119].

152. Існуе канкрэтны спосаб слухання таго, што Пан хоча нам сказаць праз сваё слова, і адкрытасці, каб нас перамяніў Ягоны Дух. Гаворка ідзе пра тое, што мы называем «*lectio divina*», якое заключаецца ў чытанні Божага слова падчас малітвы, каб яно нас асвятліла і аднавіла. Гэтае малітоўнае чытанне Бібліі нельга аддзяліць ад аналізавання, якое робіць прапаведнік, каб адшукаць галоўнае пасланне тэксту. Больш за тое, ён павінен пачаць з гэтага аналізу, каб зразумець, якім чынам датычыць яго жыцця. Духоўнае чытанне тэксту зыходзіць з яго даслоўнага значэння. У адваротным выпадку лёгка было б выхопліваць з тэксту тое, што выгаднае, што пацвярджае ўласныя рашэнні, што дастасоўваецца да схем нашага мыслення. Гэта па-сутнасці азначала б выкарыстанне святога дзеля ўласнай карысці і ўвядзенне ў такое замяшанне Божага народу. Ніколі нельга забываць, што часам «сам сатана ўдае сябе за анёла святла» (*2* 11, 14).

153. У Божай прысутнасці, падчас спакойнага чытання тэксту карысна запытацца, напрыклад: «Пане, што кажа гэты тэкст? Што хочаш змяніць у маім жыцці гэтым пасланнем? Што мяне непакоіць у гэтым тэксце? Чаму мяне гэта не цікавіць?», або «Што мне падабаецца, што мяне натхняе ў гэтым слове? Што мяне прыцягвае і чаму?» Калі чалавек імкнецца слухаць Пана, то нармальнай рэччу з’яўляюцца спакусы. Адна з іх — гэта адчуванне занепакоенасці, прыгнечанасці і замкнутасці. Іншая вельмі распаўсюджаная спакуса — гэта пераконванне сябе, што тэкст датычыць іншых, каб пазбегнуць яго ажыццяўлення ў сваім жыцці. Здараецца таксама, што хтосьці пачынае шукаць апраўдання, якое дазволіць яму аслабіць адмысловае пасланне тэксту. Часам мы лічым, што Бог чакае ад нас завялікага рашэння, і што мы не ў стане яго прыняць. Гэта прыводзіць многіх да страты радасці ад сустрэчы са словам, а гэта з’яўляецца вынікам забыцця пра тое, што ніхто не з’яўляецца больш цярплівым за Бога Айца, што ніхто не разумее і не можа чакаць так, як Ён. Бог заахвочвае зрабіць адзін крок наперад, але не патрабуе поўнага адказу, калі мы яшчэ не прайшлі ўсёй дарогі, каб даць гэты адказ. Ён проста прагне, каб мы шчыра паглядзелі на нашае жыццё і прасілі Яго аб тым, чаго яшчэ не змаглі атрымаць.

154. Прапаведнік павінен таксама  народ, каб адкрыць тое, што вернікі хочуць пачуць. Прапаведнік — гэта чалавек, які сузірае Божае слова, а таксама сузірае народ. Праз гэта ён адкрывае «прагненні, багацце і абмежаванасць, спосабы малітвы, любові, погляды на жыццё і свет — усё тое, што вылучае дадзе-ную чалавечую супольнасць», звяртаючы ўвагу «на  народ з яго знакамі і сімваламі, і адказваючы на пытанні, якія задае»[120]. Маецца на ўвазе звязван-не паслання біблійнага тэксту з сітуацыяй чалавека, з тым, чым жывуць людзі, з вопытам, які патрабуе святла слова. Гэтаму клопату не адпавядае апартуністычная ці дыпламатычная пастава, але пастава глыбока рэлігійная і пастырская. Па сутнасці яна з’яўляецца «духоўнай чуласцю, каб у падзеях распазнаць Божае пасланне»[121], а гэта штосьці большае, чым знайсці нешта цікавае для паведамлення. Тое, што хочацца адкрыць, з’яўляецца «,     у пэўных акалічнасцях»[122]. Таму падрыхтоўка гаміліі перамяняецца ў практыкаванне  , у якім чала-век — у святле Духа — імкнецца распазнаць «Божы заклік, які гучыць у пэўнай гістарычнай сітуацыі. Таксама ў ёй і праз яе Бог кліча вернікаў»[123].

155. У гэтым даследаванні можна выкарыстоўваць звычайны чалавечы вопыт, як напрыклад радасць сустрэчы, расчараванне, страх перад самотай, спачуванне іншаму чалавеку, пачуццё няўпэўненасці ў будучым, хваляванне за блізкую асобу і гэтак далей. Але пры гэтым трэба развіваць у сабе ўменне адчуваць тое, што сапраўды датычыць чалавечага жыцця. Нагадаем, што ніколі     ,     ; таксама не трэба прадстаўляць кроніку падзей, каб абудзіць зацікаўленасць: для гэтага існуюць ужо тэлепраграмы. Можна згадаць нейкі факт, каб слова загучала ва ўсёй моцы, заклікаючы да навяртання, да адарацыі, да канкрэтных пастаў братэрства і служэння і г. д., бо часам некаторыя асобы з прыемнасцю слухаюць каментары на тэму рэчаіснасці, але аспрэчваюць яе адносна саміх сябе.

156. Некаторыя вераць, што могуць быць добрымі прапаведнікамі, бо ведаюць, што павінны сказаць, але занядбоўваюць тое,  гэта зрабіць, канкрэтны спосаб прамаўлення гаміліі. Злуюцца, калі іншыя іх не слуха-юць або не цэняць, аднак, магчыма, яны не прыклада-юць-намаганняў, каб знайсці адпаведны спосаб прэ-зентацыі паслання. Нагадаем, што «відавочнае значэнне зместу евангелізацыі не можа закрыць вялікую вартасць спосабаў і сродкаў, якія выкарыстоўваюцца»[124]. Клопат пра спосаб прапаведавання з’яўляецца таксама глыбока духоўнай паставай. Гэта азначае адказ на любоў Бога праз прысвячэнне сябе з усімі нашымі здольнасцямі і творчасцю місіі, якую Ён даручыў нам. Гэта таксама выдатнае практыкаванне ў любові да бліжняга, бо мы не хочам даваць іншым штосьці мала каштоўнае. Напрыклад у Бібліі мы знаходзім параду падрыхтоўкі прапаведавання, каб гарантаваць яму адпаведны ўзровень: «Кажы коратка, у нямногіх словах [заключы] шмат зместу» ( 32, 8).

157. Толькі як прыклад прыгадаем некалькі практычных сродкаў, якія могуць узбагаціць прапаведаванне і зрабіць яго больш прывабным. Адна з самых важных рэчаў — навучыцца ўжываць у прапаведаванні вобразы, гэта значыць навучыцца прамаўляць вобразамі. Часам прыклады выкарыстоўваюцца дзеля раз'яснення таго, што хочам растлумачыць, але гэтыя прыклады часта адносяцца толькі да разважання; вобразы ж дапамагаюць ацаніць і прыняць пасланне, якое мы хочам перадаць. Прывабны вобраз дапамагае адчуць пасланне як штосьці роднае, блізкае, рэальнае, звязанае з уласным жыццём. Дакладны вобраз можа абудзіць асалоду ад паслання, якое мы намерваемся перадаць, абуджае прагненне і матывуе волю ў кірунку Евангелля. Добрая гамілія, як казаў мне стары настаўнік, павінна мець «адну думку, адно пачуццё і адзін вобраз».

158. Павел VI казаў, што вернікі «многага чакаюць ад гэтага прапаведавання і маюць карысць ад яго з умовай, што яно было простым, ясным, непасрэдным, пры-стасаваным»[125]. Прастата вынікае з мовы, якой мы карыстаемся. Гэта павінна быць зразумелая для адрасатаў мова, каб не здарылася, што мы прамаўляем упус-тую. Часта здараецца, што прапаведнікі выкарыстоўваюць словы, якім навучыліся падчас вучобы і ў пэў-ным асяроддзі, але яны не належаць да звычайнага лексікону асобаў, якія іх слухаюць. Існуюць словы, улас-цівыя тэалогіі ці катэхезе, сэнс якіх зразумелы для большасці хрысціянаў. Найбольшай небяспекай для прапаведніка з'яўляецца прызвычаенасць да свайго маўлення, калі ён лічыць, што ўсе іншыя карыстаюцца такімі ж словамі і спантанна іх разумеюць. Калі хочам дастасавацца да мовы іншых, каб слова дасягнула іх, трэба шмат слухаць, трэба падзяляць жыццё з людзьмі і ахвотна звяртаць на іх увагу. Прастата і выразнасць — гэта дзве розныя рэчы. Мова можа быць вельмі простай, але гамілія можа быць незразумелай з прычыны адсутнасці парадку, логікі або з-за таго, што адначасова былі закранутыя розныя тэмы. Таму наступнае неабходнае заданне — учыніць, каб гамілія мела тэматычную еднасць, выразны парадак і сувязь паміж сказамі, каб адрасаты маглі ісці за прапаведнікам і разумець логіку таго, пра што ён кажа.

159. Іншай характэрнай рысай з'яўляецца пазітыўная мова. Не столькі казаць пра тое, чаго нельга рабіць, але больш акцэнтаваць тое, што можам рабіць лепш. У любым выпадку, калі ўказваецца на штосьці негатыўнае, трэба імкнуцца паказаць таксама станоўчую каштоўнасць, якая захапляе, каб не затрымлівацца на нараканні, на скаргах, на крытыцы ці на дакорах сумлення. Больш за тое, пазітыўная гамілія заўсёды дае надзею, скіроўвае ў будучыню, не пакідае нас у палоне негатыўнасці. Як жа карысна, каб святары, дыяканы і свецкія перыядычна збіраліся, каб знайсці адпаведныя спосабы, каб зрабіць гамілію больш прывабнай!

IV. Евангелізацыя для паглыблення керыгмы

160. Місійны наказ Пана ўтрымлівае заклік да па-глыб-лення веры, калі кажа: «Вучыце [народы] усё, што Я загадаў вам» ( 28, 20). Такім чынам выразна бачна, што першае

прапаведаванне павінна таксама адкрыць дарогу для фармацыі і сталення. Евангелізацыя таксама імкнецца да ўзрастання, а гэта значыць, да сур’ёзнага стаўлення да кожнай асобы і да намеру, які Пан мае адносна яе. Кожны чалавек штораз больш патрабуе Хрыста, і евангелізацыя не павінна прывесці да таго, каб хтосьці задаволіўся чымсьці малым, але каб мог з поўным правам сказаць: «І ўжо не я жыву, а жыве ўва мне Хрыстус» ( 2, 20).

161. Было б няправільна інтэрпрэтаваць гэты зак-лік да ўзрастання выключна або пераважна як дактрынальную фармацыю. Справа ў тым, каб «захоўваць» тое, на што Пан указаў як на адказ на Яго любоў, дзе побач з іншымі цнотамі вылучаецца гэтая новая запаведзь, першая, найбольшая, якая найлепш прыпадабняе нас да яго вучняў: «Вось запаведзь Мая, каб вы любілі адзін аднаго, як Я палюбіў вас» ( 15, 12). Відавочна, што калі аўтары Новага Запавету хочуць звесці хрысціянскае маральнае пасланне да канчатковага сінтэзу, да таго, што з’яўляецца найбольш істотным, то паказваюць нам неад’емнае патрабаванне любові да бліжняга: «...хто любіць бліжняга, выканаў Закон. <...> Любоў ёсць выкананнем Закону» ( 13, 8. 10). «Калі аднак выконваеце каралеўскі закон паводле Пісання: “Любі бліжняга свайго, як самога сябе”, — добра робіце» ( 2, 8). «Бо ўвесь Закон спаўняецца ў адным: любі бліжняга свайго, як самога сябе» ( 5, 14). Св. Павел прапанаваў сваім супольнасцям шлях узрастання ў любові: «Пан няхай памножыць вас і перапоўніць вас любоўю адзін да аднаго і да ўсіх, якую і мы маем да вас» (*1*  3, 12).

162. З іншага боку, гэтую дарогу адказу і ўзрастання заўсёды апярэджвае дар, бо яе апярэджвае іншая просьба Пана: «...хрысціце іх у імя …» ( 28, 19). Усынаўленне, якое бескарысліва дае Айцец, і ініцыятыва дару Яго ласкі (пар.  2, 8-9; *1*  4, 7) з’яўляюцца ўмоваю і ствараюць магчымасць гэтага пастаяннага асвячэння, якое падабаецца Богу і прыносіць Яму хвалу. Маецца на ўвазе тое, каб мы дазволілі перамяняць сябе ў Хрысце для паступовага жыцця «паводле Духа» ( 8, 5).

163. Выхаванне і катэхеза служаць гэтаму ўзрастанню. Мы маем розныя тэксты Настаўніцкага Інстытуту Касцёла і катэхетычныя дапаможнікі, прапанаваныя Апостальскай Сталіцай і рознымі Канферэнцыямі Біскупаў. Нагадваю пра апостальскую адгартацыю *Catechesi tradendae* (1979 г.),     (1997 г.) і іншыя дакументы, актуальны змест якіх тут няма патрэбы паўтараць. Я хацеў бы толькі затрымацца на пэўных разважаннях, якія мне падаецца варта падкрэсліць.

164. Мы ўбачылі, што таксама ў катэхезе фундаментальную ролю мае першае прапаведаванне або «», якая павінна займаць цэнтральнае месца ў евангелізацыйнай дзейнасці і ў кожнай спробе касцёльнага аднаўлення.  з’яўляецца трынітарнай. Агонь Духа сыходзіць у постаці языкоў і абуджае ў нас веру ў Езуса Хрыста, які праз сваю смерць і ўваскрасенне аб’яўляе нам і перадае бясконцую міласэрнасць Айца. У вусны катэхета

заўсёды вяртаецца і гучыць першае пасланне: «Езус Хрыстус цябе любіць, Ён аддаў сваё жыццё, каб цябе збавіць, а цяпер Ён, жывы, знахо-дзіцца штодзённа побач з табою, каб цябе асвятляць, умацаваць і вызваліць». Калі мы кажам, што гэтае пасланне з'яўляецца «першым», гэта не азначае, што яго трэба прамовіць на пачатку, а пасля забыць пра яго ці замяняніць іншымі больш важнымі ідэямі. З'яўляецца першым у сэнсе якасці, бо з'яўляецца галоўным пасланнем, тым, да якога трэба пастаянна вяртацца і слухаць рознымі спосабамі і якое трэба пастаянна абвяшчаць падчас катэхезы ў той ці іншай форме, на ўсіх яе этапах і стадыях[126]. Таму таксама «святар — як і Касцёл — павінен паглыбляць свядомасць, што сам пастаянна патрабуе евангелізацыі»[127].

165. Было б памылковым думаць, што ў катэхезе саступае месца быццам бы больш «грунтоўнай» фармацыі. Няма нічога больш грунтоўнага, больш глыбокага, больш пэўнага, больш змястоўнага і больш мудрага за гэтае пасланне. Уся хрысціянская фармацыя з'яўляецца перадусім паглыбленнем , якая набывае штораз большую глыбіню і ніколі не перастае асвятляць катэхезу, дазваляючы правільна разумець кожную тэму, якая ў ёй разглядаецца. Гэтае пасланне адпавядае бясконцаму прагненню кожнага чалавечага сэрца. Цэнтральнае месца прадвызначаюць пэўныя рысы прапаведавання, якія сёння з'яўляюцца ўсюды неабходнымі: яно павінна казаць пра збаўчую моц любові Бога, і толькі пасля пра маральныя і рэлігійныя абавязацельствы; не павінна навязваць праўды, але заклікаць да свабоды; павінна адзначацца радасцю, жыццёвай сілай і гарманічнай цэласнасцю, якая не дазволіць звесці прапаведаванне да некалькіх дактрын, часам больш філасофскіх, чым евангельскіх. Гэта патрабуе ад евангелізатара некаторых пастаў, якія дапамогуць лепш прыняць пасланне: даступнасць, адкрытасць на дыялог, цярплівасць, сардэчная ветлівасць, якая нікога не асуджае.

166. Іншая характэрная рыса катэхезы, якая развілася ў апошнія дзесяцігоддзі, — гэта ініцыяцыя[128], якая ў асноўным азначае дзве рэчы: абавязковае паступовае развіццё працэсу фармацыі, у якім удзельнічае ўся супольнасць, а таксама новая ацэнка літургічных знакаў хрысціянскай ініцыяцыі. Многія падручнікі і праграмы мала звяртаюць увагі на неабходнасць адраджэння містагогіі, што магло б выявіцца ў розных формах згодна з жаданнем кожнай супольнасці. Катэхетычная сустрэча з'яўляецца абвяшчэн-нем слова і сканцэнтравана на ім, але заўсёды патрабуе адпаведнага асяроддзя і прыцягальнай матывацыі, выкарыстання красамоўных сімвалаў і ўключэння ў працэс узрастання і ўсебаковага далучэння асобы да супольнага працэсу слухання і адказу.

167. Карысна падчас кожнай катэхезы звяртаць асаблівую ўвагу на «шлях прыгажосці» (*via pul-chri-tu-dinis*)[129]. Абвяшчаць Хрыста — значыць паказваць, што верыць у Яго і наследаваць Яго з'яўляецца не толькі слушнай і справядлівай справай, але таксама прыгожай, здольнай напоўніць жыццё новым бляскам і глыбокай радасцю, нават сярод цяжкіх выпрабаванняў. У гэтай перспектыве ўсе формы праўдзівай прыгажосці могуць быць прызнаныя шляхам, які вядзе да сустрэчы з Панам Езусам. Не ідзе гаворка пра пашырэнне

эстэтычнага рэлятывізму[130], які можа зацямніць непадзельную лучнасць паміж праўдай, дабрынёй і прыгажосцю, але аб вяртанні пашаны да прыгажосці, каб здолець дасягнуць чалавечага сэрца і каб у ім заззяла праўда і дабрыня Уваскрослага. Калі, як сцвярджае св. Аўгустын, мы любім толькі тое, што прыгожае[131], то Сын, які стаўся чалавекам, аб’яўленнем бясконцай прыгажосці, у найбольшай ступені варты любові, і прыцягвае нас да сябе повязямі любові. Таму неабходна, каб фармацыя ў *via pulchritudinis* была ўключана ў пераказ веры. Пажадана, каб кожны мясцовы Касцёл спрыяў выкарыстанню мастацтва ў сваёй евангелізацыйнай справе, звяртаючыся да багацця мінулага і ў той жа час да шырокай гамы яго разнастайных сучасных формаў дзеля пераказвання веры новай «мовай прыпавесці»[132]. Трэба мець адвагу знаходзіць новыя знакі, новыя сімвалы, новыя спосабы перадачы слова, новыя формы прыгажосці, якія з’яўляюцца ў розных культурных колах, уключна з нязвыклымі формамі выяўлення прыгожага, якія могуць быць мала значнымі для евангелізатараў, але маюць асаблівую прывабнасць для іншых.

168. Што датычыць маральнага зместу катэхезы, які заахвочвае да ўзрастання ў вернасці евангельскаму стылю жыцця, то трэба заўсёды ўказваць на жаданае дабро, ідэал жыцця, сталасці, самарэалізацыі і плённасці, бо ў гэтым святле можна зразумець нашае асуджэнне зла, якое можа закрыць гэты ідэал. Замест таго, каб бачыць у нас экспертаў у справе апакаліптычных дыягназаў ці змрочных суддзяў, якія з задавальненнем шукаюць усялякія небяспекі ці адхіленні, было б карысна, каб нас успрымалі як радасных вестуноў узнёслых прапаноў, захавальнікаў дабра і прыгажосці, якія яснеюць у жыцці, верным Евангеллю.

169. У цывілізацыі, якая парадаксальна скалечана ананімнасцю і адначасова апантана падрабязнасцямі жыцця іншых, хворай на бессаромную цікавасць, Касцёл павінен уважліва прыглядацца да тых, хто яго акружае, каб спачуваць кожнаму чалавеку, хто гэтага заслугоўвае. У гэтым свеце пасвячаныя распарадчыкі ды іншыя працаўнікі пастырства могуць распаўсюджваць водар блізкай прысутнасці Езуса і Яго асабістых адносін да людзей. Касцёлу варта прывіваць сваім членам — святарам, законнікам і свецкім — гэтае «мас-тацтва суправаджэння», каб усе навучыліся заўсёды здымаць сандалі перад святой зямлёй іншага (пар. Зых 3, 5). Мы павінны надаць нашай дарозе здаровы рытм блізкасці з позіркам, які сведчыць пашану і поўны спачування, але які адначасова лечыць, вызваляе і заахвочвае да сталасці ў хрысціянскім жыцці.

170. Хоць гэта можа здавацца відавочным, духоўнае суправаджэнне павінна штораз больш весці да Бога, у якім мы можам здабыць сапраўдную свабоду. Некаторыя лічаць сябе свабоднымі, калі ходзяць здалёк ад Пана, не разумеючы, што на самай справе застаюцца сіротамі, без ратунку, без дому, у які заўсёды можна вярнуцца. Перастаюць быць пілігрымамі і ператвараюцца ў тых, хто круціцца вакол сябе і нікуды не даходзіць. Суправаджэнне стане контрпрадуктыўнай, калі ператворыцца ў нейкую тэрапію, якая будзе

ўмацоўваць замкнёнасць асобы ў яе іманентнасці і перастане быць пілігрымаваннем з Хрыстом да Айца.

171. Больш, чым калі-небудзь нам неабходны мужчыны і жанчыны, якія маюць вопыт у гэтым працэсе суправаджэння, які патрабуе разважлівасці, здольнасці разумець, умення чакаць, быць паслухмяным Духу, каб захаваць даручаных нам авечак ад ваўкоў, якія намагаюцца рассеяць аўчарню. Нам неабходна практыкавацца ва ўменні слухаць, якое заключаецца ў чымсьці большым, чым толькі ў тым, каб чуць. Першая справа ў размове з іншым чалавекам — гэта здольнасць сэрца, якая робіць магчымым блізкасць, без якой не можа быць сапраўднай духоўнай сустрэчы. Слуханне дапамагае нам знайсці адпаведны жэст і адпаведнае слова, каб нас не ўспрымалі як безуважных гледачоў. Толькі пачынаючы з гэтага слухання, поўнага пашаны і здольнага да спачування, можна будзе знайсці шляхі да сапраўднага ўзрастання, абудзіць прагненне хрысціянскага ідэалу, імкненне цалкам адказаць на Божую любоў і жаданне развіваць тое лепшае, што пасеяў Бог у нашым жыцці. Аднак гэта заўсёды патрабуе цярплівасці, бо мы ведаем, чаму вучыў св. Тамаш: можна мець ласку і любоў, але не практыкаваць належным чынам тую ці іншую цноту «з прычыны ўстойлівых супрацьлеглых схільнасцяў»[133]. Інакш кажучы, абмежаванасць цнотаў заўсёды і абавязкова выступае «*in habitu*», хоць умовы могуць ускладняць гэтых цнатлівых пастаў. Адсюль вынікае неабход-насць «педагогікі, якая вядзе чалавека, крок за крокам, да поўнага прысваення таямніцы»[134]. Каб дасягнуць сталасці, гэта значыць, каб набыць здольнасць прымаць сапраўды свабодныя і адказныя рашэнні, неабходныя час і вялізная цярплівасць. Як казаў бл. Пётр Фабэр, «час — гэта пасланнік Бога».

172. Той, хто суправаджае, можа згадзіцца, што сітуацыя кожнага чалавека перад Богам і ўласным жыццём з’яўляецца таямніцай, якой ніхто не ў стане цалкам пазнаць звонку. Евангелле прапануе нам папраўляць- іншага і дапамагаць яму ўзрастаць, зыходзячы са сцвярджэння аб’ектыўнага зла яго ўчынкаў (пар. 18, 15), але без ацэнкі адказнасці і віны (пар. 7, 1; 6, 37). У любым выпадку добры кампаньён не згаджаецца з фаталізмам ці маладушшам. Ён заўсёды заахвочвае шукаць аздараўлення, уставаць, прымаць крыж, пакідаць усё ззаду і выходзіць зноў і зноў, каб абвяшчаць Евангелле. Нас саміх суправаджаюць і аздараўляюць тыя, перад кім мы шчыра адкрываем сваё жыццё, і гэта вучыць нас цярплівасці і разуменню іншых і дапамагае нам абудзіць у іх давер, адкрытасць і гатоўнасць узрастаць.

173. Сапраўдная духоўная апека заўсёды распачынаецца і рэалізуецца ў кантэксце служэння евангелізацыйнай місіі. Адносіны Паўла з Цімафеем і Цітам з’яўляюцца прыкладам такога суправаджэння і фармацыі падчас апостальскай дзейнасці. Даручаючы ім місію затрымлівацца ў кожным месцы для «належнага вырашэння неразгледжаных спраў» (пар. 1, 5; пар. *1* 1, 3-5), Павел перадае ім крытэрыі адносна іх асабістага жыцця і пастырскай дзейнасці. Усё гэта выразна адрозніваецца ад любога віду панібрацкага суправаджэння, эгацэнтрчнай самарэалізацыі. Вучні місіянераў суправаджаюць вучняў

місіянераў.

174. Не толькі гамілія павінна жывіцца Божым словам. Уся евангелізацыя грунтуецца на ім праз слуханне, разважанне, пераўжыванне, цэлебраванне і сведчанне. Святое Пісанне — гэта крыніца евангелізацыі. Таму трэба пастаянна выхоўваць сябе да слухання слова. Касцёл не евангелізуе, калі не дазваляе евангелізаваць самога сябе. Неабходна, каб Божае слова «ўсё больш станавілася сэрцам кожнай эклезіяльнай дзейнасці»[135]. Божае слова, якое слухаюць і цэлебруюць, асабліва на Эўхарыстыі, корміць і ўнутрана ўмацоўвае хрысціянаў і робіць іх здольнымі даваць праўдзівае сведчанне ў штодзённым жыцці. Мы перамаглі ўжо былое супраць-пастаўленне слова і сакрамэнту. Абвешчанае, жывое і дзейснае слова рыхтуе да прыняцця сакрамэнту і ў сакрамэнце дасягае сваёй найбольшай плённасці.

175. Вывучэнне Святога Пісання павінна быць даступным для ўсіх вернікаў[136]. Вельмі важна, каб слова аб’яўлення радыкальна натхняла катэхезу і ўсе намаганні дзеля пераказу веры[137]. Евангелізацыя патрабуе блізкасці з Божым словам, а гэта азначае, што дыяцэзіі, парафіі і ўсе касцёльныя супольнасці павінны прапанаваць сур’ёзнае і пастаяннае вывучэнне Бібліі, а таксама пашыраць яе малітоўнае чытанне, прыватнае і сумеснае[138]. Мы не шукаем, блукаючы ў цемры, і не павінны чакаць, што Бог скіруе да нас слова, бо сапраўды «Бог прамовіў, і ўжо не з’яўляецца вялікай таямніцай, але тым, хто аб’явіўся»[139]. Прымем жа ўзнёслы скарб аб’яўленага слова.

## раздзел IV

## ГРАМАДСКІ ХАРАКТАР ЕВАНГЕЛІЗАЦЫІ

176. Евангелізаваць — значыць рабіць прысутным Божае Валадарства ў свеце. Аднак «ніводнае няпоўнае і недасканалае азначэнне не можа змясціць багатай, комплекснай і дынамічнай рэчаіснасці, якой з’яўляецца евангелізацыя, каб не ўзнікла адначасова небяспека збяднення або нават скажэння яе сэнсу»[140]. Сёння я хацеў бы падзяліцца сваім клопатам аб грамадскім вымярэнні евангелізацыі, бо калі яно не будзе адпаведна прадстаўлена, мы рызыкуем сказіць праўдзівае і поўнае значэнне евангельскай місіі.

### I. Уплыў керыгмы на супольнасць і грамадства

177.  мае выразны грамадскі змест: у самым сэрцы Евангелля знаходзіцца жыццё супольнасці і дзейнасць на карысць іншых. Змест першага абвяшчэння мае непасрэдны маральны ўплыў, сканцэнтраваны на любові.

178. Вызнаваць Айца, які бясконца любіць кожнага чалавека, — значыць адкрыць, што Ён «адорвае яго бясконцай годнасцю»[141]. Вызнаваць, што Сын Божы прыняў нашае цела, — значыць верыць, што кожная чалавечая асоба была ўзнесеная да сэрца самога Бога. Вызнанне, што Езус праліў за нас кроў, не дазваляе нам мець найменшае сумненне ў Яго бязмежнай любові, якая ўзвышае кожнага чалавека. Здзейсненае Ім адкупленне мае грамадскі характар, таму што «Бог у Хрысце збаўляе не толькі асобных людзей, але таксама аздараўляе міжчалавечыя сацыяльныя адносіны»[142]. Вызнаваць, што Дух Святы дзейнічае ва ўсіх, — зна-чыць прызнаць, што Ён стараецца пранікнуць у кожную чалавечую сітуацыю і ва ўсе грамадскія повязі: «Дух Святы мае бясконцы патэнцыял, уласцівы боскаму розуму, і знаходзіць спосабы, каб развязаць найбольш складаныя і цяжкавырашальныя вузлы чалавечай гісторыі»[143]. Евангелізацыя звязана з дзеяннем Духа. Сама таямніца Найсвяцейшай Тройцы нагадвае нам, што мы былі створаны паводле Божай камуніі, таму не можам ні рэалізаваць сябе, ні збавіць уласнымі сіламі. З сэрца Евангелля пазнаем унутраную сувязь паміж евангелізацыяй і развіццём чалавечага патэнцыялу, што абавязкова павінна выявіцца і ўмацавацца ва ўсёй евангелізацыйнай дзейнасці. Прыняцце першага абвяшчэння, якое заахвочвае да таго, каб мы дазволілі Богу любіць нас і самі любілі Яго любоўю, якую Ён нам перадае, выклікае ў жыцці асобы і ў яе дзеяннях першую і асноўную рэакцыю: прагнуць, шукаць і мець у сэрцы дабро іншых.

179. Гэтую непадзельную лучнасць паміж прыняццем збаўленнага абвяшчэння і дзейснай братняй любоўю паказваюць некаторыя тэксты Святога Пісання, таму карысна будзе затрымацца на іх і старанна паразважаць, каб зрабіць на іх падставе ўсе магчымыя высновы. Маецца на ўвазе пасланне, да якога мы часта прызвычайваемся, паўтараем яго амаль механічна, не зважаючы, аднак, ці яно мае рэальны ўплыў на жыццё нашых супольнасцяў. Якім жа небяспечным і шкодным з’яўляецца гэтае прызвычаенне, якое вядзе нас да няздольнасці здзіўляцца, захапляцца, мець энтузіязм ад жыцця Евангеллем братэрства і справядлівасці! Божае слова вучыць, што ў братах мы знаходзім няспынны працяг Уцелаўлення для кожнага з нас: «...тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі» ( 25, 40). Тое, што мы робім для іншых, мае трансцэндэнтны характар: «...якой мераю мераеце, такой і вам будзе адмерана» ( 7, 2). «Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны. Не судзіце, і не будуць судзіць вас; не асуджайце, і не будуць асу-джаць вас; прабачайце, і прабачаць вам. Давайце, і бу-дзе дадзена вам […]. Бо якой мераю мераеце, такой і вам будзе адмерана» ( 6, 36-38). Гэтыя тэксты кажуць пра абсалютную перавагу «выйсця па-за сваё “я” насустрач брату», як пра адну з дзвюх галоўных запаведзяў, якія з’яўляюцца фундаментам кожнай маральнай нормы і найбольш выразным распазнавальным знакам на шляху духоўнага ўзрастання як адказу на абсалютна бескарыслівы дар Бога. Па той жа прычыне «служэнне любові з’яўляецца асноўным вымярэннем місіі Касцёла і неад’емным выяўленнем яго сутнасці»[144]. Як Касцёл паводле сваёй прыроды з’яўляецца місійным, так непазбежным чынам з гэтай прыроды вынікае дзейсная любоў да бліжняга, спачуванне, якое разумее, апякуецца і падтрымлівае.

,

180. З чытання Святога Пісання выразна вынікае, што прапанова Евангелля грунтуецца не толькі на асабістых адносінах з Богам. Таксама і наш адказ на любоў не трэба разумець як звычайную суму малых асабіс-тых жэстаў у дачыненні да кагосьці патрабуючага, што магло б быць у пэўным сэнсе «дабрачыннасцю *la carte*», шэрагам дзеянняў, скіраваных толькі на заспакаенне свайго сумлення. Прапановай ’ ( 4, 43); маецца на ўвазе любоў да Бога, які валадарыць у свеце. У такой ступені, у якой Ён зможа валадарыць сярод нас, грамадскае жыццё стане для ўсіх прасторай братэрства, справядлівасці, спакою, годнасці. Таму як заклік, так і хрысціянскі вопыт скіраваны да атрымання грамадскіх вынікаў. Мы шукае Яго Валадарства: «Шукайце найперш Валадарства Божага і справядлівасці Ягонай, а гэта ўсё дадасца вам» ( 6, 33). Намер Езуса — усталяваць Валадарства свайго Айца; Ён просіць сваіх вучняў: «Ідзіце і абвяшчайце, кажучы: “Наблізілася Валадарства Нябеснае“» ( 10, 7).

181. Валадарства, якое прыходзіць і ўзрастае сярод нас, датычыць усяго і нагадвае нам прынцып распазнання, які прапанаваў нам Павел VI адносна развіцця: «Кожны чалавек і ўвесь чалавек»[145]. Ведаем, што «евангелізацыя не будзе поўнай без уліку ўзаемнага аднясення, якое пастаянна ўзнікае паміж Евангеллем і канкрэтным прыватным і грамадскім жыццём чалавека»[146]. Маецца на ўвазе крытэрый універсальнасці, характэрны для дынамікі Евангелля, бо Айцец хоча, каб усе людзі былі збаўлены, а Яго план збаўлення заключаецца ў новым паяднанні таго, што ў нябёсах, і таго, што на зямлі (пар.  1, 10). Загад гучыць: «Ідзі-це па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню!» ( 16, 15), бо «стварэнне з надзеяй чакае адкрыцця сыноў Божы» ( 8, 19). Усё стварэнне — гэта таксама ўсе аспекты чалавечай натуры, а таму «місія абвяшчэння Добрай Навіны Езуса Хрыста мае універсальнае прызначэнне. Яго запаведзь любові ахоплівае ўсе вымярэнні экзістэнцыі, усіх асобаў, усе асяроддзі сужыцця і ўсе народы. Нішто чалавечае для яе не можа быць чужым»[147]. Сапраўдная хрысціянская надзея, якая шукае эсхаталагічнага валадарства, заўсёды стварае гісторыю.

182. Вучэнне Касцёла наконт пэўных сітуацый падлягае большым ці меншым зменам і можа быць прадметам дыскусіі, аднак пазбегнуць канкрэтыкі, без разгляду падрабязнасцяў, не ўдасца, бо без гэтага вялікія грамадскія прынцыпы застануцца агульнымі ўказаннямі, якія нікога не датычаць. Трэба зрабіць з іх практычныя высновы, каб яны «маглі эфектыўна ўплываць на сённяшнюю складаную сітуацыю»[148]. Пастыры, выкарыстоўваючы дасягненні розных на-вук, маюць права выказваць свае меркаванні на тэму ўсяго, што датычыць жыцця асобаў, бо заданне евангеліза-цыі прадугледжвае і патрабуе інтэгральнай падтрымкі кожнага чалавека. Нельга ўжо больш сцвярджаць, што рэлігія павінна абмежавацца прыватнай сферай і што яна існуе толькі для таго, каб падрыхтаваць душы для неба. Ведаем, што Бог прагне шчасця для сваіх дзяцей таксама на гэтай зямлі, хоць яны і

пакліканы да вечнай паўнаты, бо Ён стварыў усё «для жыцця» (*1* 6, 17), каб усе маглі карыстацца гэтым. Таму хрысціянскае навяртанне патрабуе, каб мы зноў паразважалі «ў першую чаргу над тым, што датычыць грамадскага ладу і рэалізацыі агульнага дабра»[149].

183. Таму ніхто не можа патрабаваць ад нас, каб мы адсунулі рэлігію ў сферу таямнічага ўнутранага свету чалавека, каб яна не ўплывала на грамадскае і нацыянальнае жыццё, на стан інстытуцый свецкага грамадства, не выказвалася на тэму падзей, якія цікавяць грамадзянаў. Хто ж адважыцца закрыцца ў якой-небудзь святыні і сцішыць заклік св. Францішка Асізскага і бл. Тэрэзы з Калькуты? Яны б гэтага не зразумелі. Сапраўдная вера — якая ніколі не з’яўляецца камфортнай і індывідуалістычнай — заўсёды вызначаецца глыбокім жаданнем перамяніць свет, перадаць каштоўнасці, пакінуць пасля сябе штосьці добрае на зямлі. Мы любім гэтую цудоўную планету, на якой нас змясціў Бог, і любім людзей, якія яе насяляюць, з усімі іх драмамі і стомленасцю, з іх імкненнямі і надзеямі, з іх каштоўнасцямі і слабасцямі. Зямля — гэта наш агульны дом, і мы ўсе — браты. Хоць «усталяванне справядлівага ладу ў грамадстве і краіне з’яўляецца галоўным заданнем палітыкі», Касцёл «не можа і не павінен заставацца ў баку ад барацьбы за справядлівасць»[150]. Усе хрысціяне, а таксама пастыры, пакліканы клапаціцца пра будаванне лепшага свету. І гэта галоўнае, бо сацыяльнае вучэнне Касцёла ў першую чаргу пазітыўнае і дае прапановы, накіроўвае дзеянне, якое здольнае перамяніць, і ў гэтым сэнсе не перастае быць знакам надзеі, якая вынікае з поўнага любові сэрца Езуса Хрыста. Адначасова «Каталіцкі Касцёл разам з іншымі Касцёламі аб’ядноўвае свае намаганні ў грамадскай сферы як на ўзроўні дактрынальных разважанняў, так і на практычным узроўні»[151].

184. Не час разглядаць тут усе сур’ёзныя грамадскія пытанні, якія характарызуюць сённяшні свет. Некаторыя з іх я каментаваў у другім раздзеле. Гэта не грамадскі дакумент, а для разважання над гэтымі рознымі тэмамі мы маем адпаведную прыладу, якой з’яўляецца , да вывучэння якога і да карыстання якім я горача заклікаю. Больш за тое, ні Папа, ні Касцёл не маюць манаполіі ў інтэрпрэтацыі грамадскай рэчаіснасці і ў прапанове спосабу вырашэння сучасных праблем. Я магу паўтарыць тут тое, на што выразна ўказваў Павел VI: «У такіх адмысловых сітуацыях нам цяжка выказацца адназначна і ўказаць універсальнае рашэнне. Гэта не з’яўляецца нашым намерам і нашай місіяй. Хрысціянская супольнасць павінна аб’ектыўна аналізаваць сітуацыю ў кожнай краіне»[152].

185. У наступнай частцы пастараюся засяродзіць увагу на двух вялікіх пытаннях, якія здаюцца фундаментальнымі на гэтым этапе гісторыі. Разгледжу іх крыху шырэй, бо лічу, што яны будуць вызначаць будучыню чалавецтва. У першую чаргу маецца на ўвазе сацыяльная інтэграцыя бедных, а таксама спакой і грамадскі дыялог.

II. Сацыяльная інтэграцыя бедных

186. З нашай веры ў Хрыста, які стаў убогім і заўсёды быў блізка бедных і адкінутых, вынікае клопат аб інтэгральным развіцці найбольш занядбаных людзей у грамадстве.

187. Кожны хрысціянін і кожная супольнасць пакліканы быць Божымі прыладамі вызвалення і падтрымкі бедных дзеля поўнай сацыяльнай інтэграцыі; а значыць, мы ўважлівыя да крыку беднага і гатовыя яго падтрымаць. Дастаткова прагледзець старонкі Святога Пісання, каб адкрыць, як добры Айцец прагне ўслухоўвацца ў заклік убогіх: «Я добра бачыў пакуты народа Майго ў Егіпце, Я чуў крык ягоны з-за прыгнятальнікаў яго. Я ведаю яго цярпенні. Таму сышоў Я, каб вызваліць яго […]. Але ідзі, Я пашлю цябе» ( 3, 7-8. 10) і як клапоціцца пра іх патрэбы: «Ізраэльцяне заклікалі Пана, і Пан абудзіў для іх выбавіцеля» ( 3, 15). Калі мы застаёмся глухімі да гэтага закліку, у той час як з'яўляемся Божымі прыладамі ў слуханні ўбога-га, то мы адыходзім ад волі Айца і Яго плану, бо гэты ўбогі «будзе клікаць Пана супраць цябе, а ты абцяжарыш сябе грахом» ( 15, 9). Адсутнасць салідарнасці ў яго патрэбах непасрэдна ўплывае на нашыя адносіны з Богам: «Бо калі з горычы душы пракляне цябе, той, які яго стварыў, пачуе яго жаданні» ( 4, 6). Заўсёды вяртаецца старое пытанне: «Калі хтосьці мае дастатак у свеце і бачыць брата свайго ў нястачы, і закрывае перад ім сваё сэрца, то як любоў Божая можа жыць у ім?» (*1* 3, 17). Прыгадаем таксама, з якім глыбокім перакананнем апостал Якуб казаў пра вобраз крыку прыгнечаных: «Вось кліча плата, якую вы затрымалі працаўнікам, што жалі палеткі вашыя, і крык жняцоў дайшоў да вушэй Пана Магуццяў» (5, 4).

188. Касцёл прызнаў, што неабходнасць слухання гэтага крыку вынікае з вызваляючага дзеяння ласкі ў кожным з нас, таму не ідзе гаворка пра місіі, прызначаныя толькі для некаторых: «Касцёл, кіруючыся Евангеллем міласэрнасці і з увагі на любоў да чалавека, услухоўваецца ў заклік аб справядлівасці і з усіх сілаў хоча адказаць на яго»[153]. У гэтым кантэксце можна зразумець загад Езуса, скіраваны да вучняў: «Вы дайце ім есці» ( 6, 37), а гэта прадугледжвае таксама супрацоўніцтва ў вырашэнні структурных прычын убоства і падтрымку інтэгральнага развіцця бедных, а таксама больш простыя штодзённыя жэсты салідарнасці адносна вельмі канкрэтных формаў галечы, з якой мы сустракаемся. Слова «салідарнасць» крыху прыцерлася і часам неадпаведна інтэрпрэтуецца, але значыць намнога больш, чым нейкі адзінкавы жэст шчодрасці. Яно патрабуе фарміравання новага менталітэту, які кіруецца паняццямі супольнасці, прыярытэту жыцця ўсіх над маёмасцю некаторых.

189. Салідарнасць — гэта спантанная рэакцыя чалавека, які прызнае грамадскую функцыю ўласнасці і паўсюднае прызначэнне даброт яў як рэчаіснасці, якія папярэднічаюць прыватнай уласнасці. Прыватная ўласнасць апраўдана захаваннем і памнажэннем даброт аў, каб яны маглі лепш служыць агульнаму дабру, таму салідарнасць трэба ўспрымаць як вяртанне ўбогаму таго, што яму належыць. Гэтыя перакананні і сапраўднае практыкаванне

салідарнасці адкрываюць шлях для іншых структурных пераменаў і робяць іх магчымымі. Змена ў структурах, якая не вядзе да новых перакананняў і пастаў, прычыняецца да таго, што гэтыя ж структуры раней ці пазней стануць карумпіраванымі, груваcткімі і бясплённымі.

190. Часам прыходзіцца слухаць крык цэлых народаў, найбольш бедных людзей зямлі, бо «спакой засноўваецца не толькі на шанаванні правоў чалавека, але таксама на шанаванні правоў народаў»[154]. Прыкра, што нават правы чалавека могуць выкарыстоўвацца для ўпартага апраўдання індывідуальных правоў або правоў больш багатых народаў. Паважаючы незалежнасць і культуру кожнага народу, трэба заўсёды памятаць, што планета належыць усяму чалавецтву і што сам факт, што хтосьці нарадзіўся ў месцы з меншымі рэсурсамі або з меншым развіццём, не апраўдвае таго, што некаторыя асобы жывуць ніжэй годнасці. Трэба паўтарыць, што «больш прывілеяваныя асобы абавязаны адмовіцца ад некаторых сваіх правоў, каб больш свабодна дзяліцца сваімі дабротамі з іншымі»[155]. Каб належна гаварыць пра нашыя правы, мы павінны значна пашырыць свой погляд і адкрыць вушы на голас іншых народаў або іншых рэгіёнаў нашай краіны. Нам неабходна ўзрастаць у салідарнасці, каб «яна дазволіла ўсім народам стаць творцамі ўласнага лёсу»[156], падобна як «кожны чалавек пакліканы ўдасканальваць самога сябе»[157].

191. У кожным месцы і абставінах хрысціяне, заахвочаныя пастырамі, пакліканы слухаць крык убогіх, як трапна сцвердзілі біскупы Бразіліі: «Мы прагнем штодня прымаць радасць і надзею, засмучэнні і сум народу Бразіліі, асабліва з перыферыі гарадоў і сельскіх раёнаў — без зямлі, без даху над галавой, без хлеба, без здароўя, — пазбаўленага сваіх правоў. Калі мы бачым іх галечу, чуем іх заклік і ведаем іх цярпенне, мы абураемся, бо існуе ежа, якой бы хапіла для ўсіх, і што голад з’яўляецца вынікам дрэннага размеркавання добротаў і прыбытку. Праблема становіцца больш сур’ёзнай у кантэксце паўсюднага марнатраўства»[158].

192. Аднак мы прагнем большага, нашыя мары ўзно-сяцца вышэй. Мы не кажам толькі пра забеспячэн-не ўсіх ежай або «годным утрыманнем», але каб яны цешыліся «дабрабытам, не выключаючы ніякага дабра»[159]. Маецца на ўвазе адукацыя, даступная медыцынская апека, але асабліва праца, бо гэтак — праз свабодную, творчую, салідарную працу, якая не выключае ўдзел, — чалавек выяўляе і павялічвае годнасць свайго жыцця. Справядлівы заробак дазваляе мець адпаведны доступ да іншых добротаў, прызначаных для агульнага карыстання.

,

193. Імператыў слухаць крык убогіх становіцца ў нас рэчаіснасцю, калі мы да глыбіні ўзрушваемся, гле--дзячы на цярпенні іншага чалавека. Прачытаем некаторыя настаўленні Божага слова пра міласэрнасць, каб яны моцна прагучалі ў жыцці Касцёла. Евангелле кажа: «Шчаслівыя міласэрныя, бо яны спазнаюць міласэр-насць» ( 5, 7). Апостал Якуб вучыць,

што міласэрнасць да іншых дазваляе атрымаць трыумф на Божым судзе: «Гаварыце і чыніце так, як тыя, хто мае быць асуджаны паводле закону свабоды. Бо суд без міласэрнасці чакае таго, хто не чыніў міласэрнасці. Міласэрнасць вышэйшая за суд» ( 2, 12-13). У гэтым тэксце св. Якуб выступае як спадкаемца найбольшага багацця габрэйскай духоўнасці ў перыяд пасля выгнання, якая лічыла міласэрнасць асаблівай збаўчай каштоўнасцю: «Адкупі свае грахі справядлівасцю, а сваё беззаконне — міласэрнасцю да ўбогіх; вось тады твой спакой будзе трывалым» ( 4, 24). У гэтай жа перспектыве сапенцыяльная літаратура кажа пра міласціну як пра канкрэтны ўчынак міласэрнасці для патрабуючых: «Міласціна вызваляе ад смерці і ачышчае ад усялякага граху» ( 12, 9). Больш выразна кажа пра гэта таксама Сірах: «Вада гасіць палаючы агонь, а міласціна знішчае грахі» ( 3, 30). Тая самая думка з’яўляецца ў Новым Запавеце: «Перш за ўсё, майце шчырую любоў адзін да аднаго, таму што любоў закрывае мноства грахоў» (*1*  4, 8). Гэтая праўда глыбока пранікла ў менталітэт Айцоў Касцёла і як культурная альтэрнатыва выклікала пратэст прарокаў супраць геданічнага язычніцкага індывідуалізму. Прыгадаем толькі адзін прыклад: «Як пры небяспецы пажару мы бяжым па ваду, каб яго патушыць, <...> гэтак жа, калі з нашай саломы разгарэлася б полымя граху, і гэта занепакоіла б нас, мы маем магчымасць здзейсніць справу міласэрнасці, і радуемся гэтаму, як крыніцы, дадзенай нам для таго, каб мы патушылі пажар»[160].

194. Гэта настолькі выразнае пасланне, настолькі непасрэднае, настолькі простае і вымоўнае, што ніякая касцёльная герменеўтыка не мае права ставіць яго пад сумненне. Развaжанне Касцёла над гэтымі тэкстамі не павінна іх зацямняць або аслабляць іх закліку, але павінна дапамагчы адважна і з імпэтам прыняць іх. Навошта ўскладняць тое, што з’яўляецца такім простым? Канцэптуальныя прылады існуюць для таго, каб аблегчыць кантакт з рэчаіснасцю з мэтаю яе высвятлення, а не для таго, каб аддаляцца ад яе. Перш за ўсё гэта датычыць біблійных заклікаў, якія так рашуча заахвочваюць да братняй любові, да пакорнага і ахвярнага служэння, да справядлівасці, да міласэрнасці адносна беднага. Езус паказаў нам гэтую дарогу прызнання іншага чалавека сваімі словамі і жэстамі. Навошта зацямняць тое, што з’яўляецца ясным? Гэта датычыць не толькі таго, каб пазбегнуць дактрынальных памылак, але таксама каб захаваць вернасць гэтаму светламу шляху жыцця і надзеі. Таму што «адказнасць за невыносныя сітуацыі несправядлівасці і за існаванне палітычных рэжымаў, якія падтрымліваюць такія сітуацыі, ускладаецца часам на абаронцаў „артадоксіі”, якіх абвінавачваюць у пасіўнасці, паблажлівасці, а нават у саўдзеле»[161].

195. Калі св. Павел адправіўся да Апосталаў у Ерузалем, каб пераканацца, што бегаў ці бег не дарэмна (пар.  2, 2), ключавым крытэрыем сапраўднасці было тое, каб ён не забыў пра бедных (пар.  2, 10). Гэты важны крытэрый для супольнасцяў св. Паўла, каб яны не трапілі пад уплыў індывідуаліцкага стылю жыцця язычнікаў, становіцца вельмі актуальным сёння, калі пашыраецца новае індывідуалістычнае паганства. Мы не заўсёды верна паказваем прыгажосць Евангелля, але ёсць тое, чаго ніколі мы не можам абмінуць: выбар на карысць апошніх, тых, каго адкінула грамадства.

196. Часам мы маем жорсткае сэрца і розум, забываемся, забаўляемся, захапляемся вялізнымі спажывецкімі магчымасцямі і забавамі, якія прапануе нам сучаснае грамадства. Гэта прыводзіць да пэўнага адчужэння на кожным узроўні, бо «адчужаным становіцца грамадства, якое праз формы грамадскай арганізацыі, вытворчасці і спажывальніцтва ўскладняе як ажыццяўленне дару з сябе, так і будаванне міжчалавечай салідарнасці»[162].

197. У сэрцы Бога ёсць асаблівае месца для ўбогіх, бо Ён сам «стаў бедным» (*2* 8, 9). Уся дарога нашага адкуплення пазначана ўбогімі. Гэтае збаўленне дасягнула нас дзякуючы сказанаму «так» пакорнай дзяўчыны з маленькай краіны, загубленай на перыферыі вялікай імперыі. Збаўца нарадзіўся ў стайні, сярод жывёлы, як гэта здаралася ў выпадку найбольш бедных людзей; быў ахвяраваны ў святыні з дзвюма малымі галубкамі, што з’яўлялася ахвярай тых, хто не мог дазволіць сабе заплаціць за ягня (пар. 2, 24; 5, 7). Рос у доме звычайных працаўнікоў і сваімі рукамі зарабляў на хлеб. Калі пачаў абвяшчаць Валадарства, ішлі за ім натоўпы беднякоў, і так споўнілася тое, пра што сам казаў: «Дух Пана на Мне, бо Ён намасціў Мяне абвяшчаць Добрую Навіну ўбогім» ( 4, 18). Тых, хто згінаецца пад цяжарам цярпення, каго прыгнятае галеча, запэўніў, што Бог мае іх у глыбіні свайго сэрца: «Шчаслівыя ўбогія, бо ваша ёсць Валадарства Божае» ( 6, 20); Ён прыпадобніўся да іх: «Я быў галодны, і вы далі Мне есці», і казаў, што міласэрнасць да іх з’яўляецца ключом да неба (пар. 25, 35 і наст.).

198. Для Касцёла выбар на карысць убогіх з’яўляецца найперш катэгорыяй тэалагічнай, чым культурнай, сацыялагічнай, палітычнай ці філасофскай. Бог дае ім «сваю першую міласэрнасць»[163]. Гэтая Божая прэферэнцыя ўплывае на жыццё ўсіх хрысціянаў, пакліканых да таго, каб мець думкі такія, як у Хрысце (пар. 2, 5). Пад яе натхненнем Касцёл зрабіў , разумеючы гэта як «спецыяльную форму першынства ў практыкаванні хрысціянскай любові, пацверджаную ўсёй Традыцыяй Касцёла»[164]. Гэты выбар, як навучае Бэнэдыкт XVI, «заключаецца ў хрысталагічнай веры ў таго Бога, які для нас стаў убогім, каб нас узбагаціць сваім убоствам»[165]. Таму я прагну ўбогага Касцёла для ўбогіх. Яны могуць нас многаму навучыць. Апроч удзелу ў *sensus fidei*, дзякуючы свайму цярпенню яны ведаюць церпячага Хрыста. Неабходна, каб мы ўсе дазволілі ім сябе евангелізаваць. Новая евангелізацыя — гэта запрашэнне прызнаць збаўчую моц іх экзістэнцыі і змяшчэнне яе ў цэнтры шляху Касцёла. Мы пакліканы адкрыць у іх Хрыста, даць ім наш голас у іх справах, але таксама да таго, каб быць іх сябрамі, каб слухаць іх, разумець іх і прымаць таямнічую мудрасць, якую Бог хоча нам праз іх перадаць.

199. Наш удзел не заключаецца выключна ў дзейнасці або ў праграмах падтрымкі і апекі. Тое, што Дух абуджае актыўнасць, не з’яўляецца шквалам дзеянняў, але найперш , скіраванай на іншага чалавека, бо мы «лічым яго адным з сабою»[166]. Гэтая ўвага, поўная любові, з’яўляецца пачаткам сапраўднага клопату пра яго асобу і, пачынаючы з яе, хачу

плённа шукаць для яе дабра. Разам з тым трэба цаніць убогага з яго дабрынёй, з яго спосабам жыцця, з яго культурай, з яго спосабам перажывання веры. Сапраўдная любоў заўсёды сузіральная, дазваляе нам служыць іншаму не па неабходнасці ці дзеля пахвалы, але таму, што яна прыгожая, незалежна ад выгляду. «Бо з любові, дзякуючы якой хтосьці становіцца нам любым, мы даём яму штосьці дарма»[167]. Убогі, калі яго любяць, «лічыцца чымсьці каштоўным»[168], і гэта адрознівае выбар на карысць убогіх ад любой ідэалогіі, ад любой спробы выкарыстоўваць убогіх дзеля сваіх асабістых ці палітычных мэт. Толькі пачынаючы з гэтай рэальнай і сардэчнай блізкасці, мы можам належна імі апекавацца на шляху іх вызвалення. Толькі гэта паспрыяе таму, каб «у кожнай хрысціянскай супольнасці ўбогія адчувалі сябе „як дома”. Ці ж такі стыль жыцця не стаў бы найбольшай і найбольш плённай формай абвяшчэння добрай навіны пра Божае Валадарства?»[169]. Без прэферэнцыйнага выбару на карысць убогіх «абвяшчэнне Евангелля, якое з’яўляецца першым наказам міласэрнасці, можа застацца незразумелым і патануць у патоку слоў, якія абрушваюцца на нас у сучасным свеце праз сродкі масавай камунікацыі»[170].

200. Паколькі гэтая адгартацыя скіравана да членаў Каталіцкага Касцёла, я павінен з болем сцвердзіць, што найгоршай дыскрымінацыяй, якую спазнаюць убогія, з’яўляецца недахоп духоўнай апекі. Ёсць вялізная колькасць убогіх, якія асабліва адкрытыя на веру; яны патрабуюць Бога, і мы не можам пазбавіць іх Яго сяброўства, Яго благаслаўлення, Яго слова, цэлебрацыі сакрамэнтаў і прапановы шляху ўзрастання і сталення ў веры. Прэферэнцыйны выбар павінен у асноўным выявіцца ў прывілеяванай і прыярытэтнай духоўнай апецы.

201. Ніхто не можа казаць, што знаходзіцца здалёк ад убогіх, бо яго жыццё больш звязана з іншымі справамі. Мы часта сустракаемся з гэтым апраўданнем у акадэмічным асяроддзі, сярод прадпрымальнікаў ці выкладчыкаў, а нават у касцёльным асяроддзі. Хоць агульна можна сказаць, што пакліканнем і місіяй свецкіх вернікаў з’яўляецца перамена рознай зямной рэчаіснасці, каб кожная дзейнасць чалавека перамянілася дзякуючы Евангеллю[171], аднак ніхто не можа быць вызвалены ад клопату пра ўбогіх і грамадскую справядлівасць: «Духоўнае навяртанне, жывая любоў да Бога і бліжняга, клопат аб справядлівасці і спакоі, евангельскае стаўленне да ўбогіх і ўбоства патрабуецца ад усіх»[172]. Баюся, што таксама і гэтыя словы застануцца толькі прадметам каментароў без практычнага прымянення. Аднак я вельмі спадзяюся на адкрытасць і адпаведную гатоўнасць хрысціянаў і прашу вас разам шукаць новых шляхоў для прыняцця гэтай аднаўленай прапановы.

202. Нельга марудзіць з ліквідацыяй структурных прычын убоства, не толькі з увагі на прагматычныя патрабаванні, каб атрымаць вынікі і ўстанавіць лад у грамадстве, але каб вылечыць грамадства ад хваробы, якая робіць яго слабым і нягодным і вядзе толькі да новага крызісу. Планы дапамогі, якія задавольваюць толькі некаторыя пільныя патрэбы,

трэба лічыць толькі як часовыя адказы. Пакуль радыкальна, з адмаўленнем ад абсалютнай аўтаноміі рынкаў і фінансавых спекуляцый і з аспрэчваннем структурных прычын няроўнасці[173], не будуць вырашаныя праблемы бедных людзей, не вырашацца таксама праблемы свету, увогуле ніякія праблемы. Няроўнасць з’яўляецца коранем грамадскіх хвароб.

203. Годнасць кожнай чалавечай асобы і агульнае дабро — гэта пытанні, якія павінны надаваць змест усёй эканамічнай палітыцы, але часам яны здаюцца далучанымі штучна дадаткамі, каб дапоўніць палітычны план, пазбаўлены перспектывы і праграмы сапраўднага і інтэгральнага развіцця. Колькі ж словаў сталі непажаданымі для гэтай сістэмы! Мы дакучаем, калі гаворым пра этыку, дакучаем, калі кажам пра сусветную салідарнасць, дакучаем, калі кажам пра размеркаванне дабротаў, дакучаем, калі кажам пра захаванне месцаў працы, дакучаем, калі гаворым пра годнасць слабых людзей, дакучаем, калі кажам пра Бога, які патрабуе ўдзелу на карысць справядлівасці. Часам здараецца, што гэтыя тэмы становяцца прадметам апартуністычнай маніпуляцыі, якая іх ганьбіць. Выгодная абыякавасць да гэтых тэм пазбаўляе нашае жыццё і нашыя словы ўсялякага значэння. Праца стане высакародным пакліканнем прадпрымальніка з умовай, што ён задасць сабе пытанні наконт больш глыбокага сэнсу жыцця. Гэта дазволіць яму сапраўды служыць агульнаму дабру праз імкненне памножыць і зрабіць даступнымі для ўсіх даброты гэтага свету.

204. Не можам больш спадзявацца на сляпыя сілы і нябачную руку рынку. Будаванне раўнавагі патрабуе чагосьці большага за гаспадарчы рост, хоць і прадугледжвае яго; патрабуе рашэнняў, праграмаў, механізмаў і працэсаў, скіраваных на лепшае размеркаванне прыбытку, стварэнне месцаў працы, на інтэгральную падтрымку ўбогіх, якая выходзіць па-за межы толькі апекі. Я далёкі ад прапановы безадказнага папулізму, але эканоміка не можа больш выкарыстоўваць сродкі, якія з’яўляюцца новай атрутай, калі хоча мець большы прыбытак праз рэдукцыю рынку працы і павелічэнне такім чынам колькасці новых адчужаных.

205. Прашу Бога, каб узрастала колькасць паліты-каў, здольных распачаць сапраўдны дыялог дзеля плённа-га аздараўлення глыбокіх каранёў, а не знешніх праяў хваробы нашага свету! Палітыка, якую так зневажа-юць, з’яўляецца вельмі ўзнёслым пакліканнем, адной з самых каштоўных формаў любові, бо імкнецца да агульнага дабра[174]. Мы павінны пераканацца, што любоў «з’яўляецца не толькі прынцыпам мікраадносін: сяброўскіх сувязяў, сямейных, малой групы, але таксама макраадносін: грамадскіх, эканамічных і палітычных»[175]. Прашу Пана, каб Ён даў нам палітыкаў, якія сапраўды клапоцяцца пра дабро грамадства, народу, пра жыццё ўбогіх! Неад’емным з’яўляецца тое, каб кіраўнікі і фінансавая ўлада ўзнялі позірк і пашырылі свае перспектывы, каб пастараліся зрабіць даступнымі для ўсіх грамадзянаў годную працу, адукацыю і медыцынскую апеку. А чаму не звярнуцца да Бога, каб Ён натхніў іхнія планы? Я пераканаы, што адкрытасць на

трансцэндэнцыю магла б сфарміра-ваць новы палітычны і эканамічны менталітэт, які б дапа-мог перамагчы абсалютную дыхатамію паміж эканомікай і агульным грамадскім дабром.

206. Эканоміка, пра што кажа само слова, павінна быць мастацтвам належнага кіравання агульным домам, якім з'яўляецца ўвесь свет. Кожная эканамічная дзейнасць у пэўнай сферы, рэалізаваная ў нейкай частцы планеты, уплывае на ўсё; таму ніякі ўрад не можа дзейнічаць па-за сферай супольнай адказнасці. Сапраўды, усё больш цяжка знайсці вырашэнні на мясцовым узроўні з прычыны вялізных глабальных супярэчнасцяў, таму ў мясцовай палітыцы павялічваецца колькасць праблем. Калі сапраўды хочам мець здаровую сусветную эканоміку, існуе неабходнасць на гэтым гістарычным этапе канкрэтнага, больш плённага ўмяшання, якое, не парушаючы суверэнітэту народаў, забяспечыць эканамічны дабрабыт усім краінам, а не толькі некаторым.

207. Кожная супольнасць Касцёла, якая не хоча цалкам і з творчай плённасцю супрацоўнічаць у тым, каб убогія жылі годна і ніхто не быў адкінуты, рызыкуе распасціся, хоць і выказваецца на грамадскія тэмы ці крытыкуе ўрады. З лёгкасцю ўрэшце падпарадкуецца свецкай духоўнасці, схаванай пад рэлігійнымі практыкамі, бясплённымі сходамі ці пустымі прамовамі.

208. Калі кагосьці мае словы абразілі, хачу сказаць, што вымаўляю іх сардэчна і з найлепшым намерам, без якой-небудзь асабістай зацікаўленасці ці палітычнай ідэалогіі. Маё слова — гэта не слова непрыяцеля ці праціўніка. Мяне цікавіць толькі тое, каб тыя, хто стаў нявольнікам індывідуалістычнай ментальнасці, абыякавай і эгаістычнай, маглі вызваліцца з гэтых нікчэмных кайданаў і дасягнуць больш гуманнага стылю жыцця і мыслення больш высакароднага і плённага, якое б надало годнасці іхняму жыццю на гэтай зямлі.

209. Езус, найбольшы евангелізатар і рэалізатар Евангелля, прыпадабняецца асабліва да найменшых (пар.  25, 40). Гэта нагадвае нам, што ўсе мы, хрысціяне, пакліканы клапаціцца пра найбольш слабых жыхароў зямлі. Але ў абавязковай сёння мадэлі «поспеху» і «прыватнасці» бессэнсоўнымі здаюцца інвестыцыі, каб тыя, што знаходзяцца ззаду, слабыя ці менш здольныя маглі знайсці сабе дарогу ў жыцці.

210. Неабходна быць блізка да новых формаў убоства і крохкасці, у якіх мы пакліканы распазнаць церпячага Хрыста, хоць, на першы погляд, гэта не прыносіць нам ніякай канкрэтнай і хуткай карысці: бяздомныя, наркаманы, бежанцы, карэнныя народы, найбольш адзінокія і пакінутыя людзі пажылога ўзросту і г. д. Эмігранты для мяне з'яўляюцца асаблівым выклікам, бо я — пастыр Касцёла без межаў, які адчувае сябе маці ўсіх. Таму заклікаю краіны да велікадушнасці, і тады, замест боязі страціць мясцовую тоеснасць, яны

змогуць стварыць новы культурны сінтэз. Якімі ж прыгожымі з’яўляюцца гарады, якія перамаглі хваравіты недавер і інтэгруюць тых, хто адрозніваецца, робячы з гэтай інтэграцыі новы элемент развіцця! Якімі ж прыгожымі з’яўляюцца гарады, архітэктурныя планы якіх поўныя прасторы, якая лучыць, не перашкаджае адносінам, спрыяе прызнанню іншага чалавека!

211. Заўсёды балючым было для мяне становішча ахвяр розных формаў гандлю людзьмі. Як бы я хацеў, каб мы ўсе пачулі заклік Бога, які пытаецца ў кожнага з нас: «Дзе брат твой?» ( 4, 9). Дзе твой зняволены брат? Дзе той, каго ты штодзённа забіваеш у малой нелегальнай фабрыцы, у сетцы прастытуцыі, у дзецях, вымушаных жабраваць, у чалавеку, які павінен працаваць употай, бо ён дакументальна не афармлены? Не будзем удаваць, што мы нічога не бачым. Існуе шмат формаў удзелу ў злачынстве. Пытанне скіравана да ўсіх! Гэтая сетка злачыннасці і мафіі існуе ў нашых гарадах, і многія залілі свае рукі крывёю з прычыны выгоднага і маўклівага саўдзелу ў гэтым.

212. Удвая бедныя жанчыны, якія церпяць з прычыны адкінутасці, злоўжывання і гвалту, бо часта маюць меншыя магчымасці для абароны сваіх правоў. Тым не менш сярод іх увесь час мы бачым годныя захаплення праявы штодзённага гераізму ў абароне і ў клопаце аб крохкасці сваіх сем’яў.

213. Сярод тых убогіх, аб якіх хоча старанна клапаціцца Касцёл, ёсць дзеці, якія павінны нарадзіцца; яны найбольш безабаронныя і бязвінныя з усіх, а сёння іх хочуць пазбавіць чалавечай годнасці, каб рабіць з імі тое, што хочацца, пазбаўляючы іх жыцця і прымаючы законы, каб ніхто не мог гэтаму перашкодзіць. Каб грэбліва высмеяць Касцёл, які абараняе жыццё ненароджаных, часта яго пазіцыя прадстаўляецца як нешта ідэалагічнае, цемрашальскае і кансерватыўнае. Але ж абарона новага жыцця цесна звязана з абаронай лю-бога права чалавека. Яна грунтуецца на перакананні, што кожная чалавечая істота заўсёды з’яўляецца святой і недатыкальнай у любой сітуацыі і на кожным этапе яе развіцця. Сама па сабе з’яўляецца мэтай і ніколі не з’яўляецца сродкам вырашэння іншых цяжкасцяў. Калі гэтае перакананне абвяргаецца, знікае грунтоўны і трывалы фундамент для абароны правоў чалавека, якія заўсёды залежаць ад інтарэсаў зменлівых урадаў. Сам розум з’яўляецца дастатковым для прызнання непарушнай каштоўнасці кожнага чалавечага жыцця, але калі мы паглядзім на гэта ў святле веры, «усялякі гвалт над годнасцю чалавечай асобы чакае адплата перад абліччам Божым і зневажае Стварыцеля чалавека»[176].

214. Менавіта таму, што гэтае пытанне звязана з пасланнем аб каштоўнасці чалавечай асобы, нельга чакаць ад Касцёла, што ён зменіць сваю пазіцыю па гэтым пытанні. Я хачу быць цалкам сумленным у гэтым. Гэтая праблема не падлягае рэформам і «мадэрнізацыі». Знішчэнне чалавечага жыцця не спрыяе вырашэнню праблем. Аднак праўда і тое, што мы зрабілі няшмат, каб адпаведна дапамагчы жанчынам, якія знаходзяцца ў вельмі складанай сітуацыі, у якой аборт здаецца ім хуткім выйсцем з іх глыбокіх пакут, асабліва, калі зачатае ў

іх жыццё было вынікам гвалту ці ўзнікла ва ўмовах крайняй галечы. Хто ж не разумее такіх драматычных сітуацый?

215. Ёсць таксама іншыя слабыя і безабаронныя істоты, якія часта залежаць ад эканамічных інтарэсаў і якіх выкарыстоўваюць без разбору. Маю на ўвазе ўсё стварэнне. Як чалавечыя істоты, мы не толькі карыстальнікі, але ахоўнікі іншых стварэнняў. Пры дапамозе нашай цялеснай прыроды Бог так цесна злучыў нас з навакольным светам, што знішчэнне і атручванне зямлі з’яўляецца хваробай, якая закранае нас усіх, і мы можам смуткаваць над выміраннем нейкага віду як над нейкім знявечаннем. Не дапусцім, каб пасля нас на зямлі засталіся сляды знішчэння і смерці, якія наносяць шкоду нашаму жыццю і жыццю будучых пакаленняў[177]. У гэтым сэнсе я згодны з прыгожым прароцкім заклікам, поўным жалю, які некалькі гадоў таму выказалі біскупы Філіпінаў: «Бясконцае мноства аваднёў жыло ў пушчы і выконвала ў яе экасістэме важную ролю. <...> Птушкі ляталі ў паветры, а іх бліскучае пер’е і разнастайныя спевы надавалі колер і мелодыю зяляніне лясоў. <...> Бог гэтую зямлю прызначыў для нас, свайго асаблівага стварэння, але не для таго, каб мы яе знішчылі і перамянілі ў пустыню. <...> Паглядзі на рэкі карычнева-шакаладнага колеру ў тваім краі і памятай, што пасля адной ночы дажджоў яны адводзяць жывую кроў зямлі ў мора. <...> Як жа могуць плаваць рыбы ў такой каналізацыі, якой з’яўляецца рака Пасіг і многія іншыя рэкі, якія мы забрудзілі? Хто ператварыў цудоўны свет мораў у падводныя могілкі, пазбаўленыя жыцця і фарбаў?»[178].

216. Мы, усе хрысціяне, як св. Францішак Асізскі, непрыглядныя і малыя, але моцныя ў Божай любові і пакліканы клапаціцца пра крохкасць народу і свету, у якім жывём.

III. Агульнае дабро і грамадскі спакой

217. Мы шмат казалі пра радасць і любоў, але Божае слова пералічвае таксама плады спакою (пар.  5, 22).

218. Грамадскі спакой нельга разумець як ірэнізм ці як звычайную адсутнасць насілля, як вынік дамінавання аднаго над другім. Падобным фальшывым спакоем з’яўляецца спакой, які служыць для апраўдання арганізацыі грамадства, якая падаўляе і быццам бы супакойвае самых бедных, каб тыя, хто мае большыя даброты, маглі далей бесклапотна жыць, калі іншыя павінны змагацца за сваё існаванне. Справядлівыя пастулаты, звязаныя са справядлівым падзелам даброт, з уключэннем у грамадства ўбогіх і з правамі чалавека, нельга падаўляць пад выглядам будавання згоды на паперы ці нетрывалага спакою толькі для прывілеяванай меншасці. Годнасць чалавечай асобы і агульнае дабро знаходзяцца па-над спакоем тых, хто не хоча адмовіцца ад сваіх прывілеяў. Калі гэтыя каштоўнасці парушаюцца, патрэбны голас прарока.

219. Спакой «не зводзіцца толькі да адмаўлення ад усялякай вайны, нібы ўгрунтаваны на

зменлівай раўнавазе сіл. Спакой выпрацоўваецца цярпліва, дзень за днём, захоўваючы ўстаноўлены Богам парадак, які патрабуе больш дасканалай справядлівасці паміж лю-дзьмі»[179]. Урэшце, калі спакой не нараджаецца як плён інтэгральнага развіцця ўсіх людзей, ён не будзе мець будучыні і заўсёды будзе крыніцаю новых канфліктаў і розных формаў насілля.

220. У кожным народзе жыхары развіваюць грамадскае вымярэнне свайго жыцця, прымаючы паставу грамадзянскай адказнасці за свой народ, а не будучы бясформеннай масай, якой рухаюць дамінуючыя сілы. Прыгадаем, што «быць верным грамадзянінам з'яўляецца цнотай, а ўдзел у палітычным жыцці з'яўляецца маральным абавязкам»[180]. Аднак быць — гэта штосьці большае; гэта патрабуе сталага працэсу, у якім прымае ўдзел кожнае новае пакаленне. Гэта марудная і карпатлівая праца, якая патрабуе гатоўнасці да інтэграцыі і вучэння, каб можна было стварыць культуру сустрэчы ў шматграннай гармоніі.

221. Каб ісці наперад у будаванні грамадскіх сувязяў у спакоі, справядлівасці і братэрстве, мы маем чатыры прынцыпы, звязаныя з двухбаковымі напружаннямі, уласцівымі для кожнай грамадскай рэчаіснасці. Іх крыніцаю з'яўляюцца вялікія пастулаты сацыяльнага вучэння Касцёла, якія ўтвараюць «першы і асноўны арыенцір для тлумачэння і ацэнкі грамадскіх з'яў»[181]. У іх святле хачу прадставіць цяпер гэтыя чатыры прынцыпы, кіруючыся галоўным чынам развіццём грамадскага сужыцця і будаваннем народу, у якім адрозненні ствараюць гарманічнае цэлае ў межах агульнага праекту. Раблю гэта з пераканання, што іх прымяненне можа стаць сапраўдным шляхам да спакою ў кожным народзе і ва ўсім свеце.

222. Існуе двухбаковае напружанне паміж паўнатою і мяжою. Паўната абуджае жаданне валодаць усім, а мяжа — гэта сцяна, якая вырастае перад намі. «Час», зразуметы больш шырока, робіць суаднясенне да паўнаты як да формы, што адкрывае перад намі перспектыву, а хвіліна — гэта выражэнне мяжы, якая ўспрымаецца ў вызначанай прасторы. Грамадзяне жывуць у напружанні паміж сітуацыяй хвіліны і святлом часу, больш шырокай перспектывы, утопіяй, якая адкрывае нас на будучыню і захапляе як канчатковая рацыя. Адсюль вынікае першы прынцып развіцця ў будаванні народу: час перавышае прастору.

223. Гэты прынцып дазваляе працаваць дзеля шырэйшай перспектывы, без апантанасці неадкладнымі вынікамі. Ён дапамагае цярпліва зносіць цяжкасці і неспрыяльныя сітуацыі або змены ў планах, якія дыктуе дынамізм рэчаіснасці. З'яўляецца заахвочваннем для прыняцця напружання паміж паўнатой і мяжой, прызнаючы прыярытэт часу. Адзін з грахоў, з якім мы часам сустракаемся ў грамадска-палітычнай дзейнасці, — гэта засяроджванне , . Прызнанне прыярытэту прасторы прычыняецца да таго, што чалавека ахоплівае жаданне вырашыць усё адразу, каб паспрабаваць захапіць усю ўладу і ўмаца-ваць самога сябе. Гэта вядзе да запавольвання працэсаў і іх затрымкі. Прызнаць прыярытэт улады — значыць

заняцца больш пачаткам працэсаў, чым авалоданнем прасторай. Час арганізуе прастору, асвятляе яе і перамяняе ў чарговыя звенні ланцуга, які пастаянна расце, аберагае ад адступлення назад. Маецца на ўвазе грамадскі ўдзел новых людзей і грамадскіх груп, якія будуць развіваць гэтую дзейнасць дзеля прынясення плёну ў форме важных гістарычных падзей. Без непакою, але з выразнымі і моцнымі перакананнямі.

224. Я часам задаю пытанне: кім з'яўляюцца тыя, хто сёння сапраўды больш клапоціцца аб будаванні грамадскай тканкі народу, чым аб атрыманні неадкладных вынікаў, якія прыносяць лёгкую палітычную карысць, хуткую і часовую, якая, аднак, не будуе чалавечай паўнаты. Быць можа гісторыя асудзіць іх паводле крытэрыя, пра які сказаў Раман Гуардзіні: «Адзінай меркай, якую можам прыкладваць да нейкай эпохі, ёсць пытанне, у якой ступені ў гэтую эпоху — адпаведна канкрэтным рысам гэтай эпохі — »[182].

225. Гэты крытэрый таксама вельмі падыходзіць да евангелізацыі, якая змушае думаць пра перспектыву, прымяняць магчымыя працэсы і выходзіць у доўгую дарогу. У сваім зямным жыцці Пан шматразова нагадваў вучням, што ёсць рэчы, якія яны яшчэ не могуць зразумець і што трэба чакаць Духа Святога (пар. 16, 12-13). Прыпавесць аб пшаніцы і пустазеллі (пар. 13, 24-30) апісвае важны аспект евангелізацыі, які паказвае, якім чынам непрыяцель можа заняць прастору Валадарства і выклікаць шкоду, як пустазелле, але з часам добрае зерне пераможа.

226. Канфлікт можна ігнараваць або хаваць. Ён можа быць прыняты. Але калі мы апынёмся ў яго пастцы, мы страцім перспектыву, звузім далягляды, а рэчаіснасць стане фрагментарнай. Калі затрымліваемся на канфлікце, губляем пачуццё глыбокай еднасці рэчаіснасці.

227. Некаторыя проста заўважаюць канфлікт і ідуць- далей, быццам бы нічога не сталася, абмываюць ад гэтага рукі, каб далей жыць сваім жыццём. Іншыя ўваходзяць у канфлікт такім чынам, што становяцца яго вязнямі, губляюць арыенцір, уносяць у інстытуцыі замяшанне і незадаволенасць і гэтым разбураюць адзінства. Аднак існуе трэці, больш плённы спосаб супрацьстаяння канфлікту — гэта яго прыняцце, вырашэнне і ператварэнне яго ў звяно, якое лучыць з новым працэсам. «Шчаслівыя міратворцы» ( 5, 9).

228. Такім чынам становіцца магчымым паглыб-ленне еднасці сярод адрознасці; ёй могуць спрыяць толькі тыя шляхетныя асобы, якія маюць адвагу ўзно-сіцца па-над канфліктам і заўважаюць найглыбей-шую годнасць іншых. Таму неабходна прапаноўваць наступны прынцып, абавязковы ў будаванні грамадскай згоды: еднасць мае перавагу над канфліктам. Такім чынам салідарнасць, зразуметая ў сваім самым глыбокім значэнні як заклік, становіцца стылем стварэння гісторыі, асяроддзя жыцця, у якім канфлікты, напружанні і

адрозненні могуць ствараць разнастайную еднасць, якая нараджае новае жыццё. Гэта не звязана з прапановай сінкрэтызму ці панавання адных над другімі, але з вырашэннем на вышэйшым узроўні, якое захоўвае ў сабе каштоўную канструктыўнасць двух розных напрамкаў.

229. Гэты евангельскі крытэрый нагадвае нам, што Хрыстус з’яднаў у сабе ўсё: неба і зямлю, час і вечнасць, цела і дух, асобу і грамадства. Распазнавальным знакам гэтай еднасці і паяднання ўсяго ў сабе з’яўляецца спакой. Хрыстус «ёсць нашым спакоем» ( 2, 14). Евангельскае пасланне заўсёды пачынаецца прывітаннем спакою, а спакой завяршае кожную хвіліну і ўмацоўвае сувязі паміж вучнямі. Спакой з’яўляецца магчымым, бо Пан перамог свет і яго пастаянныя канфлікты, «усталяваўшы спакой праз кроў Яго крыжа» ( 1, 20). Але калі даходзім да глыбіні гэтых біблійных тэкстаў, адкрываем, што першым асяроддзем, у якім мы пакліканы да спакою сярод адрозненняў, з’яўляецца наш унутраны свет, нашае ўласнае жыццё, якое заўсёды знаходзіцца ў небяспецы дыялектычнага рассейвання[183]. Цяжка пабудаваць сапраўдны грамадскі спакой са скалечанымі сэрцамі, разбітымі на тысячы кавалкаў.

230. Пасланне спакою не адбываецца шляхам перамоў, але праз перакананне, што еднасць Духа спалучае ўсе адрозненні. Яно пераўзыходзіць канфлікт дзякуючы новаму, перспектыўнаму сінтэзу. Разнастайнасць з’яўляецца прыгожай, калі згаджаецца на няспынныя ўваходжанні ў працэс паяднання аж да заключэння пэўнага культурнага пагаднення, якое прывядзе да з’яўлення «паяднанай разнастайнасці», як трапна ка-жуць біскупы Конга: «Разнастайнасць нашай этнічнасці — гэта багацце. <…> Толькі дзякуючы еднасці, навяртанню сэрца і паяднанню мы можам прычыніцца да развіцця нашага краю»[184].

231. Існуе таксама двухбаковае напружанне паміж ідэяй і рэчаіснасцю. Рэчаіснасць проста існуе, ідэі ж выпрацоўваюцца. Неабходна, каб паміж імі быў пастаянны дыялог, без аддзялення ідэі ад рэчаіснасці. Небяспечна жыць выключна ў сферы слова, вобразу, сафізму. Адсюль выснова, што трэба разглядаць трэці прынцып: рэчаіснасць больш важная за ідэю. Гэта прадугледжвае пазбяганне розных формаў, якія зацямняюць рэчаіснасць: анёльскіх формаў чыстасці, дыктатуры рэлятывізму, пустой рыторыкі, больш фармальных, чым рэальных праектаў, антыгістарычнага фундаменталізму, этычных сістэм, пазбаўленых дабрыні, інтэлектуальнага дыскурсу, пазбаўленага мудрасці.

232. Функцыя ідэі — у яе канцэптуальнай апрацоў-цы — заключаецца ў тым, каб ухапіць, зразумець рэчаіснасць і кіраваць ёю. Ідэя, адарваная ад рэчаіснасці, нараджае нерэальны ідэалізм і наміналізм, якія толькі імкнуцца класіфікаваць і даваць азначэнне ідэі, але не фарміруюць яе. Тое, што захапляе і прыцягвае — гэта рэчаіснасць, асветленая розумам.

Трэба перайсці ад фармальнага наміналізму да гарманічнай аб’ектыўнасці. Ёсць спробы розным чынам маніпуляраваць праўдай, падобна як гімнастыку спрабуюць замяніць касметыкай[185]. Ёсць палітыкі, а таксама рэлігійныя лідэры, якія пытаюцца, чаму народ іх не разумее і не ідзе за імі, хоць іх пазіцыя такая лагічная і выразная. Напэўна дзеецца так таму, што яны пасяліліся ў валадарстве чыстых ідэй і звялі палітыку або веру да рыторыкі. Іншыя забылі пра прастату і прынеслі звонку чужую і незразумелую для людзей рацыянальнасць.

233. Рэчаіснасць больш важная за ідэю. Гэты кры-тэрый звязаны з уцелаўленнем слова і ўвядзеннем яго ў жыццё: «Па гэтым распазнаеце Духа Божага: кожны дух, які вызнае, што Езус Хрыстус прыйшоў у целе, ёсць ад Бога» (*1* 4, 2). Крытэрыем рэчаіснасці ўжо з’яўляецца слова, якое заўсёды стараецца ўцелавіцца ў канкрэтыку нашага жыцця, што з’яўляецца істотным для евангелізацыі. З аднаго боку, вядзе нас да належнай ацэнкі гісторыі Касцёла як гісторыі збаўлення, да захавання ў памяці нашых святых, якія ўнеслі Евангелле ў жыццё нашых народаў, да прыняцця багатай традыцыі Касцёла, якая налічвае дзве тысячы гадоў, без намеру выпрацаваць новыя ідэі, адарваныя ад гэтай скарбніцы, быццам бы мы хацелі стварыць іншае евангелле. З другога боку, гэты крытэрый схіляе нас да ажыццяўлення гэтага слова, да рэалізацыі спраў справядлівасці і міласэрнасці, у якіх яно прыносіць плён. Не ажыццяўляць слова — значыць будаваць на пяску. Абапірацца толькі на адну ідэю — значыць рызыка-ваць замкнуцца ў сабе і згадзіцца з гнастычнымі поглядамі. Гэта не прыносіць ніякіх пладоў і робіць безвыніко-вым дынамізм Евангелля.

234. Існуе таксама напружанне паміж глабальным і мясцовым. Трэба звярнуць увагу на глабальнае вымярэнне, каб не паддацца спакусе вузкага, абмежаванага погляду. Адначасова трэба трымаць у полі зроку мясцовае вымярэнне, дзякуючы чаму мы цвёрда ступаем па зямлі. Абодва гэтыя вымярэнні, калі яны спалучаны, засцерагаюць ад гэтых крайніх пастаў. Першая — калі грамадзяне жывуць у абстрактным і глабалізаваным сусвеце, быццам пасажыры камфортнага апошняга вагону, якія дзівяцца феерверкам свету з раскрытымі вуснамі і запраграмаванымі апладысментамі. Другая — калі становяцца фальклорным музеем мясцовых пустэльнікаў, асуджаных на бясконцае паўтарэнне таго ж самага, якія няздольныя рэагаваць на штосьці іншае і захапляцца прыгажосцю, якую Бог рассейвае па-за іх межамі.

235. Паўната — гэта штосьці большае за частку і штосьці большае за іх суму. Таму не трэба доўга затрымлівацца на абмежаваных і канкрэтных справах. Заўсёды трэба глядзець шырэй, каб распазнаць большае дабро, якое прыносіць карысць усім. Аднак гэта трэба рабіць без ухілення і выкаранення. Трэба пусціць карані ва ўраджайную зямлю і ў гісторыю свайго краю, які з’яўляецца дарам Бога. Працаваць у тым, што малое, мясцовае, у лучнасці з тым, што блізкае, але з больш шырокай перспектывай. Таксама асоба, якая, захоўваючы ўласцівыя ёй рысы і не хаваючы сваёй тоеснасці, усім сэрцам удзельнічае ў нейкай

супольнасці, не расплываецца ў ёй, але атрымлівае новыя імпульсы для свайго развіцця. Гэта не глабальная сфера, якая вядзе да размывання, і не ізаляваная частковасць, якая асуджае чалавека на пустату.

236. Мадэллю не з’яўляецца шар, які не перавышае частак, дзе кожны пункт аднолькава аддалены ад цэнтра і няма розніцы паміж адным пунктам і другім. Мадэллю з’яўляецца шматграннік, які адлюстроўвае зліццё ўсіх яго непаўторных элементаў. Мэта пастырскай і палітычнай дзейнасці — сабраць у такім шматгранніку ўсё найлепшае. Ёсць там убогія са сваёй культурай, сваімі планамі і магчымасцямі. Нават асобы, якіх могуць крытыкаваць за іх памылкі, могуць штосьці прапанаваць і нельга гэтага змарнаваць. Гэта адзінства народаў, якія ва універсальным парадку захоўваюць свае індывідуальныя рысы. Гэта сукупнасць асобаў у грамадстве, якое імкнецца да агульнага дабра, якое сапраўды ахоплівае ўсіх.

237. Нам, хрысціянам, гэты прынцып таксама кажа пра паўнату і інтэгральнасць Евангелля, якое перадае нам Касцёл і пасылае нас абвяшчаць яго. Яго поўнае багацце ахоплівае выкладчыкаў універсітэту і працаўнікоў, прадпрымальнікаў і артыстаў. «Папулярная містыка» па-свойму прымае ўсё Евангелле і ўцелаўляе яго ў формы малітвы, братэрства, справядлівасці, ба-рацьбы і свята. Добрай Навіной з’яўляецца радасць Айца, які не хоча, каб згубіўся хтосьці з Яго найменшых. Так нараджаецца радасць у Добрага Пастыра, які знахо-дзіць згубленую авечку і вядзе яе ў аўчарню. Евангелле — гэта закваска, якая квасіць усё цеста, а таксама горад, які яснее на вяршыні гары і асвячае ўсе народы. У Евангелле ўпісаны крытэрый цэласнасці: не перастае быць Добрай Навіной, пакуль не будзе абвешчана ўсім, пакуль не прынясе плён і не вылечыць усе вымярэнні чалавека і пакуль не з’яднае ўсіх людзей пры стале Валадарства. Паўната перавышае частку.

IV. Грамадскі дыялог як спрыянне спакою

238. Евангелізацыя прадугледжвае таксама шлях дыялогу. У наш час для Касцёла існуюць тры асаблівыя асяроддзі дыялогу, у якіх ён павінен прысутнічаць, каб выканаць паслугу ў сферы поўнага развіцця чалавека і дасягнуць агульнага дабра: дыялог з дзяржавай, з грамадствам — ахоплівае дыялог з культурамі і навукай, — а таксама дыялог з іншымі веруючымі, якія належаць да Каталіцкага Касцёла. Ва ўсіх выпадках «Касцёл прамаўляе на падставе святла, якое дае яму вера»[186], уносіць свой досвед, набыты на працягу двух тысяч гадоў, заўсёды захоўвае ў памяці жыццё і цярпенні людзей. Нягледзячы на тое, што гэты досвед часта выходзіць па-за межы чалавечага розуму, яно мае аднак вялікае значэнне і можа ўзбагаціць тых, хто не верыць, а так-сама прычыніцца да пашырэння даляглядаў чалавечага мыслення.

239. Касцёл абвяшчае «добрую навіну аб спакоі» ( 6, 15) і адкрыты на супрацоўніцтва з усімі нацыянальнымі і міжнароднымі ўладамі, каб клапаціцца пра універсальнае дабро. Абвяшчаючы Езуса Хрыста, які з’яўляецца спакоем (пар.  2, 14), новая евангелізацыя горача

заахвочвае кожнага ахрышчанага стаць прыладаю спакою і верагодным сведкам жыцця ў па-яднанні[187]. Настаў час, каб абапіраючыся на культуру, якая бачыць вартасць дыялогу як формы сустрэчы, імкнуцца да згоды і да агульных пастаноў, не аддзяляючыся ад клопату аб справядлівым грамадстве, якое мае памяць і нікога не выключае. Галоўным аўтарам, гістарычным суб’ектам гэтага працэсу з’яўляюцца людзі і іх культура, не нейкі клас, група ці эліта. Мы не патрабуем праектаў, падрыхтаваных нямногімі і скіраваных да нямногіх, да асветленай меншасці, якая хоча мець манаполію на выражэнне агульных пачуццяў народаў ці грамадстваў. Маецца на ўвазе дамоўленасць, каб жыць разам, грамадская і культурная згода.

240. Дзяржавы павінны клапаціцца аб агульным дабры грамадства і падтрымліваць яго[188]. На падставе прынцыпу дапамогі і салідарнасці, прыкладваючы значныя намаганні да палітычнага дыялогу і імкнучы-ся да ўзгаднення, клапоцячыся пра інтэгральнае развіццё ўсіх, дзяржава выконвае фундаментальную ролю, якая не можа быць даручана нікому іншаму. Гэтая роля, у дадзеных абставінах, патрабуе глыбокай грамадскай пакоры.

241. У дыялогу з дзяржавай і грамадствам Касцёл не мае гатовых рашэнняў па ўсіх канкрэтных пытаннях. Аднак, разам з іншымі грамадскімі сіламі, падтрымлівае тыя прапановы, якія найбольш адпавядаюць годнасці чалавечай асобы і агульнаму дабру. Касцёл заўсёды прапануе выразныя і галоўныя каштоўнасці чалавечага жыцця, каб можна было іх прымяніць у палітычным жыцці.

,

242. Часткай евангелізацыйнай дзейнасці з’яўляецца таксама дыялог паміж навукай і верай, які спрыяе спакою[189]. Сцыентызм і пазітывізм не прызнаюць «каштоўнасці іншых формаў пазнання, акрамя формаў, уласцівых дакладным навукам»[190]. Касцёл прапануе іншы шлях, які патрабуе сінтэзу адказнага карыстання метадамі, уласцівымі эмпірычным навукам, з іншымі сферамі ведаў, такімі як філасофія, тэалогія, з верай, якая ўзносіць чалавечы розум аж да таямніцы, што выходзіць па-за межы чалавечай натуры і розуму. Вера не баіцца розуму, бо «і святло веры, і святло розуму паходзяць ад Бога»[191] і не могуць адно аднаму супярэчыць. Евангелізацыя зважае на навуковы прагрэс, каб асвятліць яго святлом веры і натуральнага закону, каб заўсёды захоўваўся галоўны характар і найбольшая каштоўнасць чалавечай асобы на ўсіх этапах яе жыцця. Усё грамадства можа абагаціцца дзякуючы гэтаму дыялогу, які адкрывае новыя гарызонты перад мысленнем і пашырае магчымасці розуму. Гэта такса-ма шлях спакою і гармоніі.

243. Касцёл не мае намеру стрымліваць выдатнае развіццё навукі. Наадварот, радуецца дасягненням і карыстаецца імі, прызнаючы вялізны патэнцыял, якім Бог адарыў чалавечы розум. Калі развіццё навук, трымаючыся акадэмічных патрабаванняў у сферы іх спецыфічнага прадмету, робіць верагодным нейкі канкрэтны вынік, якога не можа аспрэчыць

розум, то і вера гэтага не аспрэчвае. Тым больш веруючыя не могуць патрабаваць, каб навуковае меркаванне, якое ім падабаецца, аднак не было яшчэ дастаткова пацверджана, атрымала вартасць дагмату веры. Аднак у некаторых сітуацыях пэўныя навукоўцы выходзяць па-за фармальны прадмет сваёй дысцыпліны і спяшаюцца са сцвярджэннямі або высновамі, якія не належаць да іх сферы. У гэтым выпадку прапануецца не навука, але канкрэтная ідэалогія, якая замыкае дарогу сапраўднаму, мірнаму і плённаму дыялогу.

244. Экуменічная дзейнасць з'яўляецца адказам на малітву Пана Езуса, які просіць, «каб усе былі адно» ( 17, 21). Верагоднасць хрысціянскага закліку была б намнога большай, калі б хрысціяне пераадолелі свае падзелы і Касцёл рэалізаваў уласцівую яму паўнату «каталіцкасці ў тых яго дзецях, якія праз хрост да яго належаць, але адлучыліся ад поўнай еднасці (*communio*) з ім»[192]. Мы павінны заўсёды памятаць, што з'яўляемся пілігрымамі і што пілігрымуем разам. Таму трэба даручыць сваё сэрца з даверам свайму спадарожніку, пазбягаючы прадузятасці і зважаючы толькі на тое, да чаго імкнемся: да спакою ў абліччы адзінага Бога. У даручэнні сябе іншаму ёсць штосьці з ручной працы, спакой — гэта як ручная праца. Езус сказаў нам: «Шчаслівыя міратворцы» ( 5, 9). У гэтай працы, таксама сярод нас, здзяйсняецца даўняе прароцтва: «перакуюць мячы свае на плугі і дзіды свае на сярпы» ( 2, 4).

245. У гэтым святле экуменізм з'яўляецца ўкладам у адзінства чалавечай сям'і. Прысутнасць на Сінодзе патрыярха Канстанцінопаля, Яго святасці Барталамея I, а таксама арцыбіскупа Кентэрберыйскага, вялебнага Дугласа Уільямся[193], была сапраўдным Божым дарам і каштоўным сведчаннем.

246. Улічваючы цяжар антысведчання, якое мае ў сабе падзел паміж хрысціянамі, асабліва ў Азіі і Афрыцы, пошук шляхоў еднасці становіцца неабходным. Місіянеры на гэтых кантынентах пастаянна кажуць пра крытыку, нараканні і насмешкі, з якімі яны сустракаюцца з прычыны дрэннага сведчання, якое даюць падзеленыя хрысціяне. Калі засяродзімся на перакананнях, якія нас яднаюць, і будзем памятаць аб прынцыпе іерархіі ісцін, можам хутка ісці ў напрамку супольных формаў абвяшчэння паслання, служэння і сведчання. Мы не можам заставацца абыякавымі да вялізнай колькасці тых, хто не прыняў закліку Езуса Хрыста. Таму дзейнасць на карысць еднасці, якая робіць больш лёгкім прыняцце Езуса Хрыста, перастае быць толькі дыпламатыяй або прымусовым дзеяннем, але ператвараецца ў неад'емны шлях евангелізацыі. Знакі падзелу паміж хрысціянамі ў краінах, дзе існуе насілле, прычыняюцца да іншага насілля з боку тых, хто павінен быць дзейснай рошчынай спакою. Ёсць столькі каштоўных рэчаў, якія нас лучаць! І калі мы сапраўды верым у свабоднае і шчодрае дзеянне Духа, як многаму мы можам навучыцца ад іншых! Не маецца на ўвазе толькі атрыманне інфармацыі ад іншых, каб лепш іх пазнаць, але збіранне таго, што Дух пасеяў у іх як дар таксама для нас. Вось толькі адзін прыклад: у дыялогу з братамі

праваслаўнымі мы, католікі, маем магчымасць навучыцца чамусьці большаму ў сэнсе калегіяльнасці біскупаў і іх сінадальнага вопыту. Праз абмен дарамі Дух можа нас штораз больш весці да праўды і дабра.

247. Асаблівы позірк мы скіроўваем на габрэйскі народ, Запавет з Богам якога ніколі не быў знішчаны, бо «дары і пакліканне Божае нязменныя» ( 11, 29). Касцёл, які падзяляе з юдаізмам важную частку Святых Пісанняў, лічыць народ Запавету і яго веру святым фундаментам сваёй хрысціянскай тоеснасці (пар.  11, 16-18). Будучы хрысціянамі, не можам лічыць юдаізм чужой рэлігіяй, і не можам залічыць габрэяў да тых, хто пакліканы пакінуць ідалаў, каб навярнуцца да сапраўднага Бога (пар. *1*  1, 9). Разам з імі мы верым у адзінага Бога, які дзейнічае ў гісторыі, і прымаем з імі агульнае абʼяўленае слова.

248. Дыялог і сяброўства з сынамі Ізраэля зʼяўляец-ца часткай жыцця вучняў Езуса. Сардэчнае пачуццё, якое паглыбілася, заахвочвае нас шчыра і горка аплакваць жудасныя ганенні, якім яны падвяргаліся і падвяр-гаюцца, асабліва тыя, у якіх удзельнічаюць або ўдзельнічалі хрысціяне.

249. Бог надалей дзейнічае ў народзе Старога Запавету і чыніць, што існуюць скарбы мудрасці, якія вынікаюць з яго сустрэчы з Божым словам. Таму Касцёл таксама абагачаецца, калі прымае каштоўнасці юдаізму. Хоць некаторыя хрысціянскія перакананні юдаізм не можа прыняць, Касцёл не можа адмовіцца ад абвяшчэння Езуса як Пана і Месіі, існуе глыбокая камплементарнасць, якая дазваляе нам чытаць разам тэксты Бібліі Габрэйскай і дапамагаць адно аднаму ў вывучэнні багацця слова, як і падзяляць многія этычныя перакананні і агульны клопат аб справядлівасці і развіцці народаў.

250. Адкрытасць у праўдзе і любові павінна характарызаваць дыялог з вызнаўцамі іншых нехрысціянскіх рэлігій нягледзячы на розныя перашкоды і цяжкасці, асабліва на фундаменталізм з абодвух бакоў. Міжрэлігійны дыялог зʼяўляецца неабходнай умовай спакою ў свеце і таму гэта абавязак хрысціянаў, а таксама іншых рэлігійных супольнасцяў. Такі дыялог — гэта перадусім размова аб чалавечым жыцці ці, як кажуць біскупы Індыі, «гэта пастава адкрытасці на іншых, гэта дзяленне з імі радасці і суму»[194]. Так мы вучымся прымаць іншых з іх адрозным спосабам існавання, мыслення і выражэння. Дзякуючы гэтаму метаду мы можам разам прыняць на сябе абавязак служэння справядлівасці і спакою, які павінен стаць асноўным крытэрыем кожнага абмену. Дыялог, у якім мы шукаем грамадскага спакою і справядлівасці, сам па сабе, незалежна ад выключна прагматычнага аспекту, зʼяўляецца этычным дзеяннем і стварае новыя грамадскія ўмовы. Намаганні, якія прыкладваюцца для разгляду пэўнай тэмы, могуць ператварыцца ў працэс, у якім праз

слуханне іншага абодва бакі знаходзяць ачышчэнне і багацце. Таму намаганні на карысць дыялогу з’яўляюцца праяўленнем любові да праўды.

251. У гэтым дыялогу, заўсёды культурным і сардэчным, ніколі нельга забываць пра галоўную сувязь паміж дыялогам і пасланнем, якое заахвочвае Касцёл утрымліваць і паглыбляць адносіны з нехрысціянамі[195]. Сінкрэтызм у справе паяднання стаў бы па сутнасці таталітарызмам тых, якія ў жаданні паяднацца не зважаюць на адрозныя перакананні і прысвойваюць сабе права быць гаспадарамі каштоўнасцяў, якія прадстаўляюць. Сапраўдная адкрытасць прадугледжвае захаванне вернасці сваім самым глыбокім перакананням, поруч з выразнай і радаснай самабытнасцю, але «з адкрытасцю на іх разуменне ў іншых» і «з разуменнем, што дыялог можа ўзбагаціць кожнага»[196]. Не дапаможа нам дыпламатычная адкрытасць, якая згаджаецца з усім, каб пазбегнуць праблем, бо гэта было б ашуканствам іншага чалавека і адмаўленнем яго дабра, якое мы атрымалі як дар, каб шчодра падзяліц-ца ім. Евангелізацыя і міжрэлігійны дыялог, далёкія ад узаемнага супрацьстаяння, узаемна падтрымліваюцца і ажыўляюцца[197].

252. У наш час набываюць важнае значэнне адносіны з вызнаўцамі ісламу, якія сёння асабліва бачныя ў краінах з хрысціянскай традыцыяй, дзе яны могуць свабодна здзяйсняць свой культ і інтэгравацца ў грамадства. Нельга ніколі забываць, што «яны, вызнаючы сваю прыхільнасць да Абрагама, пакланяюцца разам з намі адзінаму і міласэрнаму Богу, які будзе судзіць людзей у апошні дзень»[198]. Святыя пісанні ісламу захоўваюць частку хрысціянскага вучэння; яны таксама глыбока ўшаноўваюць Езуса Хрыста і Марыю. Прыемна здзіўляе тое, як маладыя і старэйшыя, жанчыны і мужчыны, якія вызнаюць іслам, здольныя штодзённа прысвяціць час на малітву і аддана ўдзельнічаць у сваіх рэлігійных абрадах. У той жа час многія з іх глыбока перакананыя, што іх жыццё цалкам належыць Богу і што яны жывуць для Яго. Яны прызнаюць таксама неабходнасць адказваць Богу этычнымі дзеяннямі і міласэрнасцю да самых убогіх.

253. Каб весці дыялог з ісламам неабходна адпаведная фармацыя размоўцаў, і не толькі для таго, каб верна і радасна трывалі ў сваёй тоеснасці, але каб змаглі прызнаць каштоўнасці іншых, зразумець страх, які знаходзіцца ў аснове іх патрабаванняў, і распаз-наць агульныя перакананні. Мы, хрысціяне, павінны сардэчна і з пашанаю прыняць ісламскіх імігрантаў у нашых краінах і маем надзею, а таксама просім, каб і нас прынялі з пашанаю ў краінах з мусульманскай традыцыяй. Прашу, пакорна малю гэтыя краіны гарантаваць свабоду хрысціянам у здзяйсненні свайго культу і вызнанні сваёй веры, беручы пад увагу свабоду, якую маюць вызнаўцы ісламу ў краінах Захаду! У тых выпадках, якія абуджаюць нашую боязь з прычыны насілля фундаменталізму, сардэчныя адносіны да сапраўдных ісламскіх вернікаў павінны весці нас да пазбягання варожых абагульненняў, бо праўдзівы іслам і правільная інтэрпрэтацыя Карану аспрэчваюць усялякае насілле.

254. Нехрысціяне, дзякуючы бескарыслівай ініцыятыве Бога і будучы вернымі свайму

сумленню, могуць жыць, «апраўданыя ласкай Божай»[199], і такім чынам быць «злучанымі з Пасхальнай таямніцай Езуса Хрыста»[200]. Аднак з прычыны сакрамэнтальнага характару асвячальнай ласкі, Божае дзеянне ў іх скіравана да стварэння знакаў, абрадаў, святых формаў выяўлення, якія набліжаюць нехрысціянаў да супольнага распазнання дарогі, якая вядзе да Бога[201]. Яны не маюць значэння і плённасці сакрамэнтаў, устаноўленых Хрыстом, але могуць быць каналамі, якія стварае сам Дух, каб вызваліць нехрысціянаў ад атэістычнага іманэнтызму ці ад чыста індывідуальных рэлігійных адчуванняў. Той самы Дух абуджае ў кожным месцы практычныя формы мудрасці, дапамагаючы зносіць цяжкасці жыцця і жыць у большым спакоі і гармоніі. Таксама і мы, хрысціяне, можам мець карысць з гэтага ўмацаванага на працягу стагоддзяў багацця, якое можа дапамагчы нам лепш жыць нашымі канкрэтнымі перакананнямі.

255. Айцы Сіноду згадалі пра ўзнёсласць шанавання рэлігійнай свабоды, якая лічыцца фундаментальным правам чалавека[202]. Яна ахоплівае «свабоду выбару рэлігіі, якая лічыцца сапраўднай, і публічнае вызнанне сваёй веры»[203]. Здаровы плюралізм, які сапраўды паважае іншых і самі каштоўнасці, не азначае прыватызацыі рэлігіі, каб прывесці іх да маўчання ці да цемры сумлення кожнага або да замкнёнай прасторы касцёлаў, сінагог ці мячэцяў. Па сутнасці гэта былі б новыя формы дыскрымінацыі і аўтарытарнасці. Належнай павагі да меншасці агностыкаў ці няверуючых нельга парушыць заканадаўчым чынам, так што не ўлічваецца перакананне большасці веруючых або ігнаруецца багацце рэлігійных традыцый. Гэта, у канчатковым варыянце, прынясе больш крыўды, чым паслужыць памяркоўнасці і спакою.

256. Калі ставіцца пытанне наконт публічнага ўплыву рэлігіі, трэба вылучыць тры формы яе перажывання. Як інтэлектуалы, так і журналісты часта выкарыстоўваюць прафанныя і мала навуковыя абагульненні, калі кажуць пра недахопы рэлігій і часта не могуць уба-чыць, што не ўсе веруючыя — і таксама не ўсе рэлігійныя аўтарытэты — аднолькавыя. Некаторыя палітыкі вы-карыстоўваюць гэтую блытаніну для апраўдання дыскрымінацыі, якая незаўважна нараджае новыя формы насілля. Часам пагарджаюць творамі, якія паўсталі на падставе перакanання, злучанага з верай, забываючы, што класічныя рэлігійныя тэксты прапануюць сэнс для ўсіх эпох, маюць матывуючую сілу, якая заўсёды адкрывае новыя перспектывы, абуджае мысленне, пашырае розум і сэрца. Яны адкідваюцца з прычыны рацыяналізму. Ці ёсць сэнс і слушнасць у тым, каб адкідаць гэтыя творы толькі таму, што яны ўзніклі ў кантэксце рэлігійных перакананняў? Яны змяшчаюць у сабе глыбокія чалавечыя прынцыпы, якія маюць рацыянальную вартасць, хоць заключаны ў сімвалах і рэлігійных дактрынах.

257. Мы, веруючыя, знаходзімся блізка тых, хто не належыць ні да якой рэлігійнай традыцыі, але шчыра шукае праўды, дабра і прыгажосці, якія для нас маюць сваё найбольшае

выяўленне і сваю крыніцу ў Богу. Мы бачым у іх каштоўных саюзнікаў у справе абароны чалавечай годнасці, у будаванні мірнага суіснавання паміж народамі і ў ахове стварэння. Асаблівым полем дзеяння з'яўляюцца гэтак званыя , як і «Дзя-дзінцы язычнікаў», дзе «веруючыя і няверуючыя могуць весці дыялог на асноўныя тэмы этыкі, мастацтва і навукі, а таксама пра пошук трансцэндэнцыі»[204]. Гэта таксама з'яўляецца шляхам спакою для нашага зраненага свету.

258. Зыходзячы з некаторых грамадскіх тэм, важных для будучыні чалавецтва, пастараюся яшчэ раз растлумачыць неад'емны грамадскі характар абвяшчэння Евангелля, каб заахвоціць усіх хрысціянаў сведчыць аб ім заўсёды ў сваіх словах, паставах і дзеяннях.

## Раздзел V

## ЕВАНГЕЛІЗАТАРЫ З ДУХАМ

259. Той, хто абвяшчае Евангелле, павінен без страху адкрыцца на дзеянне Духа Святога. У дзень Пяцідзесятніцы Дух учыніў, што Апосталы выйшлі са свайго ўкрыцця і сталі прапаведнікамі вялікіх спраў Божых, і кожны пачынае разумець іх на сваёй уласнай мове. Больш за тое, Дух Святы адорвае сілай для абвяшчэння навізны Евангелля смела (*parresia*), уголас, у кожны час і на кожным месцы, таксама супраць цячэння. Будзем заклікаць Яго сёння, умацаваныя малітвай, без якой кожнаму дзеянню пагражае пустата і без якой заклік урэшце будзе пазбаўлены душы. Езус прагне евангелізатараў, якія абвяшчаюць Добрую Навіну не толькі словам, але перадусім жыццём, напоўненым прысутнасцю Бога.

260. У гэтым апошнім раздзеле не буду рабіць сінтэзу хрысціянскай духоўнасці і не буду развіваць такіх вялікіх тэм, як малітва, эўхарыстычная адарацыя або цэлебрацыя веры, наконт якіх мы ўжо маем каштоўныя тэксты Настаўніцкага Інстытуту Касцёла і славутыя працы вялікіх аўтараў. Не маю намеру замяніць і пераўзысці гэтае багацце. Прадстаўлю толькі некалькі разважанняў, якія датычаць духа новай евангелізацыі.

261. Калі мы сцвярджаем, што хтосьці мае «духа», гэта звычайна азначае нейкае ўнутранае хваляванне, якое дае імпульс, матывацыю, дадае адвагі і надае сэнс асабістаму і супольнаму дзеянню. Евангелізацыя з духам гэта не набор заданняў, якія ўспрымаюцца як цяжкі абавязак, які проста выконваецца як штосьці супярэчнае ўласным схільнасцям і жаданням. Я вельмі хацеў бы знайсці адпаведныя словы, каб заахвоціць да больш адданай евангелізацыі, радаснай, ахвярнай, смелай, заўсёды поўнай любові і здольнай захапіць іншых! З другога боку ведаю, што ніводная матывацыя не будзе дастатковай, калі ў сэрцах не палае агонь Духа. Таму евангелізацыя з духам з'яўляецца евангелізацыяй з Духам Святым, бо гэта Ён з'яўляецца душой Касцёла, які евангелізуе. Перш чым прапанаваць некаторыя матывацыі і духоўныя парады, заклікаю зноў Духа Святога. Прашу Яго прыйсці і

аднавіць, узварухнуць, дадаць імпэту для Касцёла, каб ён адважна выйшаў па-за сваё «я» дзеля евангелізацыі народаў.

I. Матывацыі для адноўленага місійнага запалу

262. Евангелізатары з духам — гэта евангелізатары, якія моляцца і працуюць. З пункту гледжання евангелізацыі не дапамагаюць ім ні містычныя прапановы без актыўнага грамадскага і місійнага ўдзелу, ні прамовы, ні грамадская і пастырская дзейнасць без духоўнасці, якая перамяняе сэрца. Частковыя і раз’яднаныя прапановы дасягаюць толькі малых груп і не маюць значнага ўплыву, бо калечаць Евангелле. Трэба заўсёды клапаціцца пра ўнутраную прастору, якая надае сэнс хрысціянскай дзейнасці і актыўнасці[205]. Без доўгіх хвілін адарацыі, малітоўнай сустрэчы са словам заданні лёгка губляюць свой сэнс, а мы адчуваем слабасць з прычыны стомы і цяжкасцяў, і імпэт гасне. Касцёл мае вялізную патрэбу дыхаць лёгкімі малітвы і вельмі радуецца, што ва ўсіх касцёльных інстытуцыях памнажаюцца малітоўныя групы, групы заступніцтва, малітоўнага чытання слова, няспыннай адарацыі Эўхарыстыі. У той жа час «трэба адкідваць спакусу духоўнасці, сканцэнтраванай на ўнутраных, індывідуальных перажываннях, якую цяжка было б пагадзіць з патрабаваннямі міласэрнасці, а нават з логікай Уцелаўлення»[206]. У гэтым тоіцца небяспека, што хвіліны малітвы стануць прычынай пазбягання місійнай дзейнасці, бо індывідуалізацыя стылю жыцця можа схіліць хрысціянаў шукаць сховішча ў нейкай фальшывай духоўнасці.

263. Карысна памятаць пра першых хрысціянаў і пра ўсіх тых братоў на працягу гісторыі, якія былі поўныя радасці, поўныя нястомнай адвагі ў абвяшчэнні слова і якія былі здольныя да вялікай вытрываласці. Некаторыя суцяшаюць сябе сцвярджэннем, што сёння цяжэй, аднак мы павінны прызнаць, што акалічнасці, якія існавалі ў Рымскай Імперыі, не спрыялі ні абвяшчэнню Евангелля, ні барацьбе за справядлівасць, ні абароне чалавечай асобы. У кожны момант гісторыі ёсць чалавечая слабасць, хваравіты клопат пра сябе, выгадны эгаізм і, урэшце, пажадлівасць, якая пагражае ўсім. Гэтая рэчаіснасць заўсёды прысутнічае пад тым ці іншым выглядам і больш звязана з чалавечай абмежаванасцю, чым з абставінамі. А таму не будзем казаць, што сёння цяжэй; проста інакш. Таму будзем вучыцца ў святых, якія былі перад намі і змагаліся з цяжкасцямі сваёй эпохі. Прапаную вам звярнуць увагу на некаторыя матывацыі, якія нам дапамогуць наследаваць іх сёння[207].

,

264. Першай матывацыяй евангелізацыі з’яўляецца любоў Езуса, якую мы прынялі, пачуццё, што мы збаўлены праз Яго, якое схіляе нас яшчэ больш любіць Яго. Але што ж гэта за любоў, якая не мае патрэбы гаварыць пра ўмілаваную асобу, паказваць яе і старацца, каб іншыя пазналі яе? Калі не адчуваем глыбокага жадання перадаваць яе, то павінны засяродзіцца на малітве, каб яна зноў нас захапіла. Мы павінны штодзённа прасіць аб Яго

ласцы, каб яна адкрыла нашае зімнае сэрца і ўзварухнула нашае летняе і павярхоўнае жыццё. Мы стаім перад Ім з адкрытым сэрцам, дазваляючы, каб Ён паглядзеў на нас. Распазнайма ж гэты позірк любові, які адкрыў Натанаэль у той дзень, калі Езус стаў і сказаў: «Я бачыў цябе, калі ты быў пад смакоўніцаю» ( 1, 48). Як жа прыемна стаяць перад Укрыжаваным або кленчыць перад Найсвяцейшым Сакрамэнтам і проста знаходзіцца перад Яго вачыма! Як жа добра пагадзіцца, каб Ён вярнуўся і дакрануўся да нашай экзістэнцыі і паслаў нас абвяшчаць Яго новае жыццё! Таму тое, што мае месца, канчаткова з'яўляецца тым, «што мы бачылі і чулі, і што абвяшчаем вам» (пар. *1* 1, 3). Найлепшай матывацыяй для абвяшчэння Евангелля з'яўляецца яго кантэмпляцыя ў любові, засяроджанне на яго старонках і чытанне яго сэрцам. Калі так набліжаемся да яго, яно здзіўляе нас сваёй прыгажосцю, зноў нас захапляе. Таму настолькі важным з'яўляецца вяртанне да кантэмпляцыйнага духу, які дазваляе нам штодзённа спасцігаць, што мы з'яўляемся адрасатамі дабра, якое робіць нас чалавечнымі, дапамагае весці новае жыццё. Няма нічога лепшага за пераказванне гэтага іншым.

265. Усё жыццё Езуса, Яго стаўленне да ўбогіх, Яго жэсты, Яго паслядоўнасць, Яго штодзённая звычайная ахвярнасць, і, урэшце, Яго абсалютнае прысвячэнне сябе дзеля адкуплення — усё гэта з'яўляецца каштоўным і прамаўляе да жыцця кожнага. Кожны раз, калі хтосьці гэта адкрывае, пераконваецца, што Езус ёсць тым, каго патрабуюць іншыя, нават не ведаючы Яго: «Тое, чаму вы, не ведаючы, пакланяецеся, я абвяшчаю вам» ( 17, 23). Часам мы губляем місійны энтузіязм, забываючы, што Евангелле адказвае на самыя глыбо-кія патрэбы асобаў, бо ўсе мы створаны для таго, што нам прапануе Евангелле: для сяброўства з Езусам і для братэрскай любові. Калі зможам адпаведна і прыгожа выказаць галоўны змест Евангелля, гэтае пасланне адкажа на самыя глыбокія пытанні сэрца: «месіянер перакананы, што ў кожным чалавеку і ў кожным народзе жыве спадзяванне, можа нават і несвядомае, пазнаць праўду пра Бога, чалавека, пра дарогу вызвалення ад граху і смерці. Энтузіязм абвяшчэння Хрыста вынікае з пераканання, што гэтае спадзяванне задавольваецца»[208]. Евангелізацыйны энтузіязм грунтуецца на гэтым перакананні. Маем у распараджэнні скарб жыцця і любові, які не можа прывесці да памылкі, пасланне, якое не маніпулюе і не прыводзіць да адчаю. Маецца на ўвазе адказ, які закранае глыбіні чалавека, які можа яго падтрымаць і падняць. Гэтая праўда не старэе, бо яна здольная пранікнуць туды, куды ніштo не можа дасягнуць. Наш бясконцы сум можа быць вылечаны толькі бясконцай любоўю.

266. Аднак такое перакананне ўмацоўваецца праз пастаяннае аднаўленне ўласнага досведу радасці Яго сяброўству і Яго пасланню. Немагчыма вытрымаць у поўнай запалу евангелізацыі, калі мы не перакананыя на падставе свайго досведу, што пазнаць Езуса — гэта не тое самае, што не ведаць Яго; што ісці з Ім — гэта не тое самае, што ісці навобмацак; што слухаць Яго — гэта не тое самае, што ігнараваць Ягоныя словы; што сузіраць Яго, адараваць і адпачыць у Ім — гэта не тое самае, што не рабіць гэтага. Адна справа будаваць свет з Яго Евангеллем, а другая — рабіць гэта на ўласны розум. Мы добра

ведаем, што жыццё з Езусам становіцца больш поўным і што з Ім лягчэй знайсці сэнс усяго. Таму мы і евангелізуем. Сапраўдны місіянер, які ніколі не перастае быць вучнем, ведае, што Езус ідзе з ім, размаўляе з ім, дыхае з ім, працуе з ім. Ён заўважае жывога Езуса, які спадарожнічае яму ва ўсёй місійнай справе. Калі хто не спасцігне гэтай сутнасці місійнай дзейнасці, хутка губляе энтузіязм і ўпэўненасць у тым, што пераказвае, яму не хапае сілы і захаплення. Асоба, якая не мае пераканання і не з’яўляецца энтузіястам, якая не ўпэўнена ў тым, што абвяшчае, і не закаханая ў гэта, не пераканае нікога.

267. З’яднаныя з Езусам, будзем шукаць таго, чаго шукае Ён, любіць тое, што любіць Ён. Тое, чаго мы шукаем, — гэта хвала Айца, мы жывём і дзейнічаем «дзеля хвалы Яго праслаўленай ласкі» (пар.  1, 6). Калі хочам да канца і вытрывала прысвяціць сябе, павінны адкінуць усялякую іншую матывацыю. Гэта канчатковая, найглыбейшая і найбольшая прычына, слушнасць і канчатковы сэнс усяго астатняга. Маецца на ўвазе хвала Айца, якой шукаў Езус на працягу ўсяго свайго зямнога жыцця. Ён — спрадвечна шчаслівы Сын ва ўсім сваім існаванні «ва ўлонні Айца» ( 1, 18). Мы з’яўляемся місіянерамі перадусім таму, што Езус нам сказаў: «Гэтым будзе ўслаўлены Айцец Мой, калі вы прынясеце багаты плён» ( 15, 8). Незалежна ад таго, ці гэта нам падабаецца, ці не, ці нас цікавіць, ці не, ці нам гэта выгадна, ці не, незалежна ад нашых абмежаваных жаданняў, нашага разумення і нашых матывацый мы евангелізуем дзеля большай хвалы Айца, які нас любіць.

—

268. Божае слова заахвочвае нас прызнаць тое, што мы — народ: «калісьці не народ, а цяпер народ Божы» (*1*  2, 10). Каб быць евангелізатарамі душ, трэба раз-віць духоўнае імкненне быць бліжэй да жыцця людзей, пакуль не адкрыем, што гэта становіцца крыніцай больш глыбокай радасці. Місія лучыцца з любоўю да Езуса і аднаачасова з любоўю да Яго народу. Калі затрымліваемся перад укрыжаваным Езусам, пазнаем усю Ягоную любоў, якая нас узносіць і падтрымлівае. Але стоячы перад Ім, калі мы не сляпыя, пачынаем заўважаць, што погляд Езуса становіцца больш шырокім, а Ён, поўны пачуцця і запалу, звяртаецца да свайго народу. Так мы адкрываем, што Ён хоча карыстацца намі як прыладай, каб кожны раз яшчэ больш наблізіцца да свайго ўмілаванага народу. Забірае нас з народу і пасылае нас да народу, таму нельга зразумець нашай сутнасці без той прыналежнасці да Яго.

269. Сам Езус з’яўляецца прыкладам гэтага евангелізацыйнага выбару, уводзячы нас у сэрца народу. Як прыемна бачыць Яго ў такой блізкасці да ўсіх! Калі Ён з кімсьці размаўляў, глядзеў у яго вочы з вялікай, поўнай любові ўвагай: «Езус паглядзеў на яго з любоўю» (*М* 10, 21). Мы бачым, наколькі Ён даступны, калі падыходзіць да сляпога ля дарогі (пар.  10, 46-52) і калі есць і п’е з грэшнікамі (пар. *М* 2, 16), не зважаючы на тое, што Яго палічаць абжорам і п’яніцам (пар. *М* 11, 19). Мы бачым, як Ён дазваляе, каб грэшніца намасціла Яму ступні ног (пар.  7, 36-5), або калі ноччу прымае Нікадэма (пар.  3, 1-15). Ахвяраванне сябе на крыжы з’яўляецца кульмінацыйным момантам таго, што вызначала ўсё Яго існаванне. Зачараваныя

такім прыкладам, будзем глыбока інтэгравацца ў грамадства, будзем дзяліць жыццё з усімі, будзем услухоўвацца ў іх турботы, будзем матэрыяльна і духоўна супрацоўнічаць у іх патрэбах, будзем радавацца з тымі, хто радуецца, плакаць з тымі, хто плача, будзем удзельнічаць у будаванні новага свету, плячо ў плячо з іншымі.

270. Часам мы маем спакусу быць хрысціянамі, захоўваючы разумную дыстанцыю да ранаў Пана. Аднак Езус хоча, каб мы дакраналіся да людской галечы, каб мы дакраналіся да церпячага цела іншых. Чакае, што мы адмовімся ад пошуку асабістых ці калектыўных абарончых сродкаў, якія дазволяць нам захаваць дыстанцыю да сутнасці чалавечай пакуты. Хоча, каб мы сапраўды захацелі ўвайсці ў канкрэтнае жыццё іншых і пазналі моц пяшчоты. Калі так паступаем, то жыццё заўсёды цудоўна ўскладняецца, а мы перажываем глыбокае адчуванне таго, што з’яўляемся народам, што належым да народу.

271. Гэта праўда, што ў нашых адносінах са светам нас заклікаюць абгрунтаваць нашую надзею, але не як ворагі, якія крытыкуюць і асуджаюць. Мы былі вельмі выразна навучаныя рабіць гэта «лагодна, з бояззю» (*1*  3, 16), а таксама, «са свайго боку, калі магчыма, <...> у спакоі з усімі людзьмі» ( 12, 18). Мы таксама пакліканы перамагаць зло дабром (пар.  12, 21), без самаўзвышэння, лічачы «адзін аднаго вышэйшым за сябе» ( 2, 3). Сапраўды, да Апосталаў Пана ўвесь народ ставіцца з прыхільнасцю (пар.  2, 47; 4, 21. 33; 5, 13). Канешне, Езус Хрыстус хоча, каб мы былі не князямі, якія глядзяць з пагардай, але людзьмі, якія належаць да народу. Гэта не меркаванне нейкага Папы ці адзін з магчымых пастырскіх варыянтаў; маюцца на ўвазе ўказанні Божага слова, настолькі выразныя, непасрэдныя і бясспрэчныя, што не патрабуюць інтэрпрэтацый, якія пазбаўляюць іх моцы ўздзеяння. Перажываем іх «*sine glossa*», без каментарыяў. Праз гэта спазнаём місійную радасць, бо падзяляем жыццё з народам, верным Богу, імкнёмся запаліць агонь у сэрцы свету.

272. Любоў да людзей з’яўляецца духоўнай сілай, якая робіць магчымай поўную сустрэчу з Богам аж да той ступені, што калі хто не любіць брата, «жыве ў цемры» (*1*  2, 11), «застаецца ў смерці» (*1*  3, 14) і «не ведае Бога» (*1*  4, 8). Бэнэдыкт XVI сказаў, што «закрыванне вачэй на бліжняга робіць чалавека сляпым таксама і на Бога»[209] і што па сутнасці любоў з’яўляецца адзіным святлом, «якое можа заўсёды асвячаць цемру свету і дае нам адвагу жыць і дзейнічаць»[210]. Таму, калі набліжаемся да іншых з намерам знайсці ў іх дабро, падрыхтуемся духоўна да прыняцця самых прыгожых дароў Пана. Кожны раз, калі сустракаемся з іншым чалавекам у любові, апынаемся ў сітуацыі адкрыцця чагосьці новага ў Богу. Кожны раз, калі адкрываем вочы, каб убачыць іншага, вера становіцца больш асветленай для распазнання Бога. У выніку, калі хочам духоўна ўзрастаць, не можам перастаць быць місіянерамі. Заданне евангелізацыі ўзбагачае розум і сэрца, адкрывае перад намі духоўныя гарызонты, ро-біць нас чуйнымі ў распазнанні дзеяння Духа Святога, дазваляе нам выйсці з нашых абмежаваных духоўных схем. У той жа час місіянер, цалкам аддадзены сваёй працы, адчувае прыемнасць ад таго, што з’яўляецца крыніцай, якая разліваецца і асвяжае іншых. Місіянерам можа быць толькі той, хто добра сябе адчувае, калі

імкнецца ўбачыць дабро ў іншых, хто жадае іншым шчасця. Гэтая адкрытасць сэрца з'яўляецца крыніцай шчасця, бо «больш шчасця ў тым, каб даваць, чым у тым, каб браць» ( 20, 35). Не будзем жыць лепш, уцякаючы ад іншых, хаваючыся, не жадаючы дзяліцца і замыкаючыся ў сваім камфорце. Гэта нішто іншае, як павольнае самагубства.

273. Місія ў сэрцы народу не з'яўляецца часткай майго жыцця і аздобаю, якую магу зняць, гэта не дадатак і не яшчэ адна хвіліна жыцця. Яна ёсць тым, чаго я не магу выкараніць з сябе, калі не хачу сябе знішчыць.- Маё прызыначэнне ў гэтым свеце — быць місіяй, і таму я знаходжуся ў гэтым свеце. Трэба прыняць саміх сябе як пазначаных агнём гэтай місіі асвятлення, благаслаўлення, ажыўлення, узняцця, аздараўлення, вызвалення. У гэтым аб'яўляецца лекар душ, настаўнік душ, палітык душ, той, хто вырашыў у глыбіні свайго сэрца быць з іншымі, а таксама для іншых. Аднак калі хтосьці з аднаго боку ставіць свой абавязак, а з другога боку адасобленае ўласнае жыццё, тады ўсё становіцца шэрым, а ён сам няспынна будзе шукаць прызнання або зоймецца абаронай уласных патрэбаў. Ён перастане быць народам.

274. Каб дзяліць жыццё з народам і ахвяраваць сябе, мы павінны таксама прызнаць, што кожная асоба вартая нашай ахвяры. Не з увагі на фізічны выгляд, на здольнасці, на мову, на менталітэт, не з увагі на прыемнасць, якую можа нам даць, але таму, што з'яўляецца справай Бога, Яго стварэннем. Ён стварыў яе паводле свайго вобраза і ў нейкай ступені яна з'яўляецца адлюстраваннем Яго хвалы. Кожны чалавек з'яўляецца прадметам бясконцай пяшчоты Пана, і Ён прабывае ў яго жыцці. Езус Хрыстус праліў сваю каштоўную кроў на крыжы за гэтую асобу. Незалежна ад якіх-небудзь выдуманых прычын, кожны з'яўляецца бязмерна святым і заслугоўвае на нашую любоў і нашую ахвяру. Таму, калі мне ўдасца аблегчыць жыццё толькі адной асобы, гэтага ўжо дастаткова, каб апраўдаць дар майго жыцця. Прыгожа, калі мы з'яўляемся верным народам Бога. Мы дасягае паўнаты, калі знішчаем перашкоды, а нашае сэрца напаўняецца тварамі і імёнамі!

275. У трэцім раздзеле мы разважалі пра недахоп глыбокай духоўнасці, што ў сваю чаргу выяўляецца ў пісімізме, фаталізме і абыякавасці. Некаторыя асобы не ўдзельнічаюць у місіі, бо лічаць, што нічога нельга змяніць, а таму кожны высілак дарэмны. Разважаюць так: «Дзеля чаго я павінен пазбаўляць сябе маіх выгод і прыемнасцяў, калі не бачу ніякага выніку?» З такім менталітэтам стаць месіянерам немагчыма. Такая пастава з'яўляецца шкодным апраўданнем замкнутас-ці ў выгодах, у гультайстве, у суме, пазбаўленым задавальнення, у эгаістычнай пустаце. Маецца на ўвазе самаразбуральная пастава, бо «чалавек не можа жыць без надзеі: яго жыццё страціла б без яе ўсялякае значэнне і стала б невыносным»[211]. Калі лічым, што нічога не зменіцца, прыгадаем, што Езус Хрыстус запанаваў над грахом і смерцю, што Ён поўны моцы. Езус Хрыстус сапраўды жыве. У адваротным выпадку, «калі Хрыстус не ўваскрос, то марнае і прапаведаванне нашае» (*1* 15,

14). Евангелле кажа нам, што калі вучні пайшлі прапаведаваць Евангелле, «Пан садзейнічаў ім і пацвярджаў слова знакамі» ( 16, 20).

276. Яго ўваскрасенне не належыць да мінулага; мае жыццядайную сілу, якая напаўняе свет. Там, дзе ўсё здаецца мёртвым, з усіх бакоў з’яўляюцца зноў парасткі ўваскрасення. Гэтая сіла не мае сабе роўных. Праўда, што неаднойчы здаецца, быццам бы Бог не існуе: бачым несправядлівасць, злосць, абыякавасць і жорсткасць, якія не саступаюць. Аднак пэўным ёсць і тое, што сярод цемры заўсёды пачынае вырастаць штосьці новае, што пазней ці раней прыносіць плён. На выраўнаным полі зноў паўстае жыццё, упартае і непераможнае. Ёсць шмат зла, аднак дабро заўсёды вяртаецца, вырастае і пашыраецца. Штодзённа ў свеце нараджаецца прыгажосць, адроджаная і ўмацаваная навальніцамі гісторыі. Зноў з’яўляюцца каштоўнасці ў новых формах, і чалавек сапраўды шмат разоў паўставаў з сітуацый, якія здаваліся няўхільнымі. Вось сіла ўваскрасення, і кожны евангелізатар з’яўляецца прыладаю гэтага дынамізму.

277. Няспынна з’яўляюцца новыя цяжкасці, адчуванне пройгрышу, чалавечай мізэрнасці, што прычыняе шмат зла. Мы ўсе ведаем, што часам выкананне задання не прыносіць задавальнення, якога мы чакалі, вынікі з’яўляюцца знікомымі, змены адбываюцца паволі і чалавек паддаецца спакусе стомы. Аднак гэта не тое самае, калі хтосьці апускае рукі часова з прычыны стомленасці, а хтосьці іншы канчаткова, паддаючыся хранічнай незадаволенасці і ляноце, якая спусташае душу. Можа здарыцца, што сэрца стоміцца ад барацьбы, бо ў выніку чалавек шукае самога сябе, шукаючы кар’еры, прызнання, апладысментаў, узнагарод і становішча; некаторыя не апускаюць рук, аднак яны не маюць ужо запалу, не хапае ім уваскрасення. Так Евангелле, якое з’яўляецца найпрыгажэйшым заклікам, які мае ў распараджэнні свет, становіцца пахаваным пад шматлікімі апраўданнямі.

278. Верыць — значыць верыць Яму, верыць, што праўдай ёсць тое, што Ён нас любіць, што жыве, што здольны ўваходзіць патаемна, што нас не пакідае, што перамяняе зло ў дабро сваёй моцаю і бясконцай крэатыўнасцю. Значыць верыць, што Ён як пераможца ідзе праз гісторыю, а разам з Ім ідуць Яго «пакліканыя, выбраныя і верныя» ( 17, 14). Мы верым Евангеллю, якое кажа, што Божае Валадарства ўжо ёсць у свеце, разрастаецца тут і там рознымі спосабамі: як малое зерне, якое можа ператварыцца ў вялікую расліну (пар.  13, 31-32), як жменя закваскі, якая квасіць вялікую масу (пар. *М* 13, 33), і як добрае насенне, якое расце сярод пустазелля (пар. *М* 13, 24-30) і можа нас заўсё-ды прыемна здзівіць. Прысутнічае, прыходзіць нано-ва, змагаецца, каб зноў зацвісці. Дзякуючы ўваскрасенню Хрыста ў кожным месцы з’яўляюцца зародкі гэтага новага свету, і, нават калі будуць зрэзаныя, вырастуць нанова, бо ўваскрасенне Пана пранікла ўжо ў схаваныя куткі гісторыі, бо не надарма ўваскрос Езус. Не пакідайма гэтага маршу жывой надзеі!

279. Паколькі мы не заўсёды заўважаем гэтыя зародкі, нестае нам унутранай упэўненасці, а менавіта перакanання, што Бог дзейнічае ў розных абставінах, нават сярод бачных няўдач,

бо «мы маем скарб у гліняных начыннях» (*2* 4, 7). Гэтую ўпэўненасць мы называем «адчуваннем таямніцы». Гэта азначае поўнае пераканання веданне, што калі хтосьці ахвяруе сябе і аддае сябе ў любові Богу, напэўна прынясе багаты плён (пар. 15, 5). Такая плоднасць часта нябачная, непрыкметная, яе нельга падлічыць. Хтосьці перакананы, што яго жыццё прыносіць плён, але не хоча ведаць як, дзе і калі. Упэўнены, што не згубіцца ніводзін яго ўчынак, здзейснены з любові, не згубіцца ніводзін шчыры клопат пра іншых, не згубіцца ніводзін чын любові адносна Бога, не згубіцца ніводная ахвярная стома, не згубіцца ніводнае балючае цярпенне. Гэта ўсё кружыць па свеце як жыццёвая сіла. Часам нам здаецца, што мы прыкладваем намаганні і не атрымліваем ніякага выніку, аднак місія — гэта не нейкая справа ці прадпрымальніцкі праект, гэта не арганізацыя, што належыць да пазаўрадавых струтур, гэта не спектакль, каб можна было падлічыць, колькі людзей у ім прыняло ўдзел дзякуючы нашай прапагандзе; гэта штосьці больш глыбокае, што перавышае ўсялякую меру. Магчыма, Пан выкарыстае нашую актыўнасць, каб удзя-ліць благаслаўленне ў іншым месцы свету, куды мы ніколі не пойдзем. Дух Святы дзейнічае, як хоча, калі хоча і дзе хоча; мы ж аддаем саміх сябе, не спадзеючыся атрымаць бачныя вынікі. Толькі ведаем, што нашае прысвячэнне сябе з'яўляецца неабходным. Навучымся ж адпачываць у пяшчотных абдымках Айца, сярод нашага ахвярнага і творчага ўдзелу. Пойдзем наперад, прыкладзем усе свае намаганні, але дазволім, каб гэта Ён учыніў нашыя высілкі настолькі плённымі, наколькі Яму падабаецца.

280. Каб падтрымаць місійны запал, патрэбны давер да Духа Святога, бо «Дух дапамагае ў слабасцях нашых» ( 8, 26). Аднак такі ахвярны давер павінен мець ежу і таму мы павінны няспынна заклікаць Яго. Ён можа аздаравіць усё, што нас робіць слабымі ў выкананні місійнага задання. Гэта праўда, што ад даверу да нябачнага можа закружыцца галава: гэта нешта падобнае да акунання ў мора, калі мы не ведаем, што нас сустрэне. Я сам неаднаразова адчуваў гэта. Аднак няма большай свабоды за тую, калі мы дазваляем Духу Святому весці нас, адмаўляючыся ад разліку і кантролю над усім, і дазваляючы, каб Ён нас асвятляў, вёў, кіраваў намі і абуджаў нас так, як сам хоча. Ён добра ведае, што неабходна ў кожны перыяд і ў кожны момант. Гэта значыць быць плоднымі таямнічым чынам!

281. Існуе форма малітвы, якая асабліва схіляе нас прысвяціць сябе евангелізацыі, і дае нам матыў клапаціцца пра дабро для іншых: маецца на ўвазе заступніцтва. Заглянем на хвіліну ў душу вялікага евангелізатара, якім быў св. Павел, каб убачыць, як выглядае яго малітва. У яго малітве было шмат асобаў: «Заўсёды кожную малітву сваю за ўсіх вас з радасцю ўзношу, <…> бо я маю вас у сэрцы сваім» ( 1, 4. 7). Такім чынам адкрываем, што заступніцтва за іншых не аддаляе нас ад сапраўднай кантэмпляцыі, бо кантэмпляцыя, якая занядбоўвае іншых, — гэта ашуканства.

282. Гэтая пастава мае таксама форму падзякі Богу за іншых. «Найперш дзякую Богу майму

праз Езуса Хрыста за ўсіх вас» ( 1, 8). Маецца на ўвазе пастаянная падзяка: « дзякую Богу майму за вас дзеля ласкі Божай, дадзенай вам у Хрысце Езусе» (*1* 1, 4). «Дзякую Богу майму пра вас» ( 1, 3). Гэта не позірк, поўны недаверу, негатыўны і без надзеі, але позірк духоўны, позірк глыбокай веры — гэта ён пазнае, што здзяйсняе ў іх Бог. Адначасова маецца на ўвазе ўдзячнасць, якая нараджаецца ў сапраўды чулым да іншых сэрцы. Такім чынам, калі праз малітву сэрца евангелізатара становіцца больш шчодрым, бо вызваляецца ад ізаляванай, замкнёнай свядомасці, ён прагне чыніць дабро і падзяляць жыццё з іншымі.

283. Вялікія Божыя людзі былі вялікімі заступнікамі іншых. Заступніцтва — гэта як «закваска ва ўлонні Найсвяцейшай Тройцы». Гэта занурэнне ў Айцу і адкрыццё новых вымярэнняў, якія асвятляюць канкрэтныя сітуацыі і змяняюць іх. Можам сказаць, што сэрца Бога ўзрушваецца ад заступніцтва, аднак на самой справе Ён заўсёды трымае нас за руку, а сваім заступніцтвам мы можам дасягнуць таго, што Яго моц, Яго любоў і Яго вернасць яшчэ больш выразна адкрыюцца Яго народу.

II. Марыя, Маці евангелізацыі

284. Разам з Духам Святым сярод народу заўсёды прысутнічае Марыя. Яна збірала вучняў, каб заклікаць- Яго (пар. 1, 14), і праз гэта ўчыніла магчымым мі-сійны выбух, які адбыўся ў дзень Пяцідзесятніцы. Яна з’яўляецца Маці Касцёла, які евангелізуе, і без Яе мы сапраўды не зможам зразумець дух новай евангелізацыі.

285. Калі на крыжы Езус у сваім целе цярпеў драматычную сустрэчу паміж грахом свету і Божай міласэрнасцю, мог адчуць каля свайго падножжа суцяшальную прысутнасць Маці і сябра. У гэтую асаблівую хвіліну, перш чым споўнілася даручаная Яму Айцом справа, Езус сказаў Марыі: «Жанчына, гэта сын Твой». Затым сказаў умілаванаму сябру: «Гэта маці твая» ( 19, 26-27). Гэтыя словы Езуса, сказаныя перад смерцю, не выяўляюць спачувальнай заклапочанасці пра сваю маці, але з’яўляюцца перадусім пэўнай формулай аб’яўлення, якая прадстаўляе таямніцу асаблівай збаўчай місіі. Езус пакінуў нам сваю Маці як нашую Маці. Толькі пасля гэтага Езус мог зразумець, што «ўсё споўнілася» ( 19, 28). Каля падножжа крыжа, у кульмінацыйны час новага стварэння, Хрыстус вядзе нас да Марыі. Вядзе нас да Яе, бо не хоча, каб мы крочылі без маці, а народ бачыць у гэтым матчыным вобразе ўсе таямніцы Евангелля. Пан не хацеў пакінуць Касцёл без гэтага жаночага вобразу. Яна, якая нарадзіла Яго з такой глыбокай верай, ідзе таксама «з астатнімі яе нашчадкамі, якія захоўваюць запаведзі Бога і маюць сведчанне Езуса» ( 12, 17). Цесная сувязь паміж Марыяй, Касцёлам і кожным вернікам, зыходзячы з таго, што кожны па-рознаму нараджае Хрыста, была цудоўна выражана бл. Ісаакам дэ Стэла: «Натхнёныя выказванні Святога Пісання датычаць у асноўным дзевы-маці, гэ-та значыць Касцёла, датычаць таксама і Марыі Дзевы. <…> Таксама і кожная верная душа з’яўляецца абранніцай Божага Слова і маці

Хрыста, Яго дачкой і сястрой, яна дзявочая і плодная. <…> Ва ўлонні Марыі Хрыстус прабываў дзевяць месяцаў. Аж да канца свету трывае ў святыні веры Касцёла. У святыні душы, праз пазнанне і любоў, Ён будзе трываць вечна»[212].

286. Марыя з’яўляецца той, якая можа перамяніць стайню для жывёл у дом Езуса, з простымі пялюшкамі і з вялізнай пяшчотай. Яна — слуга Айца, якая ўзрушваецца пры праслаўленні. Марыя з’яўляецца заўсёды ўважлівай сяброўкай, якая чувае і клапоціцца, каб хапіла віна ў нашым жыцці. Яна тая, хто мае сэрца, прабітае мячом, якая разумее ўсе цярпенні. Як Маці ўсіх, ёсць знакам надзеі для народаў, якія церпяць боль народзінаў, пакуль не з’явіцца справядлівасць. Яна — місіянерка, якая набліжаецца да нас, каб спадарожнічаць нам у жыцці, адкрываючы сэрца на веру сваім матчыным пачуццём. Як сапраўдная маці, ідзе з намі, змагаецца разам з намі і няспынна пашырае блізкасць Божай любові. Дзякуючы розным Марыйным набажэнствам, звязаным у асноўным з санктуарыямі, Яна ўключана ў гісторыю кожнага народу, які прыняў Евангелле, і ўтварае частку яго гістарычнай самабытнасці. Многія хрысціянскія бацькі просяць аб хросце сваіх дзяцей у Марыйных санктуарыях, і праз гэта выяўляюць веру ў мацярынскае дзеянне Марыі, якая нараджае новых дзяцей для Пана. Гэта там, у санктуарыях, можна адчуць, як Марыя збірае вакол сябе дзяцей, якія з такімі цяжкасцямі пілігрымуюць, каб Яе ўбачыць і каб Яна паглядзела на іх. Яны знаходзяць там сілу, якую дае Бог, каб зносіць цярпенні і жыццёвыя нягоды. Як св. Яну Дзіега, Марыя ахвяруе ім пяшчоту свайго мацярынскага суцяшэння і кажа ім: «Няхай не трывожыцца тваё сэрца <…>. Ці ж гэта не я з’яўляюся тваёй Маці?»[213].

287. Жывую Маці Евангелля просім аб заступніцтве, каб запрашэнне да новага этапу евангелізацыі было прынятае ўсёй супольнасцю Касцёла. Яна з’яўляецца жанчынай веры, якая ідзе ў веры[214], а «Яе выключная пілігрымка веры надалей з’яўляецца зыходным пунктам для Касцёла»[215]. Яна дазволіла Духу Святому весці сябе па шляху веры да служэння і плоднасці. Сёння скіроўваю да Яе свой позірк, каб Яна дапамагла нам абвяшчаць усё пасланне збаўлення і каб новыя вучні станавіліся евангелізатарамі[216]. У гэтай пілігрымцы евангелізацыі ёсць таксама перыяды бясплоднасці, хавання, а нават нейкай стомленасці, што таксама перажывала Марыя ў гады, праведзеныя ў Назарэце, калі Езус падрастаў: «Гэта пачатак Евангелля, гэта значыць добрай, раднасай навіны. Аднак няцяжка заўважыць у ім таксама своеасаблівую працу сэрца, якая звязана з „цёмнай ноччу веры” — кажучы словамі св. Яна ад Крыжа — быццам з „заслонай”, праз якую належыць набліжацца да Нябачнага і размаўляць з таямніцай. Такім чынам Марыя на працягу некалькіх гадоў размаўляе з таямніцай свайго Сына і ідзе наперад у сваёй пілігрымцы веры »[217].

288. У евангелізацыйнай дзейнасці Касцёла існуе Марыйны стыль. Кожны раз, калі мы глядзім на Марыю, пачынаем зноў верыць у пераможную моц далікатнасці і чуласці. У Ёй

заўважаем, што пакора і далікатнасць — гэта не цноты слабых, але моцных, якія не імкнуцца дрэнна ставіцца да іншых, каб адчуваць сваю перавагу. Гледзячы на Яе, мы адкрываем, што тая, якая праслаўляла Бога, які «скінуў магутных з трона», а «багатых ні з чым адправіў» ( 1, 52-53), з'яўляецца той, якая ўносіць цяпло хатняга агню ў нашыя пошукі справядлівасці. Яна таксама з'яўляецца той, хто захоўвае старанна «ўсе гэтыя словы, разважаючы ў сэрцы сваім» ( 2, 19). Марыя ўмее распазнаваць сляды Божага Духа ў вялікіх падзеях, а таксама ў тых, якія здаюцца малаважнымі. Разважае над таямніцамі Бога ў свеце, у гісторыі і ў штодзённым жыцці кожнага паасобку і ўсіх разам. З'яўляецца жанчынай, якая моліцца і працуе ў Назарэце. Яна таксама нашая Пані гатоўнасці, тая, якая пакідае сваё мястэчка, каб хутчэй дапамагчы іншым (пар. 1, 39-45). Гэтая дынаміка справядлівасці і далікатнасці, кантэмпляцыі і хуткага выйсця да іншых — гэта ўсё робіць з Яе эклезіяльны прыклад евангелізацыі. Просім Яе, каб праз сваю ма-цярынскую малітву дапамагла нам, каб Касцёл стаў до-мам для многіх і маці для ўсіх народаў, каб змог нарадзіцца новы свет. Гэта Уваскрослы прамаўляе да нас з моцаю, напаўняючы нас вялізнай і глыбокай на-дзеяй: «Вось чыню ўсё новае» ( 21, 5). Поўныя даверу, крочым з Марыяй да таго абяцання і кажам:

і , ,        ,  ,    «»   ,     .

,  ,    і ,     . ,  ,   . ,      і   ,     ,   .

,   ,  .    ,    .

Т,   ,  ,  ,  ,   ',        .

,    , , і  , і  ,      і     .  ,    ,  . . !

,  ,   , 24  2013 ,    ,  ,    .

Францішак

---

[1] VI, . . *Gaudete in Domino* (9 1975), 22: *AAS* 67 (1975), 297.

[2] , 8: *AAS* 67 (1975), 292.

[3] Энц. *Deus caritas est* (25 снежня 2005), 1.

[4] V Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Караібаў, (29 чэрвеня 2007), 360.

[5] .

[6] Павел VI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Evangelii nuntiandi* (8 снежня 1975), 80: *AAS* 68 (1976), 75.

[7] *Cántico espiritual*, 36, 10.

[8] *Adversus haereses*, IV, c. 34, n. 1: *PG* 7, 1083: «Omnem novita-tem attulit, semetipsum afferens».

[9] Павел VI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Evangelii nuntiandi* (8 снежня 1975), 7: *AAS* 68 (1976), 9.

[10] Пар. *Propositio* 7.

[11] Бэнэдыкт XVI, . *XIII* (28 кастрычніка 2012): *AAS* 104 (2012), 890.

[12] .

[13] Бэнэдыкт XVI, . *V* (13 мая 2007), Апарэсіда, Бразілія (13 мая 2007): *AAS* 99 (2007), 437.

[14] Энц. *Redemptoris missio* (7 снежня 1990), 34: *AAS* 83 (1991), 280.

[15] , 40: *AAS* 83 (1991), 287.

[16] , 86: *AAS* 83 (1991), 333.

[17] V Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Караібаў, (29 чэрвеня 2007), 548.

[18] , 370.

[19] Пар. *Propositio* 1.

[20] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Christifideles laici* (30 снежня 1988), 32.

[21] Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Караібаў, (29 чэрвеня 2007), 201.

[22] , 551.

[23] Павел VI, Энц. *Ecclesiam suam* (6 жніўня 1964), 9-10: *AAS* 56 (1964), 611-612.

[24] Другі Ват. Сабор, Дэкр. пра экуменізм *Unitatis redintegratio*, 6.

[25] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Oceania* (22 лістапада 2001), 19: *AAS* 94 (2002), 390.

[26] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Christifideles laici* (30 снежня 1988), 26.

[27] Пар. *Propositio* 26.

[28] Пар. *Propositio* 44.

[29] Пар. *Propositio* 26.

[30] Пар. *Propositio* 41.

[31] Другі Ват. Сабор, Дэкр. пра пастырскае служэнне біскупаў у свеце *Christus Dominus*, 11.

[32] Пар. Бэнэдыкт XVI, *40- «Ad gentes»* (11 сакавіка 2006), 337.

[33] Пар. *Propositio* 42.

[34] Пар. кан. 460-468; 492-502; 511-514; 536-537.

[35] Энц. *Ut unum sint* (25 мая 1995), 95: *AAS* 87 (1995), 977-978.

[36] Другі Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Касцёл *Lumen gentium*, 23.

[37] Пар. Ян Павел II, Motu proprio *Apostolos suos* (21 мая 1998): *AAS* 90 (1998), 641-658.

[38] Другі Ват. Сабор, Дэкр. пра экуменізм *Unitatis redintegratio*, 11.

[39] Пар. *Summa theol*., I-II, q. 66 , a. 4-6.

[40] *Summa theol*., I-II, q. 108, a. 1.

[41] *Summa theol*., II-II, q. 30, a. 4. Пар. , q. 40, a. 4, ad 1: «Знешнія ахвяры і дары як праяўленне пашаны прыносяцца Богу не таму, што Ён іх патрабуе, але таму, што Бог хоча гэтага дзеля нас, каб мы такім чынам выхоўвалі ў сабе адданасць Богу, а таксама для задавольвання патрэбаў нашых бліжніх. Таму міласэрнасць, якая выяўляецца ў дапамозе патрабуючым, найбольш прыемная Богу, бо непасрэдна адносіцца да патрэбаў бліжніх».

[42] Пар. Другі Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Божае Аб’яўленне *Dei verbum*, 12.

[43] Motu proprio *Socialium Scientiarum* (1 студзеня 1994): *AAS* 86 (1994), 209.

[44] Св. Тамаш Аквінскі падкрэслівае, што колькасць і раз-нас-тай-насць — «гэта справа першаснай задумы Стварыцеля», таго, хто хацеў, каб тое, «чаго не хапае аднаму для прадстаўлення Божай дабрыні, можна было дапоўніць праз іншага», бо Яго дабрыню «не можа вычарпальна прадставіць адно стварэнне» (*Summa theol*. I, q. 47, a. 1). Таму нам неабходна заўважыць разнастайнасць рэчы ў яе шматлікіх суадносінах (пар. *Summa theol*. I, q. 47, a. 2, ad 1; q. 47, a. 3). З тых жа прычын мы павінны слухаць адзін другога і дапаўняць у нашым частковым успрыняцці рэчаіснасці і Евангелля.

[45] Ян XXIII, (11 кастрычніка 1962): *AAS* 54 (1962), 792: «Est enim aliud ipsum depositum Fidei, seu veritates, quae veneranda doctrina nostra continentur, aliud modus, quo eaedem enuntiantur».

[46] Ян Павел II, Энц. *Ut unum sint* (25 мая 1995), 19: *AAS* 87 (1995), 933.

[47] *Summa theol*. I-II, q. 107, a. 4.

[48] .

[49] N. 1735.

[50] Пар. Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 34c: *AAS* 74 (1982), 123.

[51] Пар. Св. Амброзій, *De Sacramentis*, IV, VI, 28: *PL* 16, 464: «Я павінен заўсёды яе прымаць, бо яна заўсёды прабачае мае грахі. Калі няспынна грашу, я заўсёды павінен мець лек»; , IV, V, 24: *PL* 16, 463: «Той, хто спажываў манну, памёр; той, хто спажывае гэтае Цела, атрымае прабачэнне сваіх грахоў»; Св. Кірыл Александрыйскі, *In Joh. Evang. IV*, 2: *PG* 73, 584-585: «Я праверыў сябе і прызнаў нягодным. У тых, хто так кажа, пытаюся: а калі будзеце годныя? Калі станеце перад Хрыстом? І калі грахі заўсёды перашкаджаюць вам наблізіцца, і калі ніколі не перастанеце падаць — *?,* кажа псальм — не будзеце мець удзелу ў асвячэнні, якое ажыўляе навекі?»

[52] Бэнэдыкт XVI, -, Бразілія (11 мая 2007), 3: *AAS* 99 (2007), 428.

[53] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Pastores dabo vobis* (25 сакавіка 1992), 10: *AAS* 84 (1992), 673.

[54] Павел VI, Энц. *Ecclesiam suam* (6 жніўня 1964), 19: *AAS* 56 (1964), 632.

[55] Св. Ян Хрызастом, , II, 6: *PG* 48, 992D.

[56] Пар. *Propositio* 13.

[57] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Africa* (14 верасня 1995), 52: *AAS* 88 (1996), 32-33; Ён жа, Энц. *Sollicitudo rei socialis* (30 снежня 1987), 22: *AAS* 80 (1988), 539.

[58] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Asia* (6 лістапада 1999), 7: *AAS* 92 (2000), 458.

[59] Камітэт Дактрыны Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў Злучаных Штатаў, *:* (2006), 17.

[60] Канферэнцыя Епіскапату Францыі, Нота Рады па справах сям'і і грамадства « *? !*» (28 верасня 2012).

[61] Пар. *Propositio* 25.

[62] Італьянская Каталіцкая Акцыя, *XIV* (8 мая 2011).

[63] Юзаф Ратцынгер, , Канферэнцыя, прачытаная падчас сустрэчы старшыняў Камісій па справах навучання веры Канферэнцый Біскупаў Лацінскай Амерыкі, якая адбылася ў Гуадалаяры, Мексіка, 1996. Апублікавана ў: *L'Osservatore Romano*, 1 лістапада 1996, цытаваная ў: V Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Караібаў, (29 чэрвеня 2007), 12.

[64] Georges Bernanos, *Journal d'un curé de campagne*, Paris, 1974, p. 135.

[65] (11 кастрычніка 1962), 4, 2-4: *AAS* 54 (1962), 789.

[66] John Henry Newman, *26 1833*, у: *The Letters and Diaries of John Henry Newman*, vol. III, Oxford 1979, s. 204.

[67] Бэнэдыкт XVI, *.* (11 кастрычніка 2012): *AAS* 104 (2012), 881.

[68] Тамаш Кемпійскі, *De Imitatione Christi*, Liber Primus, IX, 1: «Уяўнасць і змена месца падманула многіх».

[69] Варта згадаць сведчанне св. Тэрэзы з Лізьё пра яе адносіны з сястрой, якая здавалася ёй асабліва непрыемнай, у якіх унутраны досвед меў вырашальны ўплыў: « *, , . . , … ; , ; , . , ; <…>. , ; , , - ,* »: (*Manuscrit C*,29 v° - 30 r°, en

*Œuvres comple1tes*, Paris 1992, pp. 274-275).

[70] Пар. *Propositio* 8.

[71] Henri de Lubac, *Méditation sur l'Église*, Paris 1968, Aubier-Montaigne, FV 60, p. 321.

[72] Папская Рада «Iustitia et Pax», , 295.

[73] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Christifideles laici* (30 снежня 1988), 51.

[74] Кангрэгацыя Веравучэння, Дэкларацыя аб дапушчэнні жанчын да службовага святарства *Inter insigniores* (15 кастрычніка 1976): *AAS* 69 (1977), 115. Цытуецца ў: Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Christifideles laici* (30 снежня 1988), 51, спасылка 190.

[75] Ян Павел II, Ап. ліст *Mulieris dignitatem* (15 жніўня 1988), 27: *AAS* 80 (1988), 1718.

[76] Пар. *Propositio* 51.

[77] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Asia* (6 лістапада 1999), 19: *AAS* 92 (2000), 478.

[78] , 2: *AAS* 92 (2000), 451.

[79] Пар. *Propositio* 4.

[80] Пар. Другі Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Касцёл *Lumen gentium*, 1.

[81] *I XIII* (8 кастрычніка 2012): *AAS* 104 (2012), 897.

[82] Пар. *Propositio* 6; Другі Ват. Сабор, Паст. канст. пра Касцёл у сучасным свеце *Gaudium et spes*, 22.

[83] Пар. Другі Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Касцёл *Lumen gentium*, 9.

[84] Пар. *III* , (23 сакавіка 1979), 386-387.

[85] Пар. Другі Ват. Сабор, Паст. канст. пра Касцёл у сучасным свеце *Gaudium et spes*, 36.

[86] , 25.

[87] , 53.

[88] Ян Павел II, Апост. ліст *Novo millennio ineunte* (6 студзеня 2001), 40: *AAS* 93 (2001), 294-295.

[89] , 40: *AAS* 93 (2001), 295.

[90] Ян Павел II, Энц. *Redemptoris missio* (7 снежня 1990), 52: *AAS* 83 (1991), 300; пар. Апост. адгарт. *Catechesi tradendae* (16 кастрычніка 1979), 53: *AAS* 71 (1979), 1321.

[91] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Oceania* (22 лістапада 2001), 16: *AAS* 94 (2002), 384.

[92] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Africa* (14 верасня 1995), 61: *AAS* 88 (1996), 39.

[93] Св. Тамаш Аквінскі, *Summa theol*., I, q. 39, a. 8 cons. 2: «Калі выключыць Духа Святога, які ёсць повяззю Абодвух, нельга зразумець еднасці паміж Айцом і Сынам»; Пар. I, q. 37, a. 1, ad 3.

[94] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Oceania* (22 лістапада 2001), 17: *AAS* 94 (2002), 385.

[95] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Asia* (6 лістапада 1999), 20: *AAS* 92 (2000), 478-482.

[96] Пар. Другі Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Касцёл *Lumen gentium*, 12.

[97] Ян Павел II, Энц. *Fides et ratio* (14 верасня 1998), 71.

[98] III Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Карыбаў, (23 сакавіка 1979), 450; пар. V Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Карыбаў, (29 чэрвеня 2007), 264.

[99] Пар. Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Asia* (6 лістапада 1999), 21: *AAS* 92 (2000), 482-484.

[100] N. 48: *AAS* 68 (1976), 38.

[101] .

[102] *V* , (13 мая 2007), 1: *AAS* 99 (2007), 446-447.

[103] V Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Карыбаў, (29 чэрвеня 2007),

262.

[104] , 263.

[105] Пар. Св. Тамаш Аквінскі, *Summa theol*. II-II, q. 2, a. 2.

[106] V Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Карыбаў, (29 чэрвеня 2007), 264.

[107] .

[108] Пар. II Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Касцёл *Lumen gentium*, 12.

[109] Пар. *Propositio* 17.

[110] Пар. *Propositio* 30.

[111] Пар. *Propositio* 27.

[112] Ян Павел II, Апост. ліст *Dies Domini* (31 мая 1998), 41.

[113] Павел VI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Evangelii nuntiandi* (8 снежня 1975), 78: *AAS* 68 (1976), 71.

[114] .

[115] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Pastores dabo vobis* (25 сакавіка 1992), 26: *AAS* 84 (1992), 698.

[116] , 25: *AAS* 84 (1992), 696.

[117] Св. Тамаш Аквінскі, *Summa theol.* II-II, q. 188, a. 6.

[118] Павел VI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Evangelii nuntiandi* (8 снежня 1975), 76: *AAS* 68 (1976), 68.

[119] , 75: *AAS* 68 (1976), 65.

[120] , 63: *AAS* 68 (1976), 53.

[121] , 43: *AAS* 68 (1976), 33.

[122] .

[123] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Pastores dabo vobis* (25 сакавіка 1992), 10: *AAS* 84 (1992), 672.

[124] Павел VI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Evangelii nuntiandi* (8 снежня 1975), 40: *AAS* 68 (1976), 31.

[125] , 43: *AAS* 68 (1976), 33.

[126] Пар. *Propositio* 9.

[127] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Pastores dabo vobis* (25 сакавіка 1992), 26: *AAS* 84 (1992), 698.

[128] Пар. *Propositio* 38.

[129] Пар. *Propositio* 20.

[130] Пар. II Ват. Сабор, Дэкр. пра сродкі масавай камунікацыі *Inter mirifica*, 6.

[131] Пар. *De musica*, VI, XIII, 38: *PL* 32, 1183-1184; *Confessiones*, IV, XIII, 20: *PL* 32, 701.

[132] Бэнэдыкт XVI, *« — „Via Pulchritudinis”»* (25 кастрычніка 2012): *L’Osservatore Romano* (27 кастрычніка 2012), 7.

[133] *Summa theol*. I-II, q. 65, a. 3, ad 2: «propter aliquas dispositiones contrarias».

[134] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Asia* (6 лістапада 1999), 20: *AAS* 92 (2000), 481.

[135] Бэнэдыкт XVI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Verbum Domini* (30 верасня 2010), 1.

[136] Пар. *Propositio* 11.

[137] Пар. II Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Божае Аб’яўленне *Dei verbum*, 21-22.

[138] Пар. Бэнэдыкт XVI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Verbum Domini* (30 верасня 2010), 86-87.

[139] Бэнэдыкт XVI, (8 кастрычніка 2012): *AAS* 104 (2012), 896.

[140] Павел VI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Evangelii nuntiandi* (8 снежня 1975), 17: *AAS* 68 (1976), 17.

[141] Ян Павел II, , (16 лістапада 1980): *Insegnamenti* III/2 (1980), 1232.

[142] Папская Рада «Iustitia et Pax», , 52.

[143] Ян Павел II, (24 красавіка 1991): *Insegnamenti* XIV/1 (1991), 856.

[144] Бэнэдыкт XVI, Апост. ліст у форме motu proprio *Intima Eccle-siae natura* (11 лістапада 2012): *AAS* 104 (2012), 996.

[145] Энц. *Populorum progressio* (26 сакавіка 1967), 14: *AAS* 59 (1967), 264.

[146] Павел VI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Evangelii nuntiandi* (8 снежня 1975), 29: *AAS* 68 (1976), 25.

[147] V Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Карыбаў, (29 чэрвеня 2007) 380.

[148] Папская Рада «Iustitia et Pax», , 9.

[149] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in America* (22 студзеня 1999), 27: *AAS* 91 (1999), 762.

[150] Бэнэдыкт XVI, Энц. *Deus caritas est* (25 снежня 2005), 28.

[151] Папская Рада «Iustitia et Pax», , 12.

[152] Энц. *Octogesima adveniens* (14 мая 1971), 4: *AAS* 63 (1971), 403.

[153] Кангрэгацыя Веравучэння, Інструкцыя *Libertatis nuntius* (6 жніўня 1984), XI, 1: *AAS* 76 (1984), 903.

[154] Папская Рада «Iustitia et Pax», , 157.

[155] Павел VI, Энц. *Octogesima adveniens* (14 мая 1971), 23: *AAS* 63 (1971), 418.

[156] Павел VI, Энц. *Populorum progressio* (26 сакавіка 1967), 65: *AAS* 59 (1967), 289.

[157] , 15: *AAS* 59 (1967), 265.

[158] Нацыянальная Канферэнцыя Біскупаў Бразіліі, *. , ,* (красавік 2002), , 2.

[159] Ян XXIII, Энц. *Mater et Magistra* (15 мая 1961), 3: *AAS* 53 (1961), 402.

[160] Св. Аўгустын, *De catech. Rudibus*, I, XIV, 22: *PL* 40, 327.

[161] Кангрэгацыя веравучэння, Інструкцыя *Libertatis nuntius* (6 жніўня 1984), XI, 18: *AAS* 76 (1984), 907-908.

[162] Ян Павел II, Энц. *Centesimus annus* (1 мая 1991), 41: *AAS* 83 (1991), 844-845.

[163] Ян Павел II, *.* - (11 кастрычніка 1984), 5: *AAS* 77 (1985), 358.

[164] Ян Павел II, Энц. *Sollicitudo rei socialis* (30 снежня 1987), 42: *AAS* 80 (1988), 572.

[165] Бэнэдыкт XVI, *V i* (13 мая 2007), 3: *AAS* 99 (2007), 450.

[166] Св. Тамаш Аквінскі, *Summa theol*. II-II, q. 27, a. 2.

[167] , I-II, q. 110, a. 1.

[168] , I-II, q. 26, a. 3.

[169] Ян Павел II, Апост. ліст *Novo millennio ineunte* (6 студзеня 2001), 50: *AAS* 93 (2001), 303.

[170] .

[171] Пар. *Propositio* 45.

[172] Кангрэгацыя Веравучэння, Інструкцыя *Libertatis nuntius* (6 жніўня 1984), XI, 18: *AAS* 76 (1984), 908.

[173] Гэта прадугледжвае «ліквідацыю структурных прычын дрэннага функцыянавання сусветнай гаспадаркі»: Бэнэдыкт XVI, (8 студзеня 2007): *AAS* 99 (2007), 73.

[174] Пар. Грамадская Камісія Французскага Епіскапату, (17 лютага 1999); пар. Пій XI, , 18 снежня 1927.

[175] Бэнэдыкт XVI, Энц. *Caritas in veritate* (29 чэрвеня 2009), 2.

[176] Ян Павел II, Паслясінадальная апост. адгарт. *Christifideles laici* (30 снежня 1988), 37.

[177] Пар. *Propositio* 56.

[178] Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў Філіпінаў, Пастырскі ліст ? (29 студзеня 1988).

[179] Павел VI, Энц. *Populorum progressio* (26 сакавіка 1967), 76: *AAS* 59 (1967), 294-295.

[180] Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў Злучаных Штатаў, Пас-тырскі ліст *Forming Consciences for Faithful Citizenship* (2007), 13.

[181] Папская Рада «Iustitia et Pax», , 161.

[182] *Das Ende der Neuzeit, Würzburg*91965, 30-31.

[183] Пар. I. Quiles S.I., *Filosofía de la educación personalista*, Buenos Aires 1981, 46-53.

[184] Пастаянны Камітэт Нацыянальнай Канферэнцыі Біскупаў Конга, *Message sur la situation sécuritaire dans le pays* (5 снежня 2012), 11.

[185] Пар. Платон, *Gorgia*, 465.

[186] Бэнэдыкт XVI, (21 снежня 2012): *AAS* 105 (2013), 51.

[187] Пар. *Propositio* 14.

[188] Пар. , 1910; Папская Рада «Iustitia et Pax», , 168.

[189] Пар. *Propositio* 54.

[190] Ян Павел II, Энц. *Fides et ratio* (14 верасня 1998), 88.

[191] Св. Тамаш Аквінскі, *Summa contra Gentiles*, I, VII; пар. Ян Павел II, Энц. *Fides et ratio* (14 верасня 1998), 43.

[192] II Ват. Сабор, Дэкр. пра экуменізм *Unitatis redintegratio*, 4.

[193] Пар. *Propositio* 52.

[194] Канферэнцыя Біскупаў Індыі, *XXX : The Church’s Role for a better India* (8 сакавіка 2012), 8.9.

[195] Пар. *Propositio* 53.

[196] Ян Павел II, Энц. *Redemptoris missio* (7 снежня 1990), 56: *AAS* 83 (1991), 304.

[197] Пар. Бэнэдыкт XVI,    (21 снежня 2012): *AAS* 105 (2013), 51.

[198] II Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Касцёл *Lumen gentium*, 16.

[199] Міжнародная тэалагічная камісія,   (1996), 72: *Ench. Vat*. 15, n. 1061.

[200] .

[201] Пар. , 81-87: *Ench. Vat.* 15, n. 1070-1076.

[202] Пар. *Propositio* 16.

[203] Бэнэдыкт XVI, Паслясінадальная апост. адгарт. *Ecclesia in Me-dio Oriente* (14 верасня 2012), 26: *AAS* 104 (2012), 762.

[204] Пар. *Propositio* 55.

[205] Пар. *Propositio* 36.

[206] Ян Павел II, Апост. ліст *Novo millennio ineunte* (6 студзеня 2001), 52: *AAS* 83 (2001), 304.

[207] Пар. V. M. Fernández, «*Espiritualidad para la esperanza activa. Discurso en la apertura del I Congreso Nacional de Doctrina social de la Iglesia* (Rosario 2011)», у: *UCActualidad* 142 (2011), 16.

[208] Ян Павел II, Энц. *Redemptoris missio* (7 снежня 1990), 45: *AAS* 83 (1991), 292.

[209] Бэнэдыкт XVI, Энц. *Deus caritas est* (25 снежня 2005), 16.

[210] , 39.

[211] II Сход Біскупаў, прысвечаны Еўропе,    , 1: *L'Osservatore Romano*, 23 кастрычніка 1999, n. 5.

[212] *Sermo* 51: *PL* 194, 1863.1865.

[213] *Nican Mopohua*, 118-119.

[214] II Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Касцёл *Lumen gentium*, 52-69.

[215] Ян Павел II, Энц. *Redemptoris Mater* (25 сакавіка 1987), 6: *AAS* 79 (1987), 366.

[216] Пар. *Propositio* 58.

[217] Ян Павел II, Энц. *Redemptoris Mater* (25 сакавіка 1987), 17: *AAS* 79 (1987), 381.

©Copyright - Libreria Editrice Vaticana